Пралетарыі ўсіх краёў,

Са… Бел…

Органа Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту …

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Рукапісы, не прынятыя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к., мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок пашпарэлі пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок пашпарэлі пасьлядо тэксту 1 р. — к.
За радок пашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Скідкі на 50 проц. даражэй.
Зьвыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўных і чырвонаармейцаў за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ў … кнігарнях, канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА — № 269 (2758) Аўторак, 26-га лістапада 1929 г.

154 кр. "Совѣтская Белоруссія" Одесса, Пастера 13, государственн. публичн. библиотека. отдѣл. сѣвер. адзін экз.

ДРУГАЯ СЭСІЯ ЦВК БССР

Аб дзяржаўным бюджэце на 1929-1930 год.

ДАКЛАД тав. МІКУЛІЧА.

Бюджэт павінен рэгуляваць народную гаспадарку.

Праэкт дзяржаўнага бюджэту на 1929-30 г., які прадстаўляецца па зацьверджаньне 2-й сэсіі ЦВК БССР IX-га скліканьня, ухвалены Прэзыдыумам ЦВК і СНК БССР, складаўся на падставах пастаноў партыйных зьездаў і зьездаў саветаў, а таксама дапасовачна да пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР.

Дзяржаўны бюджэт ёсьць частка гадавога пляну і вынікае з тых дырэктыў, якія былі дадзены IX-м зьездам саветаў. Бюджэт павінен мець сваёй асноўнай мэтай—пераразьмеркаваньне сродкаў паміж паасобнымі гаспадарчымі арганізацыямі і дзяржаўнымі інстытутамі, якія павінны ня толькі не затрымліваць магчымасьцяй у росквітах паасобных частак гаспадаркі, але актыўна садзейнічаць выяўленьню і больш шпаркаму разьвіцьцю ўсіх станоўчых працэсаў, асабліва па лініі аграмаджаньня.

Хуткі тэмп разьвіцьця народнай гаспадаркі, ажыцьцяўленьне мерапрыемства па пэрспэктыўнаму пяцігадоваму пляну, сацыялістычнае спаборніцтва, надзвычайна вялікае імкненьне бядняцка-серадняцкіх мас вёскі да калектыўных форм гаспадаркі, пераход на бесперапынны рабочы тыдзень—усё гэта прымушае да таго, каб арганізацыя форм узьдзейнічаньня на матар'яльна-вытворчыя працэсы з боку дзяржаўнага кіраваньня, цалкам адпавядала запатрабаваньням такога надзвычайна хуткага, хаця і напружанага росту.

Ад дзяржаўнага бюджэту, як ад аднаго з важнейшых сродкаў арганізацыі народнай гаспадаркі, асабліва патрабуецца ня толькі захаваньне адпаведных тэмпаў, але і падрыхтоўка, прадбачаньне цэлага шэрагу мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць патрэбы далейшага будаўніцтва.

Мы ўступаем, або ўступілі ўжо ў другі год выкананьня пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР. Першы год выкананьня пяцігодкі паказвае нам наступнае: у галіне прамысловасьці—валавая прадукцыя дзяржаўнай цэнзавай прамысловасьці, па папярэдніх даных, узрасла больш чым на 44 пр., у той час калі па пляну меркавалася 43 з пал. проц. Па рэспубліканскай прамысловасьці было заданьне павялічыць прадукцыю на 48,9 пр., мяркуецца, што гэта будзе цалкам выканана. Вытворчасьць працы аднаго рабочага ўзьнялася на 24,3 проц., што цалкам адпавядае плянавому заданьню. Зарплата ўзрасла на 11,2 пр., што перавысіла плянавыя меркаваньні.

5-гадовы плян выканаем ранней тэрміну.

У галіне сельскай гаспадаркі працэс калектывізацыі вёскі значна правысіў плянавыя меркаваньні: калі па пляну намячалася павялічыць плошчу пад калгасамі на 55 проц. супроць мінулага году, то па папярэдніх даных, якія меліся, ёсьць падставы меркаваць, што гэта перавысіць 180 проц. І таму, тыя меркаваньні, якія былі на пяцігодцы—у канцы пяцігодкі мець 12 проц. усёй зямельнай плошчы пад калгасамі,—становяцца ўжо магчымай задачай і па кантрольных лічбах гэта вызначаецца для выкананьня ў бягучым 1929-30 г. Такім чынам пад калгасамі разам з савгасамі к канцу 1930 году вызначаецца 13 проц. усёй пасеўнай плошчы.

У галіне таваразвароту: увесь таваразварот узрос на 27,8. Дробны таваразварот узрос на 14,6 проц., замест 13,6, як было вызначана па пляну. Рост усяго таваразвароту ішоў побач з памяншэньнем яго прыватнага сэктару больш хуткім тэмпам, чым гэта вызначалася на пляну і ўдзельная вага прыватнага сэктару ў таваразвароце паменшылася супроць пляну. Калі па пляну вызначалася 23½ проц., то фактычна ўдзельная вага аказалася на ўзроўні 21 проц.

Усё гэта нам гаворыць аб тым, што выкананьне пяцігадовага пляну па паасобных галінах гаспадаркі ідзе з перавышэньнем. Але н льга гаварыць аб тым, што выкананьне пяцігадовага пляну праходзіць бяз усякіх перашкод і недахопаў. Перашкоды і недахопы ёсьць, але асноўны вывад, які можна зрабіць з паданых пералікаў, гэта той, што тэмы сацыялістычнага будаўніцтва, вызначаныя пяцігодкай, аказаліся ня толькі рэальнымі, магчымымі для выкананьня, але ў некаторых частках фактычна былі перавыкананы.

Гэта лепш усякіх іншых доказаў б'е на тых малаверах і скептыках, якія пры зацьверджаньні пляну паказвалі на яго нібыта фантастычныя і няжыцьцёвыя тэмпы.

Самым галоўным у бюджэце, як я ужо адзначаў, што ён павінен быць пабудаваны ў поўнай суадпаведнасьці з задачамі і матар'яльнымі працэсамі разьвіцьця народнай гаспадаркі.

Такім чынам, правільна пабудаваным бюджэт будзе толькі тады, калі ён будзе адказваць становуча на наступныя запытаньні: ці ідзе ён нага ў нагу з усімі іншымі паказчыкамі гаспадарчага жыцьця, ці забясьпечвае ён належнай арганізацыяй сродак, бягучыя патрэбы ажыцьцяўленьня матар'яльна-вытворчых плянаў, гэта—па-першае. Падругое,—ці мае ён у сваёй пэрспэктыве стварэньне адпаведных умоў для магчымасьці далейшага выкананьня гэнэральнага пляну народнай гаспадаркі, гэта значыць, забясьпечаньне магчымасьцяй паступовага пераходу да больш складаных задач.

Параўнаньне некаторых асноўных паказчыкаў дынамікі разьвіцьця паасобных працэсаў народнай гаспадаркі з бюджэтнымі паказчыкамі сьведчыць аб тым, што ён за мінулыя гады ня толькі не адставаў у сваім разьвіцьці, але ішоў уперад, канцэнтрыруючы ўсё большую і большую частку народнага даходу.

Агульна-саюзны бюджэт на 1928-29 г. займаў 27,8 проц. ад агульнага разьмеру народнага даходу. На 1929-30 г. бюджэт запраектаван ў 33 з паловай проц. агульнага разьмеру народнага даходу. У нас па БССР хоць Дзяржплан узяўся ўжо за тое, каб падлічыць народны даход па БССР, але гэтая праца яшчэ ня скончана, і таму прывесьці процант прыросту народнага даходу, які ідзе праз дзяржаўны бюджэт, немагчыма на сёньняшні дзень. Але часткова гэты паказчык можа быць заменен другім—гэта паказчыкам удзелу бюджэту ў акумуляцыі сродкаў абагуленай часткі нашай гаспадаркі, прычым сродкаў, якія праходзяць праз шэраг галоўных фінансавых інстытутаў.

Галоўная частка сродкаў—на сацыялістычную вытворчасьць.

Адпаведныя падлікі нам паказваюць, што 58,6 проц. усіх сродкаў абагуленай часткі народнай гаспадаркі (тэрытарыяльныя даходы) канцэнтруе бюджэтная сыстэма. На долю крэдытных устаноў разам з ашчадныміі касамі пры ходзіцца каля 10 проц. і каля 10 пр. займаюць інстытуты дзяржаўнага сацыяльнага страхаваньня, каля 13 пр. усіх сродкаў займаюць уласныя накапленьні гаспадарчых арганізацый і астатняя частка прыпадае на іншыя фінансавыя органы, як: кааперацыя, прафсаюзы і інш.

Гэта сьведчыць аб тым, што бюджэтная сыстэма, як рэзэрвуар сродкаў, зьяўляецца вельмі магутным рычагом узьдзейнічаньня на народную гаспадарку. Агульныя рысы руху сродкаў, якія праходзяць праз шэраг галоўных фінансавых інстытутаў, сьведчаць наступнае: 64,1 проц. усіх сродкаў накіроўваюцца на фінансаваньне галін народнай гаспадаркі і зьвязаны такім чынам з выкананьнем матар'яльна-вытворчых плянаў. Ня больш аднэй чацьвертай часткі—27,8 проц. накіроўваюцца на задавальненьне сацыяльна-культурных патрэб і толькі каля 7 проц. ідзе на патрэбы кіраўніцтва.

Увесь-жа фінансавы плян—гэта вы ўжо чулі пры абгаварэньні пытаньня аб кантрольных лічбах, складае каля 350 мільёнаў руб. У дынамічным разрэзе кірунак скарыстованых сродкаў яшчэ больш яскравы, бо на працягу 1928-29—1929-30 г. наглядаюцца наступныя зьмены: сродкі, накіраваныя на пляны калектывізацыі сельскай гаспадаркі ўзрастаюць на 128 проц., на прамысловасьць—на 83½ проц., пры росьце агульнай масы сродкаў, фінансуючых народную гаспадарку на 60,3 проц., і павялічэньне сродкаў, якія праходзяць праз фінансавыя інстытуты, на 52,6 проц.

З гэтых лічбаў відаць, што галоўная частка ідзе і ў першую чаргу на народна-гаспадарчыя працэсы, асабліва-ж на аграмаджаньне. Паменшыліся за паказаны час, як адносныя так і абсалютныя выдаткі на дзяржаўнае кіраўніцтва, значна вырасла частка, якая прызначаецца на сацыяльна-культурныя патрэбы. Удзельная вага ў бюджэце выдаткаў на народную гаспадарку значна павялічылася. Калі ў 1926-27 г. на народную гаспадарку ішло 27,4 проц. усіх бюджэтных сродкаў, то ў бюджэце на 1929-30 г. яны складаюць 43,6 проц., а ўсё гэта цалкам адпавядае той лініі і дырэктывам, вызначаным партыяй і апошнім зьездам Саветаў. Цэнтральнымі задачамі, да выкананьня якіх павінны быць прыстасаваны ўсе мерапрыемства ўраду, зьяўляюцца: максымальнае пашырэньне працэсу індустрыялізацыі, узмацненьне пачатай працы па сацыялістычнай перабудову вёскі ў напрамку ўзмацненьня сацыялістычных форм арганізацыі сельскай гаспаркі, яе машынізацыі і г. д., далейшае павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню працоўных мас. Выкананьню гэтых задач павінен адпавядаць іх дзяржаўны бюджэт, які ўносіцца на зацьверджаньне 2-й Сэсіі ЦВК. Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі на 1929-1930 год запраэктавалі наступныя тэмпы разгортваньня прамысловасьці: павялічэньне валавой прадукцыі ўсёй цэнзавай прамысловасьці ў параўнаньні з мінулым годам на 60,9 проц. і прамысловасьці рэспубліканскага значэньня на 65 проц. Гэта заданьне значна перавысіла тыя плянавыя меркаваньні, якія былі намечаны на пяцігодцы: на цэнзавай прамысловасьці—на 24,7 проц. павялічана, па рэспубліканскай—на 26,1 проц. Разам з тым, падвышаны і якасныя паказальнікі разьвіцьця прамысловасьці. Узрост прадукцыйнасьці працы па рэспубліканскай прамысловасьці на 29,8 проц., зьніжэньне сабекошту—на 11 проц. Дасягненьне вызначаных як колькасных, так і якасных паказчыкаў становіцца жыцьцёвым дзякуючы таму, што капітальнае будаўніцтва папярэдніх годаў падрыхтавала шэраг буйных прадпрыемстваў, якія зараз будуць пушчаны ў ход, а таксама пераабсталяваньне шэрагу прадпрыемстваў, якія ўжо дзейнічаюць.

(Працяг будзе).

Садаклад члена Бюджэтнай Камісіі тав. ПЛАТУНА.

Павялічэньне бюджэту ў БССР вышэй Саюзнага.

Галоўныя выдаткі, якія намечаны па дзяржбюджэце на 1929-30 год і прапануюцца Сэсіі ЦВК ідуць па 3-х асноўных галінах: 1-я і асноўная—гэта наша прамысловасьць, якая зьяўляецца вядучай у нашай гаспадарцы, 2-я—с.-гаспадарка, 3-я — як неадрыўная частка забясьпечаньня кадрамі нашае прамысловасьці і с.-гаспадаркі—гэта культурнае будаўніцтва.

У зьвязку з тым, што ўстаноўка савецкае ўлады на тое, каб падцягваць эканамічна і культурна адсталыя рэспублікі, каб давесьці да аднаго агульнага ўзроўню эканамічнага і культурнага, лічбы, намечаныя па Саюзным бюджэце трохі ніжэй чым лічбы па бюджэце БССР, якая адстае ў некаторай ступені і ў культурным будаўніцтве. Таму т. т. агульны бюджэт Саюзу ў гэтым годзе расьце на 44 проц., а наш буджэт расьце на 52 проц., прычым тыя зьмены, якія ўнесены бюджэтнай камісіяй у выдатковую частку, яшчэ ў некаторай ступені павялічаны.

Разам з гэтым галоўнейшыя мерапрыемствы па БССР праходзяць па агульна-саюзным бюджэце, як напрыклад электрастанцыя, будаўніцтва ўнівэрсітэту, будаўніцтва УТУЗ'а, ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Па ўсеагульнаму абавязковаму навучаньню згодна 5-гадоваму пляну мы атрымалі дапамогі ад Саюзнага ўраду ў 52 міл. руб.—толькі на адно забясьпечаньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Прыцягнуць працоўных да абгаварэньня.

Бюджэтная камісія паставіла пытаньне перад СНК, каб бюджэт складаўся пры большым удзельнічаньні мас, чым ён складаецца да гэтага часу. У нас да гэтага часу дзяржбюджэт праходзіць амаль што ў апаратным парадку, ён назат не прапрацоўваецца ў акрвыканкомах.

Трэба даручыць СНК, калі будзе складацца дзяржбюджэт, каб гэтыя лічбы абгаварваліся, з гэтымі лічбамі былі-бы шырока азнаёмлены працоўныя масы.

У гэтым годзе мы ўсё-ж такі з бюджэтам вышлі вельмі добра, склалі яго у тэрмін. Вы ўсе памятуеце, што мінулыя гады дзяржбюджэт зацьвярджаўся ЦВК і канчатковае афармленьне было ў другім квартале, а ў гэтым годзе мы у 2-м квартале маем ужо магчымасьць зацьверджаць наш бюджэт.

І нарэшце, я хацеў-бы зьвярнуць увагу асабліва Менскіх таварышоў, членаў бюджэтнай камісіі і гаспадарнікаў, на надзвычайна слабае наведваньне і слабую прапрацоўку бюджэта менскімі таварышамі. У нас было такое здарэньне, што па лясных прыбытках мы прыбавілі 6,5 мільёнаў рублёў і ня было нікога, хто расказаў бюджэтнай камісіі, чаму гэта за Лесбелам застаецца штогод пераходзячая заназычанасьць у такой вялікай суме. І вось толькі пасьля таго, як мы прынялі гэтую лічбу, на Бюджэтную камісію прышоў Прэзыдыум ВСНГ і Лесбел, яны абгрунтавалі неабходнасьць застаўленьня гэтай пераходзячай заназычанасьці і Бюджэтная камісія згадзілася з іх меркаваньнямі.

Прыбыткі значна павялічыліся.

Мы на нашаму бюджэту 1929-30 г. павялічылі даходную частку ў згодзе з Савнаркомам на 13322820 руб. Значыць, па першым меркаваньням Савнаркома даходная частка бюджэту была 103 мільёна, зараз яна будзе 116 мільёнаў з чым-та. На адпаведную суму прыблізна зьмяншаецца дэфіцытнасьць нашага дзяржаўнага бюджэту.

Па-першае павялічылі па падаходнаму падатку на 2300820 р. Пасьля грунтоўнага аналізу гэтага падатку мы нашлі магчымым гэта павялічэньне зрабіць. Другая вялікая прыбаўка, якую мы зрабілі, была па лясному даходу. Лясны даход зьяўляецца галоўнай і асноўнай нашай даходнай крыніцай; ён быў вызначан Савнаркомам у 45 мільёнаў руб. Але ў зьвязку з тым, што будзе адпушчана ў гэтым годзе больш лесасекаў, чым вызначылася раней, мы ўлічваючы гэта, прыбавілі яшчэ даходу ад лясоў на 6500000 р. і ўсяго значыць даход ад лясоў будзе складаць 51500000 р. Трэцяя прыбаўка — гэта адлічэньні ад даходу прамысловых прадпрыемстваў. Савнаркомам было намечана адлічэньне ў суме 9.400.000 руб., бюджэтная камісія павысіла гэту суму на 4 мільёна і такім чынам па гэтаму артыкулу даход выразіцца ў суме 13.400.000 руб.

У даходнай частцы мы павялічылі суму ад розных даходаў. Ёсьць такія выпадковыя даходы (ад штрафаў, залогаў, продажу непатрэбнай маёмасьці і г. д.) Савнарком меркаваў па гэтаму пункту 400 тысяч руб., мы павялічылі на 200.000 руб. Гэты артыкул як быццам ня вельмі вялікі, але тут ідзе павялічэньне па 100 пр. у параўнаньні з мінулым годам: замест 300.000 р. па гэтаму параграфу ў мінулым годзе, мы зараз прынялі 600.000.

Вось тыя заўвагі і зьмены, якія бюджэтная камісія зрабіла па даходнай частцы бюджэту. Хачу тут сказаць яшчэ толькі пару слоў. Мы настолькі шчыльна падыходзілі да выяўленьня даходных крыніц, і бюджэт у зьвязку з гэтым будзе настолькі напружаным, што прыдзецца і Цэнтральнаму Выканаўчаму К-ту і ўсім бюджэтным установам з надзвычайна вялікай ашчаднасьцю падходзіць наперадзе да выдаткаваньня і на другое, да спагнаньняў і выяўленьня ў новых даходных крыніц, дзеля таго, каб выканаць гэтую надзвычайна напружаную даходную частку нашага бюджэту.

На пашырэньне асьветы.

Зараз палопт расходнай часткі нашага бюджэту. Наогул мы павялічылі яе на 1.134.000 р., фактычна мы павялічылі выдаткі на 1.649.000, але адначасова зьменшылі на 515.000 іншыя выдаткі, так што павялічэньне балянсуецца ў суме 1.134.000 руб. Скарацілі мы адміністрацыйна-кіруючыя выдаткі. Згодна існуючых дырэктыў ніякага павялічэньня адміністрацыйных выдаткаў даваць ня можна, і таму Бюджэтная камісія выкрэсьліла тыя 515.000 па адміністрацыйна-кіруючым выдаткам, на якія ідзе павялічэньне ў гэтым годзе. Ня буду спыняцца, з якіх Наркаматаў, гэтыя выдаткі скарочаны. Гэтыя Наркаматы ужо асьведомлены, але наогул па ўсіх цэнтральных наркаматах адміністрацыйныя выдаткі скарочаны на 515.000 р.

Па якой-жа лініі ішлі ў нас прыбаўкі ў выдатковай частцы? Па першае, значныя сумы дададзены да каштарысу Наркамасьветы. Дададзена 340 000 руб. на стыпэндыі студэнтам; зараз студэнты будуць атрымоўваць не так, як да гэтага году, а дыфэрэнцыраваныя стыпэндыі; гэта значыць, што ніжэйшыя курсы будуць атрымоўваць меншую стыпэндыю, а вышэйшыя курсы павялічаную стыпэндзію, у зьвязку з тым, што у студэнтаў вышэйшых курсаў маецца больш навуковых запатрабаваньняў. Потым мы дабавілі 45.000 на пэрыодычныя надбаўкі настаўнікам. З гэтага году ўводзяцца пэрыодычныя прыбаўкі настаўнікам за выслугу гадоў, і на гэтую мэту трэба было ў гэтым бюджэце даць 45.000 р. Далей, мы дадалі у каштарыс Наркамасьветы 23.000 р. на бесперапынную практыку студэнтаў. Мы маем пастанову Цэнтральнага Камітэту партыі яшчэ у ліпені 1928 г., а таксама пастанову Цэнтральнага Камітэту, апублікаваную на гэтых днях аб падрыхтоўцы нашых кадраў і аб бесперапыннай вытворчай практыцы. Да гэтага часу у нас бесперапынная вытворчая практыка праводзілася вельмі дрэнна. Зараз дзякуючы гэтаму дадатковаму асыгнаваньню 23000 р. мы зможам палепшыць вытворчую практыку і гэтым самым палепшыць якасьць тых спэцыялістых, якіх мы будзем выпускаць з нашых навучальных устаноў.

Далей мы прыбавілі Наркамзему таксама на падрыхтоўку кадраў, галоўным чынам на павышэньне кваліфікацыі нізавых зямельных працаўнікоў, працаўнікоў калгасаў, савгасаў і г. д., на гэтую мэту мы павялічылі каштарыс Наркамзему на 250000 р. Мы павялічылі выдаткі на электрафікацыю на 750000 руб. У гэтым годзе меркавалася адзін мільён рублёў на электрафікацыю. Такім чынам зараз мы прынялі суму у 1.750.000 р.

Далей ідуць прыбаўкі на навукова дасьледчы інстытут, па абсталяваньне абсэрватэрый, патрэбнай для працы НДІ – 65000 р.; Наркамфіну на падрыхтоўку нізавога фінансавага апарату дабавілі 78000 р. і ЦСК дзеля таго, каб яно магла выконваць тыя заданьні, якія на яго ўкладзены,—80000 р. І яшчэ адзін выдатак мы прынялі, гэта на перавыбары саветаў. Тыя сумы, якія былі ў мінулым годзе, у гэтым бюджэце ня былі уключаны; мы уключылі на перавыбары Саветаў, галоўным чынам на літаратуру, 18000 р.

Вось тыя зьмены, што мы унесьлі ў выдатковую частку.

ДЗЕНЬНІК СЭСІІ.

(25 лістапада 1929 г.).

На ранішнім пасяджэньні заслухан даклад Намесьніка Народнага Камісара Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР тав. Рыськіна аб чыстцы савецкага апарату. У спрэчках па дакладу выказаліся т. т. Новікаў, Новік, Зумін, Лубуж, Гэрынг, Шнэерава, Мундау, Дварэцкі, Земнік, Гавака, Даўгаланцьева, Сташэўскі, Буглак, Эгле і Яршоў.

Па дакладу аб чыстцы савецкага апарату сэсія прыняла за аснову праэкт рэзалюцыі, і перадала гэты праэкт для прапрацоўкі ў камісію, вылучаную сэсіяй у наступным складзе: т. т. Рыськін, Сташэўскі, Мундау, Сіпчанка, Эгле, Даўгаланцьева, Балтынь, Сьвірыдаў, Яршоў, Ульянаў, Земнік, Зеленкоўскі, Жолудаў, Зумент, Прусакова, Буглак.

На вячэрнім пасяджэньні сэсія заслухала даклад тав. Дубіны аб усебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўцы і даклад т. Конанава аб рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную. Па дакладу аб рэарганізацыі Віцебскай акругі выказаліся т. т. Валодзька і Ракаў.

Сэсія ЦВК прыняла пастановы па дакладах: а) аб чыстцы савецкага апарату і б) аб рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную.

Днём у час абедзенага перарыву адбылася экскурсія групы членаў ЦВК на фабрыку Меншвэю.

ДА СЭСІІ ЦВК БССР.

Сёньня з 10 гадзін раніцы—пасяджэньні камісій Сэсіі ЦВК БССР, а таксама нарады членаў ЦВК БССР:

а) па савецкаму будаўніцтву—а 13 гадзіне, у клюбе Карла Маркса,

б) для абгаварэньня праэкту Зямельнага Кодэксу БССР,—а 12 гадзіне, у памяшканьні Наркамзему,

в) па пытаньнях сельска-гаспадарчай выстаўкі—а 14 гадз. у памяшканьні СНК (Выставачнага Камітэту).

Вячэрняе пасяджэньне сэсіі—з 6 гадзін.

Парадак дню:

а) Зацьверджаньне важнейшых пастаноў, прынятых у пэрыяд паміж сэсіямі ЦВК. (Дакладчык тав. Хацкевіч).

б) Зацьверджаньне рэзалюцый па дакладах.

в) Зачыненьне сэсіі.

Сакратар ЦВК БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Працоўныя латышы вітаюць сэсію.

Учора на вячэрнім пасяджэньні на сэсію ЦВК БССР зьявіліся ў поўным складзе дэлегаты 2-га Усебеларускага Зьезду працоўных латышоў, які зараз адбываецца ў Менску.

Шумнымі воплескамі спаткала сэсія дэлегатаў зьезду. З прывітаньнямі выступілі: рабочы мэтпрому т. ЗАКС, калгасьнік Полаччыны т. ЗАЛІТ і калгасьніца Бабруйшчыны т. ЭЙЗЭНГРАУЗ, якія заверылі сэсію, што працоўнае латыскае насельніцтва ішло, ідзе і будзе ісьці ў адным гардзе будаўнікоў сацыялізму. Зьезд працоўных латышоў пастанавіў у самы кароткі час калектывізаваць поўнасьцю усё працоўнае латыскае сялянства.

З адказам з на прывітаньні выступіў старшыня ЦВК т. ЧАРВЯКОЎ А. Г.

К КП(б)Б вітае тав. Сталіна дзень яго 50-цігодзьдзя.

Іосіфу Вісарыонавічу Сталіну.

ДАРАГІ ТАВАРЫШ!

У дзень твайго 50-цігодзьдзя Цэнтральны Камітэт КП(б)Б шле палкае камуністычнае прывітаньне ад бальшавікоў Савецкай Беларусі.

У тваёй асобе рабочая кляса і яе камуністычная партыя сёньня бачылі нязьменнага і непахіснага барацьбіта за чыстату ленінскай лініі, за сталёвае адзінства бальшавіцкіх шэрагаў на праціву ўсёй гэрэічнай гісторыі камуністычнай партыі.

Твая ленінская непрымірычасьць у барацьбе з ворагамі рабочага класу і камуністычнай партыі, у барацьбе з контр-рэвалюцыйным трацкізмам і права-апартуністычнымі панікёрамі і капітуляньцамі і ўсякімі ўхіламі і ідэалёгічнымі хістаньнямі, твая настойлівасьць у барацьбе за ленінскую лінію партыі і за маналітнасьць бальшавіцкіх шэрагаў,—надае нам яшчэ больш бадзёрасьці і ўпэўненасьці ў нашай упартай рабоце па пабудове сацыялізму ў нашай краіне і ў барацьбе за перамогу камунізму ва ўсім сьвеце.

Няхай жыве Усесаюзная Камуністычная Партыя!

Няхай жыве правадыр УсеКП(б), вэрны паплечнік Леніна—Сталін!

ЦК КП(б)Б.

* * *

Генэральны сэкратар ЦК УсеКП(б) Іосіф Вісарыонавіч **Сталін** радзіўся 1879 годзе. Яго прозьвішча—Джугашвілі (Сталін—старая рэвалюцыйная клічка).

Бацька тав. Сталіна быў селянінам Тыфліскай губ., займаўся шавецкім рамяслом. Сына чакала рамяство бацькі, але выпадкова яго прызначылі ў Тыфліс з духоўных сэмінарый, якія ў тайскі царскі ўрад клапатліва засаджаў у цэнтры і на акраінах. Дурныя сэмінарыя, разумеецца, не адпала ні патрабаваньням, ні настроям будучага рабочага руху. Тав. Сталіна гэтае навучальнае ўстановы ня скончыў—ён быў выключаны «за неблагонадзежность».

У сямнаццаці год тав. Сталін уцягнуты ў рэвалюцыйную дзейнасьць. У 1896 году ён уваходзіць у сацыял-дэмакратычную партыю, працуе спачатку як кіраўнік вучнёўска-марксыцкага гурткоў, а затым займаецца рэвалюцыйнай дзейнасьцю сярод рабочых Тыфлісу, Баку і Батуму.

У 1902 годзе тав. Сталін—адзін з арганізатараў батумскіх дэманстрацый. Затым арыштоўваюць. Канец 1902 году і весь 1903 год ён праводзіць у кутузцы, а ў 1903 годзе яго высылалі ва Усходнюю Сібір. У студзені 1904 году тав. Сталін бяжыць з Сібіры і аднаўляе рэвалюцыйную работу. У 1908 годзе ён зноў арыштаваны па справе бакінскага друку. Зноў турма і ссылка ў Валагодзкую губэрню. У 1909 г. ён уцякае ў Парыж. Зноў захапляецца рэвалюцыйнай работай і зноў арышт і ссылка ў Сібір на 6 год. Праз год ён уцякае адтуль у Пецярбург. Праз некалькі месяцаў—арышт па справе ЦК партыі, і т. Сталіна высылаюць у Валагодзкую губэрню, але адтуль у сьнежні ён зноў уцякае.



Тав. СТАЛІН.

Астатні раз тав. Сталін быў арыштаваны ў Пецярбургу ў сакавіку 1913 году і быў сасланы ў Туруханскі край, у вёску Курэйка за палярны круг. Тут ён знаходзіцца да лютаўскай рэвалюцыі.

Пасьля лютаўскага перавароту тав. Сталін быў рэдактарам бальшавіцкіх газэт—«Правды», «Рабочего и Солдата», «Рабочего Пути», «Рабочего».

Тав. Сталін—адзін з кіраўнікоў Кастрычнікавае рэвалюцыі. Пасьля рэвалюцыі ён быў назначаны Наркамнацам, у 1919 годзе—Народным Камісарам Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі і быў на гэтым пасту да 1923 году. З 1920 па 1923 год тав. Сталін—член Рэвваенсавету Рэспублікі. За ваенныя заслугі мае ордэн Чырвонага Сьцягу.

Бухарын, Рыкаў, Томскі і Угараў прызнаюць свае памылкі.

У ЦК УсеКП(б).

У апошні час паўтара гады між намі і большасьцю ЦК УсеКП(б) і супярэчнасьці па шэрагу палітычных і тактычных пытаньняў. Свае погляды мы выказвалі ў шэрагу дакумантаў і выступленьняў на пленумах і іншых пасяджэньнях ЦК і ЦКК УсеКП(б). Мы лічым сваім абавязкам заявіць, што ў гэтых спрэчках мелі рацыю партыя і яе ЦК.

Прызнаючы гэтыя свае памылкі, мы з свайго боку прыкладем усе сілы да таго, каб разам з усёй партыяй павесьці рашучую барацьбу супроць усіх ухілаў ад генэральнай лініі партыі, і, перш-на-перш, супроць правага ўхілу і прымірэнцтва з тым, каб дамагчы ўсе цяжкасьці і забясьпечыць хутчэйшую перамогу сацыялістычнага будаўніцтва.

Масква. **Н. БУХАРЫН, А. І. РЫКАЎ, ТОМСКІ.**

У ЦК УсеКП(б).

Дарагія таварышы!

На апошніх двух пленумах ЦК я падтрымліваў т. т. Бухарына, Рыкава і Томскага. У сучасны момант я пераканаўся, што іх погляды былі памылковымі і з гэтае прычыны было памылковым маё утрыманьне названых таварышоў. Я цалкам і поўнасьцю заганяю і палітыку ЦК, буду актыўна за яе змагацца і яе ажыцьцяляць.

Масква. **Сябра ЦК УсеКП(б) УГАРАЎ.**

З лісту тав. Кастрова ў ЦК УсеКП(б).

У артыкуле «Аб тэмпах перабудовы», асьвечаным пытаньню аб шчыльнай сувязі, якая існуе паміж тэмпамі сацыялістычнай рэканструкцыі і тэмпамі перабудовы нашых арганізацый, мабілізацыяй мас і г. д., я пісаў: „Тут справа ідзе аб генэральным мабілізацыйным пляне. Адгэтуль вялізарнейшае, сьмела можна сказаць, рашаючае, значэньне такіх пытаньняў, як перабудова прафсаюзаў і стварэньне шырокіх масавых арганізацый беднаты на вёсцы. Даючы гэтую фармулёўку, я меў на ўвазе стварэньне новых масавых арганізацый беднаты на вёсцы. Асноўнай палітычнай памылкай таварышоў пытаньня было тое, што я пры гэтым не даацаніў небясьпекі процідзеяньня новых арганізацый беднаты нашым партыйным і савецкім арганізацыям на вёсцы. Выказваючы патрабаваньне стварэньня новых арганізацый беднаты ў складзе пераплёце клясавых адносін сучаснай вёскі, я ня ўлічыў небясьпекі мабілізацыі ідэй сялянскага саюзу, які зьяўляецца зародышам другой (кулацкай) партыі.

Вопыт мінулага часу паказаў, што ўстановы зараз формы арганізацыі бедноты забясьпечваюць мабілізацыю шырокіх мас і разгортваньне нашага наступу на капіталістычныя элемэнты вёскі, што я дапусьціў тут сур'ёзную палітычную памылку.

У сувязі з гэтым лічу патрэбным заявіць, што прызнаю памылковаю пастаноўку пытаньня, дадзеную ў маім артыкуле, і поўнасьцю згодзен з пастановаю ЦК, які правільна выкрыў дапушчаныя ў маім артыкуле памылкі. Увесь мой артыкул аб'ектыўна зьявіўся выяўленьнем вядомай палітычнай абасобленасьці, пагражаючай супроць майго жаданьня ўзьнікненьнем сялянскай партыі. Між тым, усякая абасобленасьць, наогул недапусьцімая ў шэрагах бальшавіцкай партыі, асабліва небясьпечна ў сучасны пэрыяд вялікага пералому, калі партыя з вялізарным напружаньнем вырашае цяжкія задачы сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, перамагаючы суровае супраціўленьне клясавага ворага, змагаючыся на два фронты як з правым ліквідатарствам, якое зьяўляецца галоўнаю небясьпекаю, так і з контррэвалюцыйным трацкізмам і паўтрацкісцкімі настроямі".

Другая Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі

Спрэчкі па дакладу тав. Рачыцкага і садакладу тав. Тарасенка.

Інтэрнацыяналізаваць яўрэйскія калгасы

Прамова тав. Бэйліна.

Гіганцкі рост працэсаў калектывізацыі сельскай гаспадаркі, які зараз адбываецца на вёсцы ў Беларусі, тая аграрная рэвалюцыя, якая зараз разгарнулася: на вёсцы з такім высокім тэмпам і прыняла вышэйшыя формы разьвіцьця—калектывізацыі, ставіць ў тэрміновым парадку перад партыйнымі, савецкімі, гаспадарчымі і кааперацыйнымі органамі цэлы шэраг задач, каб дапамагчы гэтаму сацыялістычнаму будаўніцтву. У рэзалюцыі апошняга лістападаўскага пленуму ЦК УсеКП(б) яскрава высоўваецца цэлы шэраг праблем і практычных задач, якія зараз трэба ўжыць, каб спрыяць разьвіцьцю і перабудове сельскіх гаспадарак на вышэйшую форму, форму калектывізацыі.

Калі добра прыглядзецца да працы сельсаветаў, дык трэба сказаць, што гэтай работай калектывізацыі сельсаветы не займаюцца і РВК не зьвярнуў яшчэ на гэта дастатковай увагі. Сельсаветы да сучаснага моманту не захопілены гэтай вялізарнейшай працай, а неабходна трэба, каб гэтым займаліся сельсаветы. Неабходна, каб усе камісіі с. с—культурная, аграпамічная і інш. усю сваю работу перабудавалі на калектыўны лад, так каб яна садзейнічала работе ў калектывах. Неабходна пераглядзець пытаньне аб практычнай працы камітэтаў узаемадапамогі.

Барацьба з клясавым ворагам зараз прымае іншыя формы, ня толькі ў вёсцы, але і ў горадзе, але ў асноўным найбольш абвостраная яна зараз ў вёсцы. Клясавы вораг бачыць, што адным забойствам старшыні с. савету, старшыні калгасу, актывіста-грамадзкага працаўніка, падпалам каргласу — ён ня спыніць калектывізацыі, і ён—кулак і нэпман—стараецца пралезьці ў калектыў і там весьці разлагаючую работу і перашкаджаць нашай калектывізацыі. Трэба не дапускаць кулака, нэпмана ў калектывы, бо ён ідзе з пэўнай мэтай, каб унутры мяшаць там нашаму калектыўнаму будаўніцтву. У сувязі з гэтым перад намі зараз высоўваецца вялізарнае пытаньне аб кадрах.

Пленум ЦК УсеКП(б) пастанавіў пасылаць ў вёску лепшых падрыхтаваных палітычна рабочых з заводаў і фабрык на меж, як 25 тыс. на СССР дзеля калгаснага будаўніцтва, каб перанесьці вопыт і ініцыятыву фабрык у вёску. Мы ў Беларусі не павінны чакаць ніводнай гадзіны, а зараз жа павінны пасылаць рабочых з фабрык і заводаў на вёску, ажыцьцявіць заветы тав. Леніна—змычку рабочае клясы з сялянствам, дапамагчы вёсцы перабудаваць сваю старую адсталую гаспадарку, раздробленую гаспадарку ў высока-культурныя калектыўныя формы. За гэта павінны ўзяцца партыйныя, прафсаюзныя і гаспадарчыя органы. Прафсаюзы зараз жа павінны заняцца пасылкай дзесяткаў, і соцен рабочых з нашых фабрык, якія ўжо узмацніліся і перайшлі на рацыянальную форму работы на сацыялістычнаму будаўніцтву, якія ўжо праводзяць пасьпяхова сацыялістычнае спаборніцтва.

Зараз маем па Беларусі каля 300 яўрэйскіх, маем польскія калектывы. Гэта паказвае на тую вялікую работу, праведзеную савецкай уладай і камуністычнай партыяй у вырашэньні нацыянальнай палітыкі. Ні водная краіна ў сьвеце ня можа гэтым пахваліцца. Чытаючы газеты, можна ўбачыць, як нацыяльная палітыка праводзіцца ў недалёкай нашай суседзі—фашысцкай Польшчы. Там робяцца яўрэйскія пагромы, разбураюцца беларускія школы і культурныя ўстановы. Адзін французкі карэспандэнт, які быў у Польшчы і прыглядаўся да жыцьця ў Польшчы, зьмясціў некалькі артыкулаў у французкай газеце «ля пти Парызьен» ад 18 і 19 кастрычніка—1929 г., і вось што карэспандэнт па прозьвішчу Альберт Ліндр, на звароту з Польшчы ў Францыю піша пад загалоўкамі «В Варшаве—еврейской метрополии» и «Ужасная судьба этих из Львова»:

«Польскі ўрад паставіў іх (яўрэяў) па-за межамі жыцьця. Ён зачыніў перад яўрэямі дзьверы ўсіх устаноў; ва ўстановах няма месца для яўрэяў-чыноўнікаў. Яўрэеў выгналі з кіраўніцтва жалезных дарог, з пошты, з саляных месцярожаў. У апошні час на дзяжэўнай службе быў толькі адзін яўрэй-паштальён. Калі ў міністра запыталіся аб гэтым яўрэі-паштальёне, дык міністр адказаў, што ён ужо звольніў з працы гэтага яўрэя, таму што яўрэі ня ўмеюць хадзіць. Апошняя забастоўка ў Лодзі была выклікана польскімі работнікамі-сацыялістамі, якія гэткім спосабам пратэставалі супроць прыёму работнікаў яўрэйскага паходжаньня. Абкружаныя з усіх бакоў злагбаўмамі яўрэі адступілі на Налеўкі (частка Варшавы, заселяная яўрэямі). Лёзунгам польскай грамадзкасьці зьяўляецца: «ніхто, апроч палякаў». Прэзыдэнт польскай рэспублікі зьяўляецца прэзыдэнтам палякаў, а не яўрэяў... У Польшчы знаходзіцца 3 з палов. мільёны яўрэеў, а агульны лік жыхароў у Польшчы складае 30 мільёнаў. Яўрэй ня можа быць членам адміністрацыйнага кіраўніцтва ні ў арміі, ні ва Ўнівэрсітэце. Пралетарыят яўрэйскі пазбаўлен крыніц заработку; яўрэйскага рабочага ня пушчаюць на фабрыку; а яўрэйскі інтэлігент ніякім чынам ня можа ўзьняцца на больш высокія ступені грамадзкага жыцьця.

Чаму-ж гэта ўсё адбываецца? Таму што польскі ўрад паколькі пытаньне ідзе аб вырашэньні яўрэйскай праблемы — ня можа нічога зрабіць. Ненавісьць да яўрэяў, якую пакінулі нам у спадчыну дзяды, бярэ перавагу над усім.

Яўрэі, якія жывуць у Польшчы перажываюць самы горшы перыяд сваёй нявол'і.

У Львове жыве 80.000 яўрэяў супроць 200.000 палякаў. Калі-б мы хацелі ўжыць выраз «супроць» у дакладным яго значэньні, дык трэба было-б сказаць, што 200.000 палякаў жыве супроць 80.000 яўрэяў.

Яўрэі ў Львове жывуць надзвычайна дрэнна. Яны ўсе бяз выключэньня мараць аб тым, каб уцячы. Але Злучаныя Штаты і Канада зачынілі перад імі свае брамы. Аргентына патрабуе ад кожнага прыехаўшага 150 даляраў. Францыя таксама перашкаджае рознымі спосабамі. Палестына вабіць толькі маладых. А таму і надалей прыходзіцца жыць гэтак-жа дрэнна...

Польскі Львоў прыгожы горад, але нас цікавіць другі Львоў—Львоў — яўрэйскі. Знаходзіцца ён на ваколіцы алеі—Легіёнаў. Прарок Ерамія, прадказваючы зруйнаваньне дамоў і жудасны лёс іх жыхароў, меў на ўвазе жыхароў Львову—яўрэяў.

Я неяк спыніўся на Зморчай вуліцы, жадаючы зрабіць заметку. У гэты момант каля мяне праходзіў нейкі паляк і вельмі моцна штурнуў мяне са словамі: «прэч з дарогі, пракляты сабака».

— Гэта пічога,—таварышы мне таварышы—не рабіце, калі ласка, скандалу. Ён бачыў Вас сярод нас і таму думаў, што вы яўрэй.

Польшча бязумоўна ненавідзіць яўрэяў. Яна выгнала іх з усіх сваіх манаполій, выкінула іх з рамак нацыянальнага жыцьця, і зрабіла гэта больш энэргічна, чымся царскі ўрад. Але Польшча адкідае толькі тых, якія не жадаюць асімілявацца. Польшча ня хоча быць больш яўрэйскай чымся яўрэі быць польскімі. А таму, што Польшча больш моцная, дык яўрэі стогнуць над яе уціскам. Іх душаць, затыкаюць ім рот, закідваюць іх гноём—але ня думайце, што яны просяць ласкі».

Калі-б Вы больш уважліва прыслухаліся, Вы-б пачулі той-жа самы ўздох усюды: «мы—яўрэі».

Што гэта, таварышы, даказвае. Мы пядаўна мелі ў Польшчы суд над рабочымі і сялянамі Заходняй Беларусі—Грамады, разгром беларускага сялянства, разгром культурных беларускіх школ і ўстаноў, пагромы на яўрэяў, дык гэта, таварышы, можа рабіць толькі такая краіна, дзе існуе фашызм, Пілсудчына. І сучасная Польшча—гэта турма народаў, краіна няволі і прыгнечаньня нацменшасьцяў.

Савецкая ўлада шмат чаго зарбіла, робіць і будзе рабіць для вырашэньня важнейшага пытаньня—нацпалітыкі.

Мы зараз у адной БССР маем каля 70.000 гэктараў зямлі, на якой жывуць яўрэйскае працоўнае насельніцтва (беднота, дробныя бедныя гандляры, якія кінулі гандаль, а зараз чэпка займаюцца сельска-гаспадарчай працай). Савецкая ўлада тым, хто хоча чэпка займацца працай дапамагае ў гэтым: сродкамі, зямлёю, крэдытам, кіраўніцтвам і г. д.

Зараз калі бярэм такі тэмп нашага калектыўнага будаўніцтва, тэмп наогул сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе і вёсцы павінен быць узьняты і тэмп працы па пераводу бяднейшага насельніцтва, якое раней займалася дробным гандлям, на вытворчую працу.

Яўрэйскія калектывы трэба ўзбуйняць і інтэрнацыяналізаваць.

Мы павінны павесьці рашучую работу, агітацыю, прапаганду, растлумачэньне, ужываць розныя мерапрыемствы, а не толькі адны пастановы. Трэба ўліць яшчэ сотні сямей беларускага і насельніцтва іншых нацыянальнасьцяй у яўрэйскія калгасы. Таксама неабходна ўліць працоўнае і бяднейшае яўрэйскае насельніцтва ў не яўрэйскія калгасы. Работа па інтэрнацыяналізацыі павінна стаяць штодзённа ў парадку дню нашых партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў. Калгасаюз павінен распрацаваць цэлы шэраг мерапрыемстваў, асьвятляць працу ў друку, павесьці агітацыю ў гэтых адносінах.

Мы на гэтым шляху бязумоўна будзем мець перашкоды, мы і зараз іх маем з боку яўрэйскіх шавіністых. Мы расказвалі і ў друку асьвятлялася справа Мазырскіх шовіністых, якія зьявзаліся з клерыкаламі і вялі шкодную работу. Гэткія гутаркі, гэткія шовіністычныя настроі будуць, супярэчыць інтэрнацыяналізацыі яўрэйскіх калгасаў—гэта супроць яўрэйскага земляўпарадкаваньня, гэткія контррэволюцыйныя выступленьні будуць і ім трэба даць рашучы адпор.

Трэба будзе зараз жа заняцца гэтым пытаньнем, растлумачыць сутнасьць выступленьняў тых нацыянал-дэмократаў, шовіністых, якія будуць крычаць, каб не дапушчаць інтэрнацыяналізацыі. Гэта будзе зараз гаварыць нэпман, спэкулянт, кулак, клерыкалы, роўна і розныя контррэволюцыянэры. Пагэтаму яўрэйскі друк і наогул наш друк, яўрэйскія камуністы і ўся партыя, савецкая грамадзкасьць, павінны павесьці рашучую барацьбу супроць яўрэйскіх шовіністых, нацыянал-дэмократаў розных колераў, якія ў нас маюцца, якія вядуць і будуць весьці сур'ёзную контррэвалюцыйную работу, якія зьвязваюцца з клерыкаламі і нэпманамі супроць правядзеньня нацыянальнай палітыкі і мерапрыемстваў партыі і савецкай улады. Тут павінен быць дадзен рашучы адпор дзеля таго, каб больш хутчэй і лепш праводзіць нашу працу, каб лепш і хутчэй перавесьці яўрэйскую беднату на вытворчую працу.

Неабходна зара-жа сур'ёзна прагледзець існуючыя яўрэйскія калгасы і вычысьціць з іх сацыяльна-чуждых элемэнтаў і ў далейшым іх у калектывы ня пушчаць, і ўцягнуць туды працоўных, беднату.

Больш увагі падрыхтоўцы кадраў.

Прамова т. Масюкова.

Першае пытаньне, якое павінна быць пастаўлена—гэта аб дапамозе выкананьню задачы ў напрамку перабудовы сельскай гаспадаркі Беларусі ў асноўным на працягу пяцігодкі ў калгасы і савгасы.

Для ажыцьцяўленьня гэтай задачы неабходна вырашыць пытаньне забясьпечаньня сельскае гаспадаркі сродкамі вытворчасьці, кадрамі. У галіне забясьпечаньня сельскай гаспадаркі сродкамі вытворчасьці мы мяркуем пабудаваць у БССР на працягу 5 год 105 машынна-трактарных станцый. Для таго, каб забясьпечыць будаўніцтва гэтых машынна-трактарных станцый, нам трэба прыняць 12000 трактараў у 2-й пяцігодцы і 15000 трактараў—у II пяцігодцы з тым, каб усю тэрыторыю БССР ахапіць мэханічнай апрацоўкай глебы.

У пытаньні мэханізацыі сельскай гаспадаркі мы да гэтага часу маем такое становішча, што электрастанцыі, якія будуюцца ў мястэчках, будуюцца з мэтаю асьвятленьня. На наступны год мы праэктуем будаўніцтва шэрагу станцый выключна ў мэтах мэханізацыі сельскае гаспадаркі. Пытаньне электрафікацыі сельскай гаспадаркі павінна заняць першае месца, як задача спрыяючая найбольш шпаркаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Запатрабаваньні на мінэральныя ўгнаеньні, якія пашыраюцца з ростам калгасаў, з інтэнсыфікацыяй сельскае гаспадаркі ставяць перад намі ня толькі пытаньне аб завозе апошніх з замежаў БССР, але і вырабу іх унутры БССР.

Трэба будзе сэсіі даць больш катэгарычны загад нашай прамысловасьці аб пашырэньні вырабу.

Пытаньне забясьпечаньня сельскае гаспадаркі кадрамі трэба разгледзіць у такім напрамку, што зараз нам патрэбны працаўнікі, падрыхтаваныя палітычна, эканамічна і тэхнічна. Такім чынам, перад намі стаяць задачы перабудовы ўсіх навучальных плянаў і праграм існуючых у навучальных установах, шчыльнай увязкі апошніх з вытворчасьцю і рэканструкцыяй сельскай гаспадаркі, прыстасаваньня плянаў навучальных устаноў да сучасных задач будаўніцтва сельскае гаспадаркі.

Мы зараз маем на абшарах БССР 907 спэцыялістаў з вышэйшай асьветай, 1973 з сярэдняй асьветай і 1874 з ніжэйшай асьветай. Дзеля таго, каб забясьпечыць тэмп узрастаючага калгаснага і савгаснага будаўніцтва, нам трэба да канца пяцігодкі мець: 4121 чалавек з вышэйшай асьветай, 5770 чал. з сярэдняй і 11462 з ніжэйшай і 20000 трактарыстаў. Дзеля таго, каб падрыхтаваць такую колькасьць спэцыялістаў, трэба абгаварыць і высунуць гэтую задачу для далейшага выкананьня. Трэба ўжо зараз паставіць пытаньне аб арганізацыі шэрагу сельска-гаспадарчых тэхнікумаў і факуль тэтаў, аб павялічэньні прыёму ў існуючыя сельска-гаспадарчыя факультэты, а таксама аб адчыненьні шэрагу ніжэйшых прафтэхнічных школ. У гэтым пяцігодзьзі мы зможам падрыхтаваць патрэбныя кадры спэцыялістаў з ніжэйшай і сярэдняй адукацыяй. Пытаньне падрыхтоўкі спэцыялістаў з вышэйшай асьветай будзе вырашана толькі к канцу пяцігодкі.

Зараз задача ўпіраецца ў перападрыхтоўку практычных працаўнікоў, якія зараз маюцца ў сельскай гаспадарцы, зараз ужо трэба абгаварыць пытаньне аб арганізацыі па прыкладу іншых Саюзных рэспублік і абласьцей практычнага сельска-гаспадарчага інстытуту ў БССР.

Зараз трэба паставіць перад нашымі савгасамі і калгасамі задачу, што пакуль мы ня здолеем забясьпечыць наш сацыялістычны сэктар патрэбнымі складанымі сродкамі вытворчасьці, стварыць такія сырцовыя і экспартныя магчымасьці, каб за кошт гэтага фонду можна было завезьці ў БССР некалькі трактараў з замежаў. І такім чынам паскорыць тэмп мэханізацыі сельскае гаспадаркі. Падругое. —трэба зьвярнуць увагу на тое, каб тыя накапленьні, якія зараз маюцца накіраваць выключна на вытворчыя працэсы ў сельскай гаспадарцы.

Упарадкаваць кіраўніцтва калгасамі.

Прамова т. Аксючыца.

За апошні час хоць і менш сталі гаварыць аб тым, што тэмпы калектывізацыі для нас зьяўляецца тэмпамі вялікімі і што іх трэба вьменшыць, але гэтыя размовы дзе-ні-дзе ёсьць яшчэ і да гэтага часу.

Ці можна так ставіць пытаньне?

Калі-б мы сабе паставілі пытаньне аб тым, каб гэтыя тэмпы зьменшыць, то гэта значыла-б паставіць пытаньне аб тым, што трэба нашу клясавую барацьбу на вёсцы зьменшыць. Так ставіць пытаньне мы ня можам. Гэта пастаноўка пытаньня ня наша. Ці можам мы ставіць пытаньне перад сабой так, як ставіць некаторыя таварышы з тых устаноў, якія павінны абслугоўваць гэта калгаснае будаўніцтва, што тэмп калектывізацыі трэба прыстасаваць да нашых арганізацыйных умоў, да нашых магчымасьцяў абслугоўваньня калектывізацыі. Трэба ставіць пытаньне наадварот; трэба апарат прыстасаваць да тых тэмпаў калектывізацыі. Тэмп калектывізацыі зьяўляецца у нас такім, які павінен быць падтрыман, і яго трэба як мага разгортаць шырэй.

Раскачка працы нашага апарату надзвычайна адстае ад жыцьця. Гэта зьяўляецца небясьпечным момантам. Атрымоўваецца такая няжыцьцёвасьць, што актыўнасьць вёскі надзвычайна вялікая да калектыўнага руху. У нас на Меншчыне, надзвычайна вялікая актыўнасьць у гэтай справе. Але-ж трэба канстатаваць, што нават нізавы савецкі апарат, які ў вёсцы сядзіць, які там глядзіць і які нібыты гэтым кіруе, таксама яшчэ не як сьлед пераключыўся на абслугоўваньне калектыўных гаспадарак. Мы яшчэ толькі калектыўна гаворым, праўда добра гаворым, выносім добрыя рэзалюцыі, палітычна правільныя рэзалюцыі, але практычна пытаньне не прапрацавана. Практычна пытаньне не прапрацавана нават нашай Горанцкай Сел.-Гасп. Акадэміяй.

Яшчэ яскрава не пастаўлена пытаньне ў гэтай галіне, і з гэтай трыбуны неабходна яскрава паставіць пытаньне, а што будзе заўтра. Якое пытаньне патрэбна паставіць і трэба адказаць так: трэба даць рашучы загад Сэсіі, што трэба пераключацца ў сваёй працы.

Я не з такім пэсімізмам гляжу, што тут дрэнна будзе, але тут вялікія будуць непаразуменьні. Трэба паставіць пытаньне, каму трэба даваць кірунак арганізацыйнай працы. Хто павінен кіраваць калгасам, жыцьцём калгасу. Калі мы не пераключымся, калі ў гэтай справе будзем далей займацца толькі размовамі, бязумоўна будзем мець вялікія хібы.

Таму сёньня Сэсія ЦВК перад усімі гэтымі ўстановамі павінна паставіць і адбіць у сваіх пастановах гэтае пытаньне адносна таго, што ўжо досыць нагаварыліся, ужо настаў час спыніць разгаворы і канкрэтна заняцца працай і заўтра-ж пасьля гэтых пастаноў пераключыцца і працаваць, каб абслугоўваць калгасныя гаспадаркі.

Я лічу, што т. Рачыцкі ў сваім дакладзе ня даў яснага адказу на запытаньне якое ён паставіў перад Сэсіяй і лічу, што ён ня толькі павінен запытаць у Сэсіі, але даць адказ аб так, як быць у далейшым з жывёлагадоўляй.

Чаму ў гэтым годзе жывёлы на рынку многа прадаюць? Ня вывучалі гэтага пытаньня.

Па гэтаму пытаньню трэба даць яскравы катэгарычны адказ. Тое, што жывёла на рынак выкідваецца надзвычайна шпаркім тэмпам гэта спрыяе нашаму пляну загатовак мяса, але гэта не спрыяе разьвіцьцю жывёлагадоўлі і тут трэба прыняць рашучыя меры да таго, каб затрымаць гэты тэмп выкідваньня жывёлы. Адказу на гэта пытаньне ня было. Я буду прасіць, каб тав. Рачыцкі ў сваім заключным слове даў адказ на гэтае запытаньне.

Аб кадрах мы шырока паставілі пытаньне, яко праўда шырока вырашана нашай 5 годкай ў Саюзным маштабе і ў БССР, пачынае вырашацца зараз і практычна, але я лічу, што ўсё такі зараз калгаснае будаўніцтва знаходзіцца ў такім становішчы, што мы ня можам чакаць таго, што праз два гады нам дасьць сельска-гаспадарчая акадэмія. З тых кадраў якія мы маем у наяўнасьці, нават кадраў савецкага партыйнага актыву мы павінны арганізаваць цэлую армію людзей і разаслаць па калгасах, бо ёсьць такія месцы, дзе няма каму кіраваць калгасам. Праўда пастановы ёсьць добрыя мы практычна іх праводзім. Мы праводзім шмат курсаў, але трэба яшчэ мабілізаваць цэлы шэраг работнікаў для таго, каб перакінуць на гэты фронт працы інакш справа з кадрамі ў нас будзе абстаяць вельмі дрэнна.

Чырвоная армія дапаможа калектывізацыі

Прамова тав. Лаціса.

Таварышы! я хачу ў сваім выступленьні спыніцца на тым, якую дапамогу можа аказаць Чырвоная армія калгаснаму будаўніцтву. Гэтая дапамога павінна ісьці па 3-х асноўных лініях: 1-е па лініі скарыстаньня выездаў начскладу на вёску, калі ён выезжае на дапрызыўную падрыхтоўку, міжзборавую работу, падругое, па лініі збораў пераменнага складу і патрэцяе—па лініі шэфскай. Уся гэта работа будзе прадукцыйнай тагды, калі будзе праведзена падрыхтоўчая работа сярод начскладу, бо ў сваім практычным разрэзе начскład да гэтага часу недастаткова падрыхтован па гэтаму пытаньні. Калі ўся Чырвоная армія ўсвоіла асноўную лінію нашае партыі ў гэтым пытаньні, дык усё-ж такі ў практычнай працы начскład ня досыць падрыхтаваны. Што-ж датычыцца да збораў пераменнага складу, дык тут апроч усёй працы якую мы праводзілі мы будзем паводзіць сярод сялян і рабочых, якія будуць прыезжаць да нас у тэрытарыяльныя часткі. Так што падрыхтоўка ў гэтай галіне будзе забясьпечана цалкам.

Адносна шэфства. Зараз трэба будзе пераглядзець пытаньне ў разрэзе разгортваньня новага калгаснага будаўніцтва, каб часьці мелі шэфства над пэўнымі калг самі. Тут асаблівую дапамогу зможуць аказаць спэцыяльныя часьці Чырвонае арміі, вылучаючы адпаведныя калёны для практычнай дапамогі калгасам.

Вось гэтыя 3 асноўныя лініі па якіх павінна ісьці дапамога Чыр. арміі ў справе калгаснага будаўніцтва.

Другое пытаньне. Я лічу што сярод сялян пры правядзеньні нашай работы ня трэба сеяць ілюзій наконт забясьпячэньня трактарамі і складанымі машынамі. Мне некалькі разоў прыходзілася чуць на сходах выступленьні нашых т. т. якія давалі абяцанкі сялянам, што калі будзе створаны калектыў, дык яму дадуць трактар і інш. машыны, а потым аказваецца што гэтага трактару няма, і ў сялян здараецца такое ўражаньне што быццам іх ашукваюць. Трэба практычна ставіць пытаньне аб скарыстаньні пераваг калектыўнай працы на базе тых матар'яльных сродкаў, якія мы маем сёньня, паказаўшы, што мы будзем прымаць усе меры, каб на магчымасьці забясьпечыць іх адпаведнымі сродкамі вытворчасьці, але гэта можа быць зьдзейснена, ня сёньня, а заўтра, ці ў бліжэйшыя гады. Вось як трэба паставіць растлумачальную працу сярод сялян у сувязі з арганізацыяй калгасаў. Тады ў селяніна ня будзе тых ілюзій, якія зараз ствараюцца, калі селянін уваходзячы ў калгас адразу-ж патрабуе каб яму далі трактар. Калі мы такі мэтад будзем ужываць, тады і тэмпы нашае працы будуць лепшыя чым зараз, калі даем селяніну надзею, а гэтыя надзеі потым ня выконваем.

Забясьпечым калгасы прыладамі.

Прамова тав. Шалаховіча.

Бязумоўна правільна тут гаварылі таварышы, што ня ўсе нашыя савецкія ўстановы прыцягнуты да калектыўнага руху. Таварышы, якія тут выступалі нават і дакладчыкі не гаварылі аб усіх балячках нашых калектываў. Гэта гаворыць аб тым, што яны самі ня ведаюць як справа абстаіць у калектывах, а калі што і ведаюць, то яны бяруць гэтыя весткі з зямельнай часткі.

Нашы настаўнікі яшчэ на сёньняшні дзень не зьяўляюцца застрэльшчыкамі і прысьпешнікамі нашага калектыўнага руху, асабліва тыя, якія зьвязаны непасрэдна з гаспадаркай. Настаўнік які мае сваю ўласную гаспадарку, у калгас пад час ідзе з вялікай неахвотай. На гэта неабходна зьвярнуць належную ўвагу.

Нашы калгасы ўсялякімі дробнымі прыладамі забясьпечаны надзвычайна дрэнна, няма нават пастромак для хамутоў. На сотню коняй ёсьць 20 хамутоў.

Тав. Рачыцкі застанаўліваўся аб несваечасовай здачы кантрактацыі. Калі мы паглядзім на гэтую справу, дык кідаецца ў вочы шэраг недарэчнасьцяў. Трэба прагледзець тэрміны для здачы кантрактацыі і ўстанавіць іх у зімні час, калі менш работы. Кантрактацыя будзе здавацца своечасова.

Некаторыя таварышы і прабавалі зьвесьці ўсе недахопы да трактара. Ёсьць многа іншых недахопаў. У нас часта не хапае дробных частак да машын. Зламалася ў калектыве малацілка, дык замест таго, каб купіць паломаную частку, прыходзіцца купляць новую малацілку.

На гэта трэба зьвярнуць увагу.

Узьняць культурны ўзровень.

Прамова тав. Каварка.

Устаноўка партыі і улады на рэканструкцыю сельскае гаспадаркі была ня толькі ў 1928-29 г., а і ў мінулыя гады. Але посьпехі калектывізацыі, посьпехі перабудовы сельскае гаспадаркі былі зусім іншыя, чым мы наглядаем у сучасны момант. Раней калгаснае будаўніцтва было, але гэтыя калгасы былі зусім дробныя.

У 1929 годзе маем буйны ўадым калгаснага руху.

У зьвязку з гэтым перад намі павінна паўстаць пытаньне аб праблеме кадраў, праблеме жывёлагадоўлі. Нашым навуковым кадрам неабходна заняцца вырашэньнем гэтага пытаньня. Мне здаецца, што зараз трэба прыняць захады дзеля таго, каб нашы калгасы, якія зараз арганізуюцца былі былі больш забясьпечаны машынамі, бо тая колькасьць, якая адпускалася да сучаснага моманту недастатковая.

Мы павінны зьвярнуць максымум увагі на правільнае скарыстаньне крэдыту. Пры правядзеньні форм землякарыстаньня неабходна ўвагу ад індывідуальных гаспадарак пераключыць у бок калектываў.

У пытаньні аб агранамі трэба адмовіцца ад таго, што нашы аграномы да сучаснага моманту скарыстоўваліся ў якасьці „хадзячых агітпропаў" па сельскай гаспадарцы. Трэба пасадзіць іх на месцы ў калектыве, каб тут яны сваю работу і праводзілі.

Культурны ўзровень нашых калгасьнікаў зараз вельмі нізкі Статыстыка гаворыць, што на ўсіх калгасах 77 проц. жанчын няпісьменных і 15 проц. няпісьменных мужчын. Гэта зусім ненармальнае зьявішча. Праўда, жанчыны гэтыя вышлі з вёскі. НК Асьветы трэба канкрэтна падыйсьці да арганізацыі гэтай работы ў калгасах, не абмяжоўваючыся толькі дырэктыўнымі зазначэньнямі. Трэба гэтыя дырэктывы выдаваць з боку падвышэньня ўраджайнасьці, з боку забясьпечаньня культурна-бытавога характару і г. д. Вось хоць-бы такое пытаньне, як вызваленьне нашай жанчыны і ўзьняцьце яе культурнага ўзроўню. Гэта можна вырашыць пабудовай ясьляў, агульных кухняў, сталовых. Усё гэта будзе лепшым паказчыкам работы нашых калектываў. Гэта будзе ў далейшым тым фактарам, які будзе перабудоўваць вёску ў сацыялістычным напрамку.

ВЫПРАЦАВАЦЬ УНУТРАНЫ РАСПАРАДАК.

Прамова т. Мерхліна.

У нашых калектывах яшчэ да гэтага часу няма унутранага распарадку і кожны калектыў працуе па свайму. Належным органам трэба выпрацаваць унутраны распарадак аднолькавы для ўсіх калгасаў.

У справе будаўніцтве калгасаў пакуль няма плянавасьці. Бывалі выпадкі, што па 2—3 разы перабудоўвалі калгасы, таксама ня трэба даваць крэдыты на пабудову карлікавых гаспадарак.

ЗАКЛЮЧНАЕ СЛОВА тав. РАЧЫЦКАГА.

Арганізаваць шырокую сетку курсаў.

Пры тым руху калгаснага будаўніцтва, які мы маем зараз, пытаньне аб кадрах у нас займае вельмі вялікае месца і яно зьяўляецца неадкладнай задачай. Тая сетка навучальных устаноў, хаця яна і будзе значна пашырана, ня зможа поўнасьцю напоўніць склад кадраў з ніжэйшай і сярэдняй адукацыяй нават на працягу 2-х, 3-х год. На гэты бок мы павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Мы павінны прыняць рашучыя меры ў бок павялічэньня тэмпаў падрыхтоўкі кадраў—гэта адна справа, і другое—мы павінны пабудаваць шырокую сетку курсаў, якія змаглі-б падрыхтаваць саміх калгасьнікаў для практычнай працы ў калгасах: жывёлаводаў, тэхнікаў і г. д.

Нават у саміх райёнах і там трэба ўтварыць такія курсы, якія маглі-б даць хаця-б з ніжэйшай адукацыяй тых сельска-гаспадарчых спэцыялістых, якія нам патрэбны ў бліжэйшыя гады.

Другое пытаньне, якое заняло досыць вялікае месца ў спрэчках—гэта тэхнічная ўзброенасьць.

Нашыя патрэбы ў інвэнтару растуць больш шырока, чым мы зможам завесьці ў бліжэйшы год.

Скарыстаць поўнасьцю інвэнтар.

Пытаньне аб скарыстаньні таго інвэнтару, тых сродкаў вытворчасьці, якія маюцца зараз у індывідуальных сялянскіх гаспадарках, пытаньне вельмі вялікае, якое павінна быць пастаўлена ня толькі тут на сэсіі, а павінна быць пастаўлена зьверху да нізу, каб яго вырашыць у той плоскасьці, якая-б дазволіла нам скарыстаць як мага паўней і як мага лепей гэтыя сродкі, каб даць большую эфэктыўнасьць, якая нам патрэбна ў вышэйшых формах нашага сацыялістычнага земляробства.

У некаторых выпадках назіраюцца такія адзнакі з боку калгасаў, што наколькі мы ў нашым райёне альбо ў с.-с. калектывізаваны на ўсе 100 проц., трэба ставіць пытаньне аб тым, каб савгасы і прамысловыя прадпрыемствы ўжо перадаць калгасам. Трэба павесьці рашучую працу па растлумачэньні, што такая пастаноўка вельмі шкодна і не павінна мець месца ў нашай працы.

Я думаю, што тут ня прыдзецца вучыць сяброў ЦВК, якую ролю павінны адыграць савецкія гаспадаркі, гэта ўсім вядома. Таксама і вядома якую ролю адыгрывае прамысловасьць, якая знаходзіцца ў руках дзяржавы, які ўплыў яна мае на той самы калгасны рух, які мы маем сёньня па БССР.

Таму мне здаецца, што гэта трэба будзе растлумачыць, каб не паўтаралася. Нават адказныя работнікі, якія ехалі адсюль на правядзеньні дню ўраджаю і калектывізацыі ў сваіх справаздачных матар'ялах выказалі такую думку, што суседнія савгасы трэба перадаць калгасам, суседнія дзяржаўныя прамысловыя прадпрыемствы трэба таксама перадаць паколькі там ужо ўсё ператварылася ў калектыў. Гэта вельмі шкодна ў нашай сыстэме.

Тварам да калгасу.

Тут гаварылася аб неабходнасьці пераключыцца з боку ўсіх дзяржаўных устаноў на лепшае абслугоўваньне калгаснага руху.

Дзе, напрыклад, зьмяшчаецца Менскі акруговы калгасцэнтр—на задворках; у горшых умовах, чым любая саматужная арцель. У Мозыры калгасцэнтр зьмяшчаецца ў аднэй камнатушцы. Яшчэ такой увагі, якая павінна быць з боку ўсіх устаноў, таму растушчаму калгаснаму будаўніцтву, якое мы маем яшчэ няма і па мойму тут трэба будзе ў нашай пастанове запісаць цьвёрда, што хопіць ужо разгавораў, а трэба пераключыцца і сапраўды пачаць працу ў абслугоўваньні, таго калгаснага будаўніцтва, якое мы маем.

Палітасьвету на службу калектывізацыі.

Тут многія выступаючыя таварышы гаварылі аб тым, што трэба паблізіць палітасьветныя ўстановы, таксама больнічную справу і інш. бліжэй да калгасаў. У іх атрымоўваецца так, што трэба хату-чытальню з вёскі перанесьці ў калгас. На мойму вельмі дрэнная тая хата-чытальня, якая яшчэ не працавала над тым, каб у гэтай вёсцы арганізаваць калгас.

І трэба дамагацца таго, каб у той вёсцы, дзе ёсьць хата-чытальня таксама быў калгас, пераносіць хату-чытальню ад гэтай вёскі ня трэба, а трэба ў самім калгасе наладзіць гэту справу.

Іншая справа—гэта разьвіць новую сетку школьнага будаўніцтва, клюбнага, хат-чытален, бальніц, вэтэрынарную справу і прасоўваць гэта ў адпаведнасьці з тым тэмпам калгаснага будаўніцтва, які у нас маецца.

Рашуча ўзьняць жывёлагадоўлю.

Некаторыя выступаючыя ўчора таварышы завастралі ўвагу на жывёлагадоўлі.

На гэты 29-30 год мяркуецца закупіць буйнай рагатай жывёлы толькі для сацыялістычнага сэктару с.-гасп. і калгасаў 26 тыс. галоў з іх 7 тыс. для савгасаў, а астатнія 19 тыс. для калгасаў. Гэта складае 3 процанты ад усяго быдла, якое маецца ў БССР. 7 тыс. галоў для савгасаў даюць павялічэньне стада на 60 проц. у параўнаньні з тым, што маецца зараз.

Апрача таго, на лініі малочнай каапэрацыі таксама закупаюцца 4 тыс. галоў буйнай жывёлы. Наша задача ў гэтай галіне—той адход, які зараз маецца у некаторых раёнах у індывідуальных гаспадарках пераняць і накіраваць у сацыялістычны сэктар—гэта першае; і падругое—наогул папоўніць тое стада якое павінна быць у асаблівасьці у нашым сацыялістычным сэктары земляробства.

На справу жывёлагадоўлі ў гэтым годзе асыгнаваньні выражаюцца у суме 4 з пал. міл. р. Усё гэта галоўным чынам накіроўваецца ў наш сацыялістычны сэктар—у савгасы і калгасы.

Аднак гэтыя мерапрыемствы цалкам ня вычэрпваюць тых задач, якія стаяць перад намі ў галіне ўядыму жывёлагадоўлі, як у сэнсе колькасным, так і якасным. Тут калгасная сыстэма, гэтыя вышэйшыя формы земляробства, павінны адыгрываць вялікую ролю. Трэба шырока паставіць пытаньне ў саміх калгасах, каб гэтаму пытаньню надаць большае значэньне, чым надавалі да гэтага часу, каб ад гэтага мець такія вынікі, якія

Працоўныя СССР абураны правакацыйным нападам на наша консульства ў Львове.

Рашучы пратэст супроць цкаваньня прадстаўнікоў нашага консульства.

Дэманстрацыі пратэсту супроць праваканцыйнага нападу на савецкае консульства ў Львове.

ХАРКАЎ. Наглы наскок польскіх фашыстаў-фашыстаў на савецкае консульства ў Львове выклікаў хвалю абурэньня сярод працоўных Харкаву. Пралетарскае студэнцтва выйшла з работу на вуліцу дэманстраваць супроць абураючага ўчынку абнагелых польскіх фашыстаў. Да памяшканьня, дзе знаходзіцца польскае генэральнае консульства, рушыліся калёны дэманстрантаў на чале з прафэсарамі і выкладчыкамі. На-над шэрагамі дэманстрантаў узьвіваліся плякаты з надпісамі: «На замах польскіх хуліганаў адкажам балявой гатоўнасьцю», «пралетарскае студэнцтва гатова даць адпор польскім фашыстам», «суровае пакараньне контр-рэвалюцыянэрам», «ганьба клясавага ворага ва украінскай вёсцы, няхай жыве Ўсеукраінская акадэмія Навук—цытадэль украінскай пралетарскай культуры».

Дэманстранты арганізаваным парадам падыйшлі да вуліцы, дзе зьмяшчаецца польскае генэральнае консульства. Шэраг перад консульствам быў ачэплены конным і пешам міліцыяй. Дэманстранты наладзілі мітынг на якім выступалі прадстаўнікі студэнцтва і прафэсуры, якія ганьбілі абураючы акт польскіх фашыстаў і завяралі, што ў адказ на контр-рэвалюцыйную ў прыхвасьніў буржуазеі яны стануць больш энэргічна будуць працаваць над будаўніцтвам украінскай культуры. Дэманстранты некалькі разоў спрабаваліся прарваць варту міліцыі, у сувязі з чым давялося выклікаць дадатковы атрад, каб стрымаць націск абуранай масы студэнцтва. Парадак, аднак, ні разу ня быў парушаны.

Пасьля гэтага дэманстрацыя накіравалася да памяшканьня ДПУ, дзе пралетарскае студэнцтва прывітаў старшыня ДПУ УССР Баліцкі. «Рэшткі контр-рэвалюцыі,—сказаў Баліцкі,—спрабуюць наладзіць змову супроць рабочых і сялян. Іх надзея ня спраўдзіцца, бо нас падтрымліваюць усе працоўныя нашай краіны. Заяўляю вас, што з усімі, хто выступіць супроць улады рабочых і сялян, мы будзем няшчадна распраўляцца". Словы Баліцкага пакрываюцца бурнымі воплескамі і выгукамі «Няхай жыве ДПУ—верны вартаўнік рэвалюцыі».

Потым дэманстрацыя накіравалася да Ўсеукраінскага ЦВК, дзе дэманстрантаў вітаў Пятроўскі, які паведаміў, што ўрад атрымлівае зараз тысячы тэлеграм ад рабочых, сялян, навуковых працаўнікоў і працоўнай савецкай інтэлігенцыі з выказам свайго абурэньня супроць здраднікаў контр-рэвалюцыянэраў Яфрэмавых, Чахоўскіх і іншых. Ад імя рабоча-сялянскага ўраду Пятроўскі заверыў дэманстрантаў, што ўрад ужыве рашучыя захады, каб адбіць усякую спробу шкодзіць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Урад атрымаў таксама шмат тэлеграм пратэсту супроць налёту на савецкае консульства ў Львове. Пятроўскі заявіў дэманстрантам, што НК па Замежных Справах знойдзе адпаведныя меры, каб даць належны адказ на гэтыя ўчынкі.

Працоўныя Кіеву патрабуюць ад свайго ўраду рашучых мер.

КІЕЎ. Паведамленьне аб бандыцкім налёце на савецкае консульства ў Львове выклікала хвалю абурэньня сярод працоўных Кіеву. Адбылася шматлікая дэманстрацыя пратэсту студэнцтва і працоўнай інтэлігенцыі.

Незаможнікі Кіеўшчыны зьвярнуліся да саюзнага і украінскага ўраду з тэлеграмай, у якой, выказваючы глыбокае абурэньне бандыцкім налётам фашыстаў, просяць урад неадкладна зьвярнуцца да польскага ўраду з патрабаваньнем сурова пакараць бандытаў

Львоўскі напад сьцьвярджае сувязь банды Яфрэмава з польскай ахранкай.

ХАРКАЎ. Усе газэты прысьвячаюць артыкулы антысавецкай дэманстрацыі і наскоку на савецкае консульства ў Львове. Газэты выказваюць глыбокае абурэньне наглым выклікам савецкаму ўраду. Орган ЦК КП(б)У „Комуніст" у перадавіцы «На злодзеі шпака гарыць» піша: „Ні ў нашай прэсе, ні ў паведамленьні ДПУ УССР, не зважаючы на бясспрэчныя факты, якія мы маем, не названы тыя з нашых імпэрыялістычных суседзяў, на сродкі якіх і пры дапамозе якіх на працягу гадоў існавала змоўніцкае контр-рэвалюцыйнае павуцьцьне, арганізаванае ў так званы «саюз вызваленьня Украіны». Ці не зьвяляецца паведамленьне з Львову расшыфраваньнем гэтага прабелу ў паведамленьні ДПУ УССР».

Паўстанцкі рух сярод арабаў расьце і шырыцца.

Паўстанцкія атрады арабаў у Палестыне.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ, 23-XI. У Палестыне ня спыняюцца сутычкі паміж яўрэямі і арабамі. У паўночных раёнах Палестыны арабскія партызанскія атрады ўчыняюць сыстэматычныя наскокі на яўрэйскія калёніі. Поччу перад 14-м лістапада партызанскі атрад арабаў напаў на Сафэд. Здарылася сутычка з ангельскім гарнізонам, у выніку якой паранен адзін ангельскі салдат.

У Ерузалеме на вуліцы ўдзень забіт яўрэй-доктар. У Сірыі арыштавана некалькі чалавек з яўрэйскай самаабароны, якія прыехалі туды для закупкі зброі.

Усеагульная забастоўка ў абарону арыштаваных.

ЛЁНДАН, 24-XI. Учора ў Яфе і некаторых іншых гарадох Палестыны абвешчана ўсеагульная забастоўка пратэсту супроць арышту арабаў, абвінавачаных у „проціўрадавай агітацыі".

Пакараньне сьмерцю.

КАНСТАНТЫНОПАЛЬ. У Ерузалеме засуджана да кары сьмерцю два арабскіх селяніна за ўдзел у хваляваньнях у Хэрбоне.

Арышты і штрафы накладаюцца на арабаў.

ЛЁНДАН, 25-11. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе з Ерузалему: «У сувязі з пядаўнімі хваляваньнямі на 11 вёсак накладзены калектыўныя штрафы на агульную суму ў 11 тысяч фунтаў стэрлінгаў.

* * *

ЛЁНДАН, 25-XI. У Яфе арыштавана 9 арабаў, якія абвінавачаны ў падбухторваньні да непакояў. Сярод арыштаваных Гамід-Гусэйн, якога паліцыя лічыць „правадыром арабскіх камуністаў і прадстаўніком арабскіх краін у лізе барацьбы супроць імпэрыялізму".

Патрабуюць скасаваньня падаткаў.

ЛЁНДАН, 23-XI. Сялянскі зьезд у Яфе ўхваліў шэраг рэзалюцый, у якіх патрабуе скасаваньня ўрадавых падаткаў і прымусовай працы. Апроч таго, зьезд пратэстуе супроць дэклярацыі Бальфура. У рэзалюцыі зьезд клянецца не прадаваць сіяністам зямлі; тыя арабы, якія парушаць клятву, падлягаюць выключэньню з арабскай абшчыны. Ухвалены таксама пастановы аб барацьбе супроць ліхвяроў—буйных абшарнікаў

ЗАБІТЫ АКТЫЎНЫ СЕЛЬКОР.

24 лістапада ў Пухавіцкім раёне на Меншчыне **забіты актыўны селькор** *„Беларускай Вёскі"* **тав. Ляпіч С. М.**

Тав. Ляпіч, як член партыі, бядняк, вёў рашучае змаганьне з усімі тымі, хто шкодзіў сацыялістычнаму будаўніцтву. Ён выкрываў самагоншчыкаў, хуліганаў, змагаўся з непарадкамі на вёсцы.

На 41 годзе жыцьця яго забілі злачынцы. Варожыя элемэнты вырвалі з радоў яшчэ аднаго змагара-камуніста.

Посьпехі нашага сацыялістычнага будаўніцтва б'юць па клясавым ворагу, які ўсякімі спосабамі хоча стрымаць актыўнасьць працоўнага сялянства.

Клясавы вораг уздымае сваю руку супроць грамадзкіх працаўнікоў на вёсцы.

Клясавы вораг павінен быць уціхаміраны рэвалюцыйнай законнасьцю. *Мы патрабуем жорсткага пакараньня забойцаў.*

* * *

Для расьсьледваньня справы аб забойстве селькора Ляпіча выехала на месца спэцыяльная камісія раёну ў складзе: прадстаўніка райкому партыі, сьледчага і начальніка міліцыі.

Па гэтай-жа справе выехаў прадстаўнік рэдакцыі „Беларускай Вёскі".

Рэдакцыя „Беларускай Вёскі".

У Саюзе ССР.

ЛІСТ тав. КАМЕНЕВА Ў ЦК І ЦКК.

У сувязі з тым, што ў шырокіх колах партыі вядома, што ў часе мінулай барацьбы супроць партыі і яе ЦК маё імя было шчыльна зьвязана з імем т. Зіноўева, а зьмешчаная ў „Правде" яго заява можа даць магчымасьць да няправільнага тлумачэньня маёй пазіцыі, лічу патрэбным заявіць, што заява тав. Зіноўева была напісана намі супольна і што я цалкам і поўнасьцю салідарны з усім тым, што выказана ў гэтай заяве аб нашых памылках аб ленінскай лініі партыі і ЦК, аб абавязках кожнага сябра партыі безагаворачна падтрымліваць ЦК, не дапушчаючы падрыву аўтарытэту кіраўніцтва.

Дэманстрацыя сувязі фронту з тылам.

Пахаваньне гэрояў-байцоў, якія загінулі ў бойках з белакітайскімі бандамі.

УЛАДЫВАСТОК, 24-XI. 23-га лістапада Уладывасток хаваў 4-х байцоў, якія загінулі ў апошніх сутычках з бела-кітайцамі. Пахаваньне абярнулася ў вялізарную дэманстрацыю сувязі тылу з фронтам і гатоўнасьці ў кожны момант заняць месца загінуўшых. 50 тысяч чалавек вышла на вуліцу. Пад гудкі параходаў, фабрык і заводаў і салюты цэлы былі спушчаны ў магілу.

Зацьверджан адзіны сельска-гасп. падатак

МАСКВА. Пленум бюджэтнай камісіі ЦВК СССР зацьвердзіў адзіны сельска-гаспадарчы падатак у суме 375 мілёнаў рублёў з залікам авансавых выплат па гэтым падатку за жнівень-верасень у суме 40 мілёнаў рублёў.

Замежныя мэталёўцы знаёмяцца з жыцьцём мэталёўцаў СССР.

МАСКВА, 24-XI. Група рабочых-мэталёўцаў з нямецкай, францускай, амэрыканскай, ангельскай, латвійскай і эстонскай дэлегацый наведала ЦК саюзу мэталёўцаў, дзе адбылася гутарка са старшынёю ЦК саюзу тав. Швэрнікам.

Тав. Швэрнік даў дэлегатам вялікі лічбавы матар'ял наконт мэталёвай прамысловасьці і становішча рабочых-мэталёўцаў у СССР.

У канцы пасяджэньня ленінградзкая мэталёўка Ягорава перадала ад імя работніц «Красного Путиловца» чырвоны сьцяг нямецкай дэлегацыі мэталёўцаў для чырвоных франтавікоў гораду Ганавэру.

Нясумленныя адносіны да ўпакоўкі Амгандлю.

НІЖНІ НОЎГАРАД, 24-XI. Большая частка заграніччага абсталяваньня для аўта-зборных майстэрняў атрымана ад Форда ў кастрычніку. Упакоўка, якую рабіў Амгандаль, надзвычайна дрэнная, у той час, як упакоўка, зробленая працаўнікамі Форда бездакорна. Супрацоўнікі Аўтастану патрабуюць неадкладнага расьсьледаваньня гэтай нячуванай безгаспадарчасьці і суровага пакараньня вінаватых. Установка прысланага абсталяваньня пачнецца ў сьнежні. У гэты-ж дзень прыедуць з Амэрыкі спэцыялісты Аўтастану, якія навучаюцца зараз на фордаўскіх заводах.

Голас рабочых менскіх фабрык і заводаў

...чора ў часе абедзеных перапынкаў ...фабрыках і заводах адбыліся лятучкі мітынгі ў сувязі з выступленьнем польскага фашызму ў Львове.

...абочыя рашуча пратэстуюць супроць шалёнага ўчынку кучкі польскіх бандытаў і патрабуюць ад ураду ...яцьця рашучых мер да спыненьня падобных правакацый.

...ульны сход рабочых лаечнага цэху ...у „Бальшавік" заяўляе:

- Што ў любую хвіліну па закліку ...ага ўраду, як адзін, станем у абарону нашае краіны. Мы просім наш ...даць наш адказ, што зроблена ў ...мку забесьпячэньня нармальнага ...працы савецкіх прадстаўніцтваў ...льшчы. Рабочыя чырвонабуднага ...заводу „Бальшавік" у рэзалюцыі ...яюць:

- Усе, як адзін, дадзім рашучы адпор...зарваўшымся польскім фашызмам ...м тым агэнтам капіталу, якія імкнуцца падарваць наша мірнае сацыялістычнае будаўніцтва.

...абочыя складу сыравіны заводу ...льшавік» з усёй рашучасьцю клеймуюць пазорам палачоў фашыцкай Польшчы. Савецкі Саюз можа цярпець, але цярпеньне не бязьмежна.

...а першаму закліку нашага ўраду ...ем над вінтоўку для аховы запа...ластрычніка.

* * *

...абочыя заводу «Энэргія» заяўляюць: — Рашуча пратэстуем супроць ...вавай расправы з рабочымі, якія ...а дэманстравалі ў адзнаку 10-ці-годзьдзя КІМ'у і супроць праваканцыйных дзеяньняў польскага фашызму ў адносіне да савецкага пасольства ў Львове.

Гэтыя выступленьні сьведчаць аб тым, што міжнародны капітал рыхтуе напад на Савецкі Саюз.

Мы пільна сочым за дзеяньнямі капіталістых і заўсёды дамо адпаведны адпор.

Няхай жыве рэвалюцыйны пралетарыят Польшчы.

* * *

Мы рабочыя пабудоў Учвэрсытэцкага Гарадка і Дому Ураду ў ліку 1500 чалавек патрабуем ад свайго ўраду прыняць рашучыя захады каб спыніць усе праваканцыйныя выбрыкі з боку польскіх фашыстаў.

Мы запэўніваем свой урад, што па першаму закліку зьмецім молатам на вінтоўку, і ...ўсім, хто будзе парушаць нашае мірнае сацыялістычнае будаўніцтва

Мы запэўнім свой урад, што выканаем націгадовы плян у больш кароткі тэрмін. З гэтай мэтай падпісваемся дадатковым на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

* * *

Аналёгічныя рэзалюцыі пратэсту прынятыя рабочымі майстэрняў МБВ, рабочымі завода рамонту вагонаў ст. Менск, заводу «Дрэваапрацоўшчык» і інш.

Працаўнікі БАН пратэстуюць.

Агульны сход працаўнікоў БАН выказвае свой рашучы пратэст супроць новага праваканцыйнага ўчынку фашыстых, які зьяўляецца ні чым іншым, як яскравым выразам авантурыстычнай палітыкі ўраду Пілсудзкага і спробай падрыхтоўкі ўзброенага нападу польскага фашызму на Савецкі Саюз з мэтай сарваць мірную працу па пасьпяховаму сацыялістычнаму будаўніцтву.

Напад на савецкае консульства ў Львове сход разглядае як вынік сыстэматычнага цкаваньня дыпляматычных савецкіх прадстаўніцтваў з боку ўрадовай польскай прэсы і падтрыманьня ўрадам Пілсудзкага белагвардзейскіх і нацыянал-фашысцкіх польска-украінскіх арганізацый

Сход патрабуе ад савецкага ўраду ўжыць тэрмінова перад урадам фашыстаўскай Польшчы ўсе захады па ахове інтарэсаў пралетарскай дзяржавы.

Сход заклікае ўсіх працаўнікоў узмацніць працу па сацыялістычнаму будаўніцтву, як самаму найлепшаму і вернаму сродку, які гарантуе ад усялякіх нападаў і праваканцый, а таксама заклікае моцна стаяць на варце.

Далоў фашыстых і іх украінскіх наймітаў!

Рукі прэч ад Савецкага Саюзу!

„СПАКОЙ" У ЛЯГЕРЫ КІТАЙСКАЙ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ.

Чуткі аб спыненьні генэральскай бойкі

ШАНХАЙ, 25-11. Паведамляюць, нібыта вайна ў правінцыі Хубэй між войскам Чан-Кай-Шы і Фынь-Юй-Сяна фактычна ўжо спынілася. Застаецца незразумелым, як здарылася такі раптоўны пераварот у становішчы якраз зараз, калі становішча Нанкіну было самым крытычным.

Увогуле становішча зьяўляецца вельмі туманным і нявыразным.

Пляны атамана Сямёнава.

ПЭЙПІН, 25-11. Згодна паведамленьня «Норд Чайна Дэйлі Мэйль», атаман Сямёнаў тайна пражывае ў Цянцьзіне, у сувязі з чым распаўсюдзіліся чуткі аб сакрэтных яго плянах, зьвязаных, магчыма, з арганізацыяй выступленьняў ва ўнутранай Манголіі.

Чан-Кай-Шы ўцёк з фронту.

ПЭЙПІН 28-XI. Водлуг паведамленьняў з Шанхаю, Чан-Кай-Шы сьпешна вярнуўся ў Нанкін у сувязі з пагоршаньнем становішча нанкінскага войска на фронце ў правінцыі Хубэй Гуандунь і Гуансі.

Войска Чан-Фа-Гуя, захапіўшы Учжоу, шыбта пагражае ўжо непасрэдна Кантону.

Арганізацыя белагвардзейскіх банд.

ТОКІЁ, 23-XI. Агэнцтва Дэмпо Цусін паведамляе з Харбіну, што цыцыкарскі генэрал-губэрнатар Чжан-Фу-Лін распачаў фармаваньне спэцыяльных белагвардзейскіх адзінак.

Сьмерць Жоржа Клемансо.

ПАРЫЖ. Памёр Жорж Клемансо—адзін з выдатнейшых змагароў францускага імпэрыялізму. Клемансо нарадзіўся ў 1841 годзе, на палітычнай арэне зьявіўся ў 1870 годзе ў якасьці мэра Манмарта (Парыж). У 1876 годзе Клемансо ўпяршыню абіраецца ў парлямант, дзе становіцца на чале радыкальнай левай партыі. Вострыя нападкі яго ворагаў замацоўваюць за ім мянушку тыгра. Наступова Клемансо пераходзіць у лягер крайніх правых. У часе вайны 1914—18 г. Клемансо праводзіць вострую кампанію супроць уступчывасьці у адносінах да Нямеччыны, супроць Мальві, Кайё і іншых прыхільнікаў заключэньня міру. У 1917 годзе Клемансо становіцца прэм'ерам, прадаўжаючы палітыку вайны да пераможнага канца і палітыку суровай рэакцыі унутры краіны. У якасьці старшыні вярхоўнай рады ён разам з Лёйд Джорджам і Вільсонам зьяўляецца тварцом Вэрсальскага дагавору. У 1920 годзе Клемансо выходзіць у адстаўку.

Актыў парыскай арганізацыі кампартыі—за лінію партыі.

ПАРЫЖ 24-XI. Адбыўся сход актыву парыскай арганізацыі кампартыі ...ім ...удзел 1200 чалавек. Сход ...ваў рэзалюцыю, у якой адна ...шна салідарызаваўся з лініяй партыі і адобрыў усе мерапрыёмствы партыі ў адносінах да апартуністаў і ліквідатараў, у прыватнасьці ў адносінах да 6-ці муніцыпальных дарадчыкаў.

Барацьба замежнага пралетарыяту.

Патрабуюць павялічэньня заработку.

ВАРШАВА, 25-XI. Распачаўся шырокі рабочы рух за павялічэньне заработку сярод польскіх дзяржаўных служачых. Заработак дзяржаўных служачых у Польшчы вельмі малы, прычым ніводзін урад ніколі яго не павялічваў. Трэба мець на ўвазе, што ў лік дзяржаўных служачых у Польшчы ўваходзяць таксама чыгуначнікі.

У нядзелю ў Варшаве, Кракаве і Лодзі адбыліся масавыя мітынгі дзяржаўных служачых.

Паход францускай буржуазеі супроць „Юманітэ".

ПАРЫЖ, 24-XI. У сувязі з непасрэднай пагрозай існаваньня «Юманітэ» кампанія на збору сродкаў на не карысьць за апошнія дні значна пашырылася. Кампанія набыла характар шырокага руху на абарону кампартыі і адначасна рашучага адпору апартуністам і рэнэгатам.

За ўчарашні дзень у рэдакцыі „Юманітэ" перабывалі сотні рабочых, якія прыносілі ўзносы. Разам з прысланымі ў гэты дзень узносамі з розных канцоў Францыі і заграніцы сума збору дасягнула 20 тысяч франкаў. Да гэтага часу ўзносы складалі 5-7 тысяч франкаў за дзень.

Забарона камуністычнай дэманстрацыі.

БЭРЛІН, 24-XI. Мюнхенская паліцыя забараніла камуністычныя дэманстрацыі і працэсіі, назначаныя ў парадку выбарчай прапаганды. Забарона абгрунтоўваецца тым, што ў кампаніі ўдзельнічае „саюз абароны супроць фашызму", які па думку паліцыі заняў месца забароненага саюзу чырвоных франтавікоў.

Стаўка апартуністаў на моладзь была і будзе пабіта.

„Камсамол павінен памятаць, што забесьпячэньне кіраўніцтва партыі ёсьць самае галоўнае і самае важнае ва ўсёй працы комсамолу".

СТАЛІН.

...выступленьні розных унутрыпартыйных груп і плыняў супроць ленінскай ...партыі заўсёды адбываліся разам ...спробамі супроцьставіць моладзь ...ўнаму бальшавіцкаму касьцяку партыі. Правыя ўхілісты, праводзячы барацьбу супроць ленінскай лініі партыі і дзяржавы, ...дзяржаўнасьці, заўсёды ...моладзь. Рабочыя складу сыравіны заводу «Бальшавік» з усёй рашучасьцю клеймуюць пазорам палачоў фашыцкай Польшчы. Савецкі Саюз можа цярпець, але цярпеньне не бязьмежна.

...а першаму закліку нашага ўраду ...ем над вінтоўку для аховы запа...ластрычніка.

* * *

...абочыя заводу «Энэргія» заяўляюць: — Рашуча пратэстуем супроць ...вавай расправы з рабочымі, якія ...а дэманстравалі ў адзнаку 10-ці-годзьдзя КІМ'у і супроць праваканцыйных дзеяньняў польскага фашызму ў адносіне да савецкага пасольства ў Львове.

Гэтыя выступленьні сьведчаць аб тым, што міжнародны капітал рыхтуе напад на Савецкі Саюз.

Мы пільна сочым за дзеяньнямі капіталістых і заўсёды дамо адпаведны адпор.

Няхай жыве рэвалюцыйны пралетарыят Польшчы.

* * *

Мы рабочыя пабудоў Учвэрсытэцкага Гарадка і Дому Ураду ў ліку 1500 чалавек патрабуем ад свайго ўраду прыняць рашучыя захады каб спыніць усе праваканцыйныя выбрыкі з боку польскіх фашыстаў.

Мы запэўніваем свой урад, што па першаму закліку зьмецім молатам на вінтоўку, і ...ўсім, хто будзе парушаць нашае мірнае сацыялістычнае будаўніцтва

Мы запэўнім свой урад, што выканаем націгадовы плян у больш кароткі тэрмін. З гэтай мэтай падпісваемся дадатковым на 3-ю пазыку індустрыялізацыі.

* * *

Аналёгічныя рэзалюцыі пратэсту прынятыя рабочымі майстэрняў МБВ, рабочымі завода рамонту вагонаў ст. Менск, заводу «Дрэваапрацоўшчык» і інш.

...адсюль зразумела, што супроцьстаўленьне комсамолу асноўнай кіруючай сілы пралетарыяту — партыі — можа быць толькі ў інтарэсах варожых нам сіл. Таму забесьпячэньне пэўнага партыйнага кіраўніцтва зьяўляюцца яскравымі прыкладамі, дзе пад прыкрыцьцем рэзалюцый аб згодзе з генэральнай лініяй партыі хаваецца права-апартуністычная практыка. „Барацьба з правым ухілам за правільную генэральную лінію заключаецца ў тым, каб выявіць апартунізм на практыцы, біць па яго сьвежых сьлядох на практычнай працы, ня спыняючы ўпартай і рашучай барацьбы ў галіне ідэалёгіі. У гэтым сваеасабістасьць сучаснай барацьбы з правым ухілам (Баўман).

Камсамол загартоўваецца на практычнай барацьбе з анты-ленінскімі ўхіламі.

Таму патрэбны чулыя адносіны да нашай штодзённай практыкі з боку камсамольскіх арганізацый, і, апроч таго, патрэбна рашуча ў час выступіць супроць скажэньняў генэральнай лініі партыі ў практычнай рабоце. Нельга рабіць так, як наступілі камсамольцы ячэйкі Дзяржбанку ў Маскве. Перад намі разгортвалася карціна сямейнасьці, супольнай парукі, праваапартуністычных спраў; замест таго, каб бароцца, яны доўгі час маўчалі.

Кожная барацьба патрабуе ініцыятывы. Камсамолам у інтарэсах больш пасьпяховага правядзеньня лініі партыі было высунута пытаньне аб сацыялістычным спаборніцтве. І вось правыя (Мацьвеяў) імкнуцца ўхіліцца за гэты факт, выкарыстаць яго ў сваіх інтарэсах супроць партыі. Лагодна адносячы да моладзі, яны заяўляюць, што вы мо' зьяўляецеся застрэльшчыкамі гэткага буйнага мерапрыёмства, а вось старыя кадры трацяць нюх". Але ёсьць ініцыятыва і „ініцыятыва". Пачын камсамолу—сацыялістычнае спаборніцтва,—падтрыманы партыяй і рабочае клясай, цалкам і поўнасьцю дапамагае больш пасьпяховаму правядзеньню генэральнай лініі партыі. Партыя вітае і арганізуе ініцыятыву мас, у тым ліку і моладзі, якая накіравана да больш пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва краіны. Але ёсьць і іншая ініцыятыва, якія выходзіць ад правых і „левых", накіраваная супроць генэральнай лініі партыі. З гэтай ініцыятывай правых і „левых" ухілістаў камсамол пад кіраўніцтвам партыі змагаўся і надалей будзе змагацца.

Камсамол быў, ёсьць і застанецца нязьменным Ленінскай партыі і ніякія спробы правых і „левых" ня выб'юць яго з ленінскага шляху.

А Гораў.

У Сакратарыяце Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

21-ГА ЛІСТАПАДА Г. Г. АДБЫЛОСЯ ПАСЯДЖЭНЬНЕ САКРЭТАРЫЯТУ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР, НА ЯКІМ РАЗАМ З ІНШЫМІ РАЗГЛЯДЖАНЫ НАСТУПНЫЯ ПЫТАНЬНІ:

Гучна-гаварыцель—у лепшым калгасе Мазыршчыны.

Сакратарыят ЦВК пастанавіў устанавіць у лепшым калгасе Мазыршчыны гучнагаварыцель за кошт ЦВК.

Мазырскаму АВК даручана зрабіць адпаведнае прадстаўленьне Прэзыдыуму ЦВК

Скасаваньне пастановы Талочынскага РВК аб кааптацыі.

Сакратарыят ЦВК адхіліў хадайнічаньне Прэзыдыуму Аршанскага АВК аб зацьверджаньні пастановы Пленуму Талочынскага РВК пра кааптацыю т. Дамброўскага ў склад членаў Талочынскага РВК.

Прэзыдыуму Аршанскага АВК даручана канчаткова вырашыць пытаньне аб магчымасьці дапушчэньня тав. Дамброўскага да часовага выкананьня абавязкаў Старшыні Талочынскага РВК да чарговага Зьезду Саветаў.

Пра хадайнічаньне аб узнагародах.

Сакратарыят ЦВК пастанавіў адкласьці часова разгляд паступіўшых хадайнічаньняў аб узнагародах за выдатныя баявыя ўчынкі ў першыя гады стварэньня БССР.

Вырашэньне гэтых хадайнічаньняў будзе прыстасавана да дзесяцігодзьдзя вызваленьня БССР ад белапалякаў.

Аб вызначэньні пэнсіі гр-цы Сакалоўскай Ю. І.

Сакратарыят ЦВК, прымаючы пад увагу асаблівыя акалічнасьці па хадайнічаньні гр-кі гор. Воршы Сакалоўскай Юзэфы пра вызначэньне пэнсіі, даручыў Галоўсацстраху разглядзець гэтае хадайнічаньне па сутнасьці, ня гледзячы на пропуск тэрміну.

Пра узаемаадносіны паміж акруговымі падатковымі камісіямі і акрфінаддзеламі.

Згодна пастановы ЦВК і СНК СССР за 23-X—1929 г., „пра органы, якія робяць абкладаньне падаткамі прамысловым, падаходным і на звыш прыбытак" больш дакладна вызначаны функцыі акруговых падатковых камісій іх узаемаадносіны з акрфінаддзеламі.

Сакратарыят ЦВК БССР, у адпаведнасьці з гэтай пастановай, даручыў а) аргаддзелу Прэзыдыуму ЦВК унесьці адпаведныя папраўкі ў праэкт Палажэньня аб АВК (акрфінаддзелы) і б) СНК распрацаваць праэкты адпаведных зьмен у законадаўстве БССР і падаць на зацьверджаньне Прэзыдыуму ЦВК

Пра фонды кінофікацыі.

Сакратарыят ЦВК пастанавіў арганізаваць рэспубліканскі, акруговыя і гарадзкія фонды кінофікацыі, у адпаведнасьці з пастановай ЦВК і СНК Саюзу ССР „пра фонды кінофікацыі".

СНК БССР даручана распрацаваць парадак складаньня гэтых фондаў.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

На фронце ліквідацыі няпісьменнасьці.

Недахват падручнікаў і пісьмовых прылад затрымоўвае разгортваньне працы па ліквідацыі няпісьменнасьці. Некаторыя т-вы „П. Н.“ бязьдзейнічаюць.

Ліквідацыя няпісьменнасьці на Полаччыне пад пагрозай зрыву

Па пляну Полацкая акруга павінна ў бягучым навучальным годзе ліквідаваць няпісьменнасьць сярод 26.000 асоб. Дырэктывы своечасова пасланы на месца.

Паглядзім, як выконваюцца гэтыя дырэктывы.

Працаўнік акрінспэктарыяту Нарасьветы правёў абсьледваньне працы ў Дрысенскім раёне па пытаньню падрыхтоўкі да ліквідацыі няпісьменнасьці.

Па раёну ёсьць няпісьменных ад 12 да 16 год 130 асоб, ад 16 да 35 год 1068 асоб, усяго 1209 няпісьменных. Сталага вучоту няпісьменных няма. Гадавы плян адсутнічае. Намечана адчыніць 65 ліквпунктаў. Падрыхтоўка да адчыненьня ліквпунктаў амаль не праведзена. Лемантары і кніжкі ляжаць у райсавеце.

Райпалітінспэктар зусім ня цікавіцца сваёй працай. Плян па ліквідацыі няпісьменнасьці зрываецца.

Па астатніх раёнах Полаччыны справа з падрыхтоўкай абстаіць дрэнна. Напрыклад, у Вульскім райсавеце амаль нічога ня зроблена у гэтай галіне.

Расонскі раён таксама не ўзварухнуўся. Па большасьці раённыя курсы ліквідатараў не праведзены. Кадры працаўнікоў не падрыхтаваны.

Цяпер возьмем Ветрынскі раён. Тут справа ня лепш. Напрыклад, у Руднянскім сельсавеце ў мінулым годзе было адчынена шэраг ліквпунктаў. У гэтым годзе мы бачым зусім іншае. Мясцовыя настаўнікі пакуль што чакаюць дырэктыў „з вышэйшых органаў“.

Прафсаюзы ў горадзе, за выключэньнем камунальнікаў, скурнікаў і краўцоў, зусім слаба разгарнулі працу да адчыненьня ліквпунктаў і школ для малапісьменных. Будаўнікі сьпяць. Чыгуначнікі лічуць сябе „аўтаномнымі“. Пэдтэхнікум і Лестэхнікум яшчэ не праявілі ініцыятывы ў гэтай працы.

Гарадзкія школы, за выключэньнем 7-й польскай школы, ня выконваюць дагавароў па сацспаборніцтву ў галіне ліквідацыі няпісьменнасьці. Сваёй пасыўнасьцю адзначаюцца дзевятая і дзесятая школы.

Акрпалітінспэктара тав. Маўшовіча некаторыя арганізацыі скарыстоўваюць на іншай працы, што адбіваецца на яго непасрэдным кіраўніцтве ліквідацыі няпісьменнасьці па акрузе.

Раённыя арганізацыі яшчэ не зьвярнулі належнай увагі на ліквідацыю няпісьменнасьці ў калгасах і інш. сельгасаб'яднаньнях.

Патрэбен рашучы пералом, бо ліквідацыі няпісьменнасьці пагражае зрыў.

С. М.

Т-ва „П. Н.“ слаба працуе.

(Гомельшчына).

Па Веткаўскаму раёну ў гэтым навучальным годзе трэба абхапіць ліквпунктамі 3856 няпісьменных і 949 малапісьменных. Бюджэтныя асигнаваньні на гэтую справу ў параўнаньні з мінулым годам павялічаны на 400 проц.

Падрыхтоўка да правядзеньня гэтай працы была распачата своечасова. Па раёну сельскім саветам праведзены канфэрэнцыі няпісьменнага і малапісьменнага насельніцтва.

Для правядзеньня арганізацыйнай працы пры с. с. вылучаны камісіі садзейнічаньня, якія займаліся разгортваньнем сеткі, арганізацыяй няпісьменнага насельніцтва, задавальненьнем падручнікамі і дапаможнікамі школ.

З падрыхтоўкай кадраў ў раёне справа кульгае, асобных ліквідатараў няма. Працуюць у ліквпунктах выключна настаўнікі. Мала прыцягнуты ў грамадзкім парадку да працы ў ліквпунктах грамадзкія і прафэсыйныя арганізацыі.

Дзякуючы гэтаму мы ня бачым актыўнага ўдзелу ў ліквідацыі няпісьменнасьці нават такіх арганізацый, як камсамол і т-ва „П. Н.“.

Трэба наладзіць сыстэматычнае кіраўніцтва з боку раённага савету пазавымі ячэйкамі. Зрабіць т-ва «П. Н.» штабам паходу „за грам ту“.

Своечасова і ў дастатковай ступені зьвернута ўвага на абслугоўваньне калгасьнікаў, савгасьнікаў і батракоў ліквпунктамі. Саюз Рабземлес на мясцох таксама займаўся пытаньнем ліквідацыі няпісьменнасьці.

В. М.

Заняткі распачаты своечасова.

(Ляднянскі р., Аршаншчына).

Па мястэчку Лядах і вёсках зараз навучаецца на ліквпунктах 1200 чалавек.

Райвыканком сёлета аддае асаблівую ўвагу гэтай працы.

У мінулым годзе была ліквідавана няпісьменнасьць па мястэчку сярод 67 асоб. У гэтым годзе мяркуецца навучыць грамаце ў тры разы больш. Яшчэ з кастрычніка месяца 98 асоб няпісьменных пачалі займацца пры Ляднянскай 7-годцы.

Вучні старэйшага канцэнтру Ляднянскае 7-годкі ў ліку 35 чалавек будуць ліквідаваць няпісьменнасьць сярод насельніцтва мястэчка, якія па якой-небудзь прычыне ня могуць наведваць ліквпункты.

8 ліквпунктаў працуе ў камунах і калгасах.

Процант вясковых ліквпунктаў не адстае ад мястэчка.

Усе вясковыя ліквпункты пачалі працаваць з 1 лістапада.

Для жывога кіраўніцтва ліквпунктамі ўсяго райёну арганізаваны габінэт па ліквідацыі няпісьменнасьці, які забясьпечвае матар'яламі і прыладамі, а таксама мэтадычнымі ўказаньнямі.

Я. Кручкоў.

Не парушаць пляны ліквідацыі няпісьменнасьці.

Навучальны год у ліквпунктых ужо даўно пачаўся, згодна пляну і бюракрытычных даведак. Аднак лічбы і факты паўторна сьведчаць аб тым, што ёсьць пагроза невыкананьня заданьняў аб поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці сярод членаў саюзу.

* * *

Брыгада ЦСПСБ правяла абследваньне становішча ліквбезу па некаторых буйных рабочых калектывах.

Вось, што яны п ведамляюць:

— На ф-цы „Дзьвіна“ з 280 няпісьменных ахоплена ліквпунктамі толькі 90 чал. Наведваньне заняткаў вельмі кепскае і дасягае 25 проц. слухачоў.

— Фабком імя „К. Цэткін“ нават яшчэ не пачынаў працу па ліквбезу і ніякіх вестак наогул ня мае.

— Некаторыя Акр. аддзяленьня саюзу Швэйнікаў яшчэ дагэтуль не заключылі дагаворы аб ліквідацыі няпісьменнасьці і заняткі зрываюцца.

— На фабрыках „Дняпро“ і „Х Кастрычнік“ наведваюць ліквпункты 50 проц. няпісьменных.

— На абутковай ф-цы (Менск) арганізавана школа пры партячэйцы і 2 індывідуальныя групы, якія аднак не наладзілі працу належным чынам.

— Зусім дрэнна наведваюць ліквпункты няпісьменныя па саюзу сувязі. Школамі фактычна ахоплены 10 чалавек.

* * *

Пытаньне стаіць асабліва востра з кадрамі ліквідатараў. Большасьць настаўнікаў ліквпунктаў ня мае належнай падрыхтоўкі.

На пабудове Нова-Беліцкага маста настаўнікам ліквпункту зьяўляецца былы дзяк. Заняткі праводзіць вельмі дрэнна і бясспрэчна ў „клясава-вытрыманым“ духу.

На конскім заводзе няпісьменныя на пунктах адразу вывучаюць па геаграфіі.

Яшчэ горш з лікняпісьменнасьцю ў райёнах. Так у Аршанскай акрузе працуюць толькі 6 ліквпунктаў. На фабрыцы „Чырвоная Бярэзіна“ зрываецца ліквідацыя няпісьменнасьці.

Зусім кепска праходзіць арганізацыя ліквпунктаў сярод батрацтва і рабочых савгасаў. Камсамольскія ячэйкі амаль ніякага ўдзелу ў працы па ліквбезу ня прымаюць. Трэба адзначыць нядбайнасьць да гэтага пытаньня з боку некаторых ЦП саюзаў, якія не зварочваюць належную ўвагу на налажваньне працы ліквпунктаў. Культадзелу ЦСПСБ трэба прыняць належныя меры да зьнішчэньня недахопаў у справе ліквідацыі няпісьменнасьці.

Ліквідуем няпісьменнасьць

Студэнцтва Рагачэўскага Белпэдтэхнікуму разгарнула вялікую працу па ліквідацыі няпісьменнасьці як сярод сялян прымежных да гораду Рагачэву вёсак, так і сярод насельніцтва гораду. Ячэйка „П. Н.“ для гэтага вылучыла асобных таварышоў з старэйшых курсаў, якія штотыдніёва вядуць заняткі з няпісьменнымі.

Усяго ахоплена гурткамі ліквідацыі няпісьменнасьці больш ста чалавек. Асаблівую цягу да вучобы выявіла сялянства, якое ўсьвядоміла карысьць ад гэтага.

Студкор Клімовіч Янка.

Ліквідуем няпісьменнасьць 27000 чалавек.

(Мазыршчына).

Густая сетка ліквпунктаў разьлічана на шырокія колы вясковага насельніцтва. Адчынена 21 нацыянальных ліквпунктаў і 27 выключна для жанчын. У ліквпунктах навучаецца 27000 чалавек дапрызыўнікаў, калгасьнікаў, членаў прафсаюзаў і бядняцка-серадняцкая моладзь. Па каштарысу АВК вызначана 137000 рублёў на ліквідацыю няпісьменнасьці. Ліквпункты своечасова забясьпечаны падручнікамі і пісьмовымі прыладамі на тры месяцы, за выключэньнем Нараўлянскага райёну.

Акрвыканкомам адзначана шэраг недахопаў па ліквідацыі няпісьменнасьці. На ліквпунктах навучаецца заможная і кулацкая моладзь (вёска Хлупін, Тураўскага райёну), у той час, калі не ахоплена поўнасьцю бядняцкая моладзь.

Слаба пастаўлена на ліквпунктах мэтадычная праца і апорныя пункты не паляпшаюць яе.

Не разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва па ліквідацыі няпісьменнасьці і паліт.-асьветпраца не прыстасавана да ліквпунктаў. Не мабілізавана савецкая грамадзкасьць вакол ліквідацыі няпісьменнасьці.

М. З.

Хто вінават?

(Халопеніцкі раён, Меншчына)

Справа з пачаткам навучальнага году на ліквпунктах абстаіць нездавальняюча, ёсьць нават пагроза зрыву навучальнага году.

У пачатку верасьня месяца на раённай настаўніцкай канфэрэнцыі была прынята пастанова, каб заняткі на ліквпунктах распачаць з 1-га кастрычніка. Аднак, чамусьці, крыху пазьней райінспэктар Нарасьветы на ўсіх школах раёну разаслаў паведамленьне, каб працу на ліквпунктах распачаць ужо ня першага кастрычніка, а 15-га кастрычніка.

Але гэта яшчэ нічога. Важна тое, што ня гледзячы на пастанову канфэрэнцыі праца на ліквпунктах да апошняга часу яшчэ не распачата, бо няма кніжак, сшыткаў і алоўкаў.

Ня лепш таксама справа абстаіць і ў школах. Заняты хоць амаль-што ва ўсіх школах распачаты 15-га верасьня, але да гэтага часу ні адна школа яшчэ не атрымала поўнасьцю выпісаных ёю падручнікаў і дапаможнікаў.

Цяпер застаецца сказаць толькі адно: што ўся ініцыятыва, энтузыязм настаўніцтва па ажыцьцяўленьні вялікіх задач ускладзеных на настаўніцтва Савецкай уладай і Камуністычнай партыяй нядбайнымі адносінамі бюракратаў з органаў Наркамасьветы прыдушваецца.

Праежджы.

Распачалі працу не падумаўшы.

(Плешчаніцкі раён, Меншчына).

Шырокім тэмпам разгарнулася кампанія па ліквідацыі няпісьменнасьці сярод дарослых. Актыў пісьменнай моладзі, а ў першую чаргу камсамол, адгукнуліся стаць у шэрагі ліквідатараў.

Каля двух тыдняў іх падрыхтоўвалі да гэтае працы. Бадзёрыя, з поўнай энэргіяй і надзеяй на посьпех у сваёй працы прыгатавалася выступіць на барацьбу з цемрай. Засталося толькі зайсьці да палітінспэктара за падручнікамі і іншымі прыладамі.

— Вот вам па 6 лемантароў, з якімі зара-жа і распачаць заняткі,—з такімі словамі інспэктар палітасьветы выправіў маладых ліквідатараў няпісьменнасьці. Ні сшыткаў, ні сродкаў на газу, ні лямпы ня даў. Праўда, абяцаў, што на днях задаволіць усім неабходным.

З першых дзён бадзёры настрой ліквідатараў пачаў апушчацца: 6 кніг на 30 чалавек!

— Даён кніжку, лямпу,—крычэць адусюль няпісьменныя, як мужчыны, так і жанчыны.

Малады ліквідатар у роспачы. Хто вінаваты, трэба пашукаць.

Ліквідатар.

Няма падручнікаў.

(Лагойскі раён, Меншчына).

Праца па ліквідацыі няпісьменнасьці па раёну распачата з 1-IX. За гэты час пытаньне абгаворана на пастаўніцкай канфэрэнцыі, сярод членаў саюзаў і ў некаторых вёсках. Грамадзкасьць узварухнута, але практычная праца вядзецца дрэнна.

Ліквідаваць няпісьменнасьць па раёну неабходна сярод 2610 чал., сярод 1300 чал. узяло на сябе абавязкі настаўніцтва.

Па Лагойскаму і Слабодзкаму с.-с. вызначана ліквідаваць няпісьменнасьць сярод насельніцтва на 100 процантаў. Справа па Лагойскаму савету наладжана добра, усе асьветнікі і актыў уцягнуты ў гэту працу.

Зусім іншае у Слабацкім с.-савеце. Там падрыхтоўкі няма. Асьветнікі глядзяць на гэту працу як на нешта такое, што іх не датычыцца, а настаўнікі Слабодзкай школы зусім адмовіліся працаваць па ліквпункце ў в. Зьварычы.

Дрэнна справа з ліквідацыяй няпісьменнасьці сярод лесарубаў, праца па лесараспрацоўках не распачата і ня вывучана дзе прыдзецца адчыніць ліквпункты.

Галоўным тормазам у адчыненьні ліквпунктаў служыць адсутнась падручнікаў і нават прылад, дзякуючы чаму тармозіцца адчыненьне заняткаў на ліквпунктах.

Для падрыхтоўкі ліквідатараў былі створаны кароткатэрміновыя курсы якія далі 18 ліквідатараў, прыцягнуты некаторыя сябры саюзаў і комсамольцы, але пры масавай ліквіданьі няпісьменнасьці іх усё-такі недастаткова.

К.

Дайце падручнікі.

Настаўніцтва Уваравіцкага раёну па прыкладу іншых акруг Беларусі. заключыла дагавор па соцспаборніцтву з іншымі раёнамі Гомельшчыны. У дагаворы ёсьць пункт аб удзеле ўсіх асьветнікаў у ліквідацыі няпісьменнасьці. Праца ўжо распачата на ліквпунктах, але для сталага вядзеньня яе ёсьць перашкода.

Першае і самае галоўнае—гэта тое, што няма ў дастатковай колькасьці лемантароў і пісьмовых прыладаў. Становіцца досыць дзіўна, калі атрымліваеш ад РВК на ліквпункт 2 алоўкі, 2 сшыткі на 3-х вучняў, адзін лемантар на 2-3 вучні і г. д. Такія недарэчнасьці неабходна ў хуткім часе зьнішчыць, бо можа сарвацца гадавы плян па ліквідацыі няпісьменнасьці.

Л.

Праверым выкананьне дагавароў па сацспаборніцтву.

Агонь пралетарскай самакрытыкі па бюракратах, якія зрываюць сацыялістычнае спаборніцтва. Шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы.

Бяз вучоту і кіраўніцтва.

(Менская акруга).

Сацыялістычнае спаборніцтва ў вёсцы паміж населішчамі, сельсаветамі, раёнамі, калгасамі, савгасамі і грамадзкімі арганізацыямі ў галоўнейшых галінах гаспадарчай і культурнай работы ў большасьці раёнаў Менскай акругі праходзіць самацёкам, без належнага кіраўніцтва, вучоту і рэагаваньня на недахопы з боку партыйных і савецкіх арганізацый.

У тых раёнах, дзе з самага пачатку разгортваньня спаборніцтва была надана належная ўвага гэтай рабоце партыйнымі, савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі, як мэтаду скарыстаньня ініцыятывы працоўных мас у сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі,—маюцца значныя вынікі гэтай работы. Пасьпяшаецца работа па вытворчаму каапэраваньню бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, уздымаецца на вышэйшую ступень работа ў калгасах і савгасах, палепшаецца работа каапэрацыйных т-ваў, добра праведзена асеньняя пасеўкампанія і г. д.

Усе гэтыя галіны работы праходзяць павольным тэмпам, бяз усякіх прыкмет спаборніцтва там, дзе падышлі кіруючыя раённыя арганізацыі да гэтай справы па-казённаму, хаця фармальна ўмовы спаборніцтва і заключаны.

Вылучылі камісіі ці штабы па кіраўніцтву спаборніцтвам, правялі сякую-такую работу па заключэньню дагавароў і супакоіліся,—гэта ў лепшых выпадках, а ў горшых—нават і ўмовы абгаварваліся толькі габінэтным парадкам: напрыклад, Беларуцкім спажывецкім таварыствам, А.-Гарадзецкага раёну, выпрацаван да гэтага часу толькі праэкт умовы і абгавораи на праўленьні бяз удзелу мас. Выкліканае гэтым таварыствам Пярэжырскае т-ва нават і адказу не дало на прапанову ўступіць у спаборніцтва. У Бягомльскім раёне толькі два сельсаветы ўступілі ў спаборніцтва; праўда, апрача гэтых двух саветаў, „спаборнічаюць“ на пярэшнства па цяганіне Бягомльскі і Мсьціцкі с. с. Гэтыя сельсаветы і ўмовы да гэтага часу яшчэ не аформілі. Раваніцкі і Натальеўскі савгасы Чэрвенскага раёну ні ў якай меры ня выканалі ўзятых на сябе абавязкаў на сацспаборніцтву. Такія адмоўныя зьявішчы маюць месца і ў радзе іншых раёнаў.

Зараз праводзіцца праверка выкананьня дагавароў па спаборніцтву. У падагуленых выніках ад „Спаборніцтва праходзіц вучоту і кіраўніцтва“ (Ч цыялістычнае спаборніцтва масавага сыстэматычнага Вакол гэтага пытаньня яш кова мабілізавана грамадзк выніку чаго маюцца нізна ненькі (Халопеніцы).

Гэтыя нездавальняючыя я ляюцца выключна прычына многія мясцовыя кіруючыя ня ўлічылі важнасьці гэт Койданаўскі, Лагойскі, Сьм махвалавіцкі і інш. РК увесь летні пэрыяд ні разу не заравалі асобна пытаньні с нага спаборніцтва, не дава кіраўнічага напрамку ячэй кім і грамадзкім арганізацы.

Такая нядбайнасьць, нас боку кіруючых мясцовых зьяўляецца нецярпімай. Тр ўзяцца за работу па ра сацыялістычнага спаборніц чы яму больш арганізаван сыстэматычна падагульваюч усё больш уцягваючы ў с працоўныя масы вёскі і ўс грамадзкасьць.

Умову па спаборніцтву выкакаем.

(В. Галоўчыцы, Нараўлянскага р., Мазыршчына).

Галоўчыцкі сельсавет заключыў умову з Дзямідаўскім с.-с. Галоўнымі пунктамі ва ўмове вызначаны: павялічэньне пасеўнага кліну на 8 проц., ачыстка насеньня на 100 проц., арганізацыя 2 калгасаў: 2 т-ваў, рэалізацыя на 1000 рублёў III пазыкі індустрыялізацыі, ліквідацыя няпісьменнасьці сярод дарослага насельніцтва і г. д.

За некалькі месяцаў мы ўжо маем значныя вынікі. У в. Будкі нашага с.-с. арганізаван новы калгас пакуль што з 10 сямей і ў той-жа вёсцы арганізавана мэліарацыйнае т-ва; у в. Буда арганізавана 1 машыннае т-ва, у час асеньняй пасеўкампаніі ачышчана 6000 пудоў насеньня. Маем рэалізаванай пазыкі 300 руб., а таксама маем падаткі на 275 руб.

Былі труднасьці ў арганізацыі калгасу ў в. Буда. Заможная частка вёскі, як Паўлоўскія і Бернацкія, насьмехаліся з беднаты, якая арганізоўвалася ў калгас: „ідзі, ідзі, будзеш гуляць, а паёк дадуць усё адно». Ня гледзячы на кулацкія кпіны, беднота зразумела, што толькі перамагчы кулака і палепшыць сваё становішча можна арганізавана.

Так мы выковваем умову па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Міхалевіч М.

Сацспаборніцтва на паперы.

(Узьдзенскі р., Меншчына).

Падрыхтоўчая работа па правядзеньню сацыялістычнага спаборніцтва ў раёне была распачата своечасова. Быў складзены плян, які разглядаўся на розных нарадах і канчаткова замацаваны на раённай канфэрэнцыі.

Плян быў прыгожы, але што па ім зроблена? Можна з упэўненасьцю сказаць, што нічога.

У парадку сацспаборніцтва быў выкліканы Капыльскі раён. Для гэтай мэты была вылучана камісія, якая ўжо едзе два м-цы і ніяк ня можна даехаць да Капыля.

Насельніцтва не здаволена такой пастаноўкай работы. Трэба па гэта зьвярнуць увагу і прыняць усе захады ў напрамку ажыцьцяўленьня работы па сацспаборніцтву.

Селькор.

Дагавору ня выканалі.

(Шчотачная фабрыка, Віцебск).

Наша фабрыка дагавор па сацыялістычнаму спаборніцтву заключыла ў маі месяцы. Па дагавору калектыў рабочых фабрыкі ўзяў на сябе абавязак валавы выпуск прадукцыі давесьці да 325000 руб., ня выходзіць у пытаньні сабекошту з каштарысных калькуляцый, мабілізаваць унутраных рэсурсаў на 35000 руб., паставіць на належную вышыню працоўную дысцыпліну і палепшыць якасьць прадукцыі.

Як-жа выканан дагавор? Валавай прадукцыі выпушчана на 251000 р. Другі пункт дагавору таксама ня выкананы,—галоўным чынам тут адбілася недавыкананьне вытворчай праграмы на 19,5 проц. Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў выканана толькі ў частцы лесазагатовак, а па фабрыцы амаль нічога ня зроблена.

Праўда, трэба адзначыць, што ў галіне ўзьняцьця працоўнай ёсьць дасягненьні. Наперш скараціліся амаль у два р гое—да мінімуму скарацілі ваньні рабочых па цэхах, таксама лаянка, крыкі ў ч Рабочыя куды лепш аднося равіны і ўцілізацыі адкіда часьці.

Мае таксама фабрыка да галіне палепшаньня якась цыі. У выніках сацыялісты борніцтва маецца шэраг д у рацыяналізацыі вытворча фікацыі працы і павялічэн часьці работы.

Кепска тое, што рабочыя час спаборніцтва не інфар рабоце прадпрыёмства, а т дасягненьнях і недахопах борніцтва.

М

Не паўтарыць недахопаў пры выкананьні новага дагавору.

(Віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка).

Панчошна-трыкатажная фабрыка ў выніках правядзеньня сацыялістычнага спаборніцтва мае шэраг дасягненьняў. Так, сабекошт прадукцыі зьніжан на 7,5 проц., вытворчая праграма выканана амаль поўнасьцю. Фабрыка можа ганарыцца значным зьмяншэньнем прагулаў, якія з 0,54 проц. зьніжаны да 0,19,—амаль у тры разы. Да дасягненьняў можна аднесьці і мабілізацыю ўвагі часткі рабочых навакол задач сацыялістычнага спаборніцтва.

Мы спынімся на тых недахопах, якія трэба будзе запішчыць пры выкананьні новага дагавору.

Фабком далёка недастаткова кіраваў масавай работай па разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва. У выніках такой работы вялікая група рабочых ня толькі ня ўдзельнічае ў сацыялістычным спаборніцтве, але нават ня ведае з кім фабрыка спаборнічае і якія абавязацельствы прыняты па дагавору.

Надзвычайна слаба пастаўлена работа сярод новых рабочых, якія толькі за апошнія тры месяцы ўліліся на фабрыку. Іх каля 400 чалавек—36 проц. агульнай колькасьці рабочых фабрыкі. Ня былі арганізаваны і ўдарныя брыгады па цэхах. Трэба сказаць, што на фабрыцы была адна ўдарная група рабочых, але ні фабком, ні адміністрацыя, ні фабрычная газэта

У выніках вытворчай нарады аб ра Слаба прапрацоўвацца і па ецца сярод рабочых пяціго чэньне беспарапыннага тыдн

Ве

Чакаюць.

У той час, як амаль усюд заваны ўдарныя брыгады, н „Пралестары“ (Менск) усё дзецца падрыхтоўка да іх ут Яшчэ да гэтага часу ні ў во ху і аддзяленьні няма ўдарні

Завкому трэба на гэта увагу.

Выдувальн

У баку ад сацспаборніцтва.

(Мясцком Менаддзяле Белкаапсаюзу).

Здавалася, што мясцком леньня Белкаапсаюзу ў час дзеньня адказнай палітычнай як хлебазагатоўкі, павінен бы ліва працаздольным, гібкім і ным. Аднак, факты сьведчаць

Удзел мясцкому ў хлебаз пераважна „пісьмовы“, цыйны“.

Мясазагатавіцелі складаюц проц. з былых гандляроў, да нікаў і г. д.

Заключаны дагавор сац. с тва з Віцебскім аддзяленьн амаль што зусім ня выканан. нават ня меў пункту аб хлебазагатоўках.

Мясцком не асазнаў палітычн насьці хлебанарыхтовак і г мах трэба зараз-жа выправіць

Той-с

МАЗУРКА ПАД КУЛАЦКУЮ ДУДКУ.

Было гэтак:

Разьляглася заможная вёска Машчыцы на лёсавідных суглінках Случчыны; ціха спакойна напраўлялася пасьля ваеннае разрухі. Ніякіх спрэчак, здаецца, ані клясавай барацьбы—самая прыкладная вёска для правых апартуністых. Праўда, перад вайною вельмі многа цягаліся па судох, сварыліся за грамадзкі алешняк зьзве часткі вёскі: „дваранская“ і сялянская, але гэты ялешняк у часе вайны на акопы ды бліндажы пасеклі, дык і сваркам канец.

Адвячоркамі ў сьвятошныя дні зьбіралася вясковая моладзь на прыгуменьні ў якога-небудзь „гарэлага пня“ або „закутачку“, або проста так пабалавацца, пагуляць. Кулацкія сынкі ў такіх гульнях былі самымі заправіламі і сярод іх вылучаўся сваёю бойкасьцю Зьмітрок Бржозоўскі. Ды як-жа інакш? Адзін сын у бацькі на паўвалоку зямлі, вучань гарадзкога вучылішча, б. дваранін—ён адчуваў сваю сілу. Хто, калі ня ён, пачынаў зьдзекі над якім-небудзь батраком, калі той трапляў на гульні, над бедняком і над серадняком, калі можна было, як сам Бржозоўскі сказаў, „пад'ехаць“. І Бржозоўскі рабіў гэта тонка, са смакам, з падходцам.

— А ну, Палікар, паскачы мазурку—гаворыць ён, падмірґваючы дзяўчатам, даўгавязаму хлопцу Палікару Крукоўскаму. Той адненкавецца.

— То паскачы ўжо хіба, Палікар—справакаваныя на пацеху падтрымліваюць Бржозоўскага дзяўчаты.

Бржозоўскі пачынае „наярваць“ мазурку, а Палікар неахвотна робіць некалькі нязграбных рухаў пад рогат усяе кампаніі.

А потым было так:

У 1923 годзе такімі-ж самымі адвячоркамі пры сьвятле газовачкі пачала зьбірацца м. Машчыцкая ячэйка ЛКСМ. Пад кіраўніцтвам валаснога ў той час Камітэту партыі, Слуцкага павятовага Камітэту ЛКСМ яна вучыцца вясьці клясавую барацьбу супроць кулака, апіраючыся на батрацтва і беднату, адрываючы ад кулацкага ўплыву серадняка.

Пашлі батракі ў Камсамол, пашла моладзь вёскі на камсамольскія сходы, пазьней уступіў у КСМ і Палікар, гаспадарка якога была ня моцнай, хоць і блізкай да серадняцкай.

Прыціхлі кулакі, з другога боку павялі наступ.

Аднойчы на сходзе ячэйка пастанавіла самаабкладаньне для пабудовы школы правесьці. Пастанавіла аднагалосна, а на сходзе сялян адзін голас камсамольца Крукоўскага Палікара быў супроць пастановы ячэйкі, а за ім уся агалцелая арава кулакоў і кулацкі-настроеных. Бржозоўскі, мабыць, і тут прымусіў Палікара скакаць мазурку, а ячэйка выключыла Палікара Крукоўскага са сваіх шэрагаў.

Многа цёмнай работы супроць ячэйкі вялі кулакі. Пужалі цёмных сялян анцыхрыстам, даказвалі, што прыдзе скора канец сьвету і ўсім камсамольцам будзе капут і г. д. Але бядняцка-серадняцкія масы ўсё больш гуртаваліся вакол ячэйкі, усё больш пазбаўляліся кулацкага ўплыву.

Праз некаторы час многа камсамольцаў з гэтай ячэйкі пашло ў Чырвоную армію,—зрабіліся чырвонымі камандзірамі, некаторыя пашлі на савецкую і партыйную работу, некаторыя на вучобу. Стала менш сіл, а тут якраз кулацтва, у сувязі з разгортваньнем соцыялістычнага будаўніцтва, пасьмялела.

Бржозоўскі, як найбольш хітры, у 1928 годзе імкнецца пралезьці ў с-с. Ён часта заходзіць туды, дзе зьбіраюцца пагаварыць аб сваіх справах мужчыны, да селяніна Фацэнка і пачынае дыплёматычна:

— Мужчыны, каго-ж гэта мы ў с-с выбіраць будзем?

— Каго-ж ужо і выбраць, калі не цябе, ты ў нас найбольш пісьменны, заўсёды за нашы інтарэсы стаіш, і слова сказаць умееш,—паддакваюць яму падкулачнікі.

— О, я-б добра працаваў. У мяне ня пікнулі-б...—як-бы выпадкова раняе Бржозоўскі.

У тым-жа 1928 годзе ён рашуча зрывае самаабкладаньне, агітуе супроць падпіскі на газэту „Беларуская Вёска“,—бо, бачыце, сяляне цёмныя, няпісьменныя, ня ведаюць бел. мовы і г. д.

У 1929 годзе ў в. Машчыцах праводзіцца земляўпарадкаваньне. Нейкім чынам Бржозоўскага абіраюць упаўнаважаным, а Палікар Крукоўскі зьяўляецца якраз старшынёю КСУД.

Крукоўскі за гэты час быў ужо кандыдатам КП(б)Б, але яго выключылі пры чыстцы за правы ўхіл з партыі.

Праўда, ён і цяпер яшчэ ў пасямейных сьпісах піша сябе кандыт. КП(б)Б, ён і цяпер яшчэ гаворыць:

— „Мяне вычысьцілі, але я ізноў буду ў партыі, калі захачу“.

Бржозоўскі пад прыкрыцьцем Крукоўскага, будучы ўпаўнаважаным, павёў справу так, каб нават і пытаньне аб калактывізацыі ўсурёз ня ставілася, а будавалі пасёлкі. Слуцкаму РВК увесь час нагаварвала кампанія Бржозоўскага, што ў Машчыцах нельга будаваць калгас, пры чым паказвалі знарок складзены сьпіс жадаючых у калгас індывідуалькіяў. Як відаць, Бржозоўскі параўшу падысьці да справы тонка і хітра. Земляўпарадкавальнікі слухалі ўпаўнаважаных, аб калгасе амаль не гаварылася, у той час, калі жаданьне ісьці ў калгас у беднякоў і сераднякоў расло і ўзмацнялася. Частка сялян катэгарычна заявіла, што хоча ў калгас. Упаўнаважаныя вымушаны былі ўступіць напору бядняцка-серадняцкіх мас, склікаць сход і на гэтым сходзе запісалася значная частка сялянства ў калгас. Бачачы, што прыдзецца разьвітацца з лепшымі палосамі зямлі, якія выняньчылі сабе ўпаўнаважаныя, яны таксама пачалі запісвацца ў калгас з таемнай думкай, што калгас будзе разбураны. Бржозоўскі з земляўпарадкавацелем Давыдавым пачалі запісваць у калгас усіх, хто жадае і запісалі ўсіх кулакоў. Гэта недапушчальна для сав. земляўпарадкавальніка, і якія матывы кіравалі т. Давыдовым—невядома. На тым-жа сходзе абралі праўленьне калгасу, далі назву, а Бржозоўскі з новаспечаным старшынёю пачалі зьбіраць уступныя ўзносы. У сувязі з тым, што старшыня калгасу быў сам ня вельмі зацікаўлены ў будаваньні калгасу, і што Бржозоўскага ў праўленьне не абралі, уступныя ўзносы ўнесьлі толькі 7 асоб. Быў поўны прыклёп, каб заявіць у РВК, што калгас распаўся, што і было зроблена.

А што-ж зрабіў РВК?

Ён са здавальненьнем канстатаваў гэты факт, бо... нарэшце такі небясьпека кулацкага калгасу мінавала (?!)

Мы далёкі ад думкі, што РВК знарок дапусьціў развал гэтага калгасу, але мы бачым, што Бржозоўскі і К-о ашукалі савецкую ўстанову, усыпілі клясавую зоркасьць, паспрабавалі біць нас нашымжа аружжам.

З РВК на месца ніхто не паехаў, ніхто ніяк по рэагаваў. Бржозоўскі задаволена ходзіць па вёсцы, пасьмейваецца: „Гэта вам ня жартачкі калгас будаваць. Гэта справа сур'ёзная“.

Запужанае сялянства нічога ня можа зрабіць, бо РВК адносіцца недаверліва, а ў с-с—арудзьдзе кулацкай палітыкі—старшыня КСУД Палікар Крукоўскі. Варта толькі Бржозоўскаму сказаць старшыні КСУД, каб яго не абкладалі індывідуальна і яго не абкладаюць, ня гледзячы на тое, што яму і без індывідуальнага падатку—103 р. 71 к. Бржозоўскі паходзіць да Крукоўскага (яны якраз суседзі) нагаворыць, што трэба абкласьці таго і таго, а Крукоўскі ў Івана-Агародніцкім с-с ужо даказвае, што той і той кулак, што яго трэба абкласьці індывідуальна. Так, напр., зрабілі індывідуальным падатчыкам Адама Пархімовіча, у якога на 8 ядакоў—1 карова і 2 кані, з якіх адзін на трох нагах.

Трэба адзначыць, што Бржозоўскі, Сеўрук і др. у той-жа час індывідуальна не абкладаюцца, хоць у іх заўсёды пануюць па найму. Члены сям'і Адама Пархімовіча ходзяць кожны год на работу да Бржозоўскага, а падатак накладаецца наадрарот.

Кулацтва вёскі пры дапамозе Крукоўскага П. цяпер помсьціцца ўсім тым сем'ям, у якіх раней былі камсамольцы ці ёсьць цяпер члены партыі, бо якраз гэтыя сем'і самыя актыўныя барацьбіты за калгас. Узводзяцца ўсякія паклёпы, няправільна пры хлебазагатоўках разьмяркоўваюць збожжа і бульбу, вызваляючы ў значнай меры кулакоў, і, нарэшце, заяўляюць:

— Калі вы калектывісты, дык можаце ісьці ў другія калгасы, ці вам ня ўсё адно? Вы ідэйныя, дык чаму вам абавязкова ў сваёй вёсцы хочацца мець калгас?

І многа дваро́ў ідзе ў калгасы другіх вёсак, абы толькі пазбавіцца ад хітрага кулацкага тэрору.

А Бржозоўскі мае нагласьць яшчэ крычаць на члена с-с вёскі М.-Машчыцы Міхася Хаўстовіча, які таксама актыўна выступае за калгас: „Мы цябе пад суд аддамо за тое, што зрываеш пасялковае земляўпарадкаваньне“. Гэтае земляўпарадкаваньне зрываецца якраз само сабою, бо палова вёскі ідзе ў калгасы і гэтага руху ня стрымаюць ніякія Бржозоўскія.

Але даволі!

Трэба пакончыць з усім гэтым, трэба ўмяшацца ў гэтую справу належным органам. Трэба праверыць, хто такі Бржозоўскі ў сучасным і мінулым. Трэба дапамагчы тым, хто сапраўды хоча будаваць калгас. Чаму земляўпарадкаваньне ў Мышчыцах ідзе няправільна? Чаму замест таго, каб выся

Законы і загады ўраду Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі.

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу Народнага Камісарыяту Земляробства пра вынікі сельска-гаспадарчых кампаній 1929 г.

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Земляробства пра вынікі сельска-гаспадарчых кампаній, Савет Народных Камісараў адзначае:

Вясеньняя і асеньняя пасеўныя кампаніі 1929 г. у адпаведнасьці з пастановамі ўрадаў СССР і БССР прайшлі пад знакам узмацненьня і пашырэньня калектывізацыі, падвышэньня грамадзкай і вытворчасьці ў аграрным сэктары сельскай гаспадаркі, савецкіх і калектыўных гаспадарак і ў бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

Шырокі калгасны рух, які пачаўся з 1928 г., яшчэ з большым размахам разгарнуўся ў сельска-гаспадарных кампаніях 1929 г. і набыў масавы характар. Стварыліся буйныя масывы (2000-6000 га), якія абхопілі ня толькі цэлыя сельсаветы (Унар--Магілеў), але нават і раёны (Навіцкі, Лоеўскі, Юравіцкі), у якіх калектывізавана 16-35 проц. усяе сельскай плошчы раёну.

Вынікам рашучага пералому ў справе калектывізацыі сельскае гаспадарэньне ператварылася ў вызначаных пяцігадовым плянам сацыялістычнага будаўніцтва народнае гаспадаркі і культуры.

Плянавыя меркаваньні 1928-29 г. выкананы звыш 300 проц., прычым дасягнуўся разьмер калгасаў да 7 га ў сярэднім супроць 95 га ў цэлым годзе. Існуючыя калгасы ўзмацніліся праз павялічэньне ўрадавых пасьцяў, рост валавой і таварнай прадукцыі і капітальнае будаўніцтва. Пасьпяховаму правядзеньню мерапрыемстваў па рэканструкцыі сельскае гаспадаркі—калектывізацыі, каапэраваньню, кантрактацыі, навучаньню, збору попелу, пашырэньню пасеўных плошчаў і ўрадавых, забясьпечаньню сродкамі і дапамогай ворчасьці, у значнай меры дапамагі пашырокія колы савецкай грамадзкасьці: рабочыя брыгады, камсамол у гадзе за ўраджай, сельсаветы, прафарганізацыі, партыйныя ячэйкі, пэфтаварыствы, групы беднаты, настаўніцтва і г. д. Савецкімі і калектыўнымі гаспадаркамі, як асяродкамі культурнай і гаспадарчай буйнай гаспадаркі, узмацнілася агрыкультурная дапамога сялянству праз ачыстку і абмен насеньня, інвентару, прадастаўленьне машын сілы, машын і прыладаў, арганізацыю злучных пунктаў.

Пасьпяховаму калгаснаму будаўніцтву і актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас за палепшаньне гаспадаркі перашкаджаюць шалёнае супраціўленьне кулацка-капіталістычныя элемэнты, якія выступуленьні накіроўваюць супраць мерапрыемстваў саветаў праз ганьне за паслабленьне і разбурэньне калгаснага руху, ужываньне тэрарыстычных актаў (падпал маемасьці калгасаў і забойства актывістых калгасаў), што ў шэрагу выпадкаў скажэньні клясавай лініі асобных арганізацыямі і працаўнікамі вёскі важлівых адносін да калгасаў, адзіла да распаду некаторых створаных калгасаў (Буда-Кашалёўскі, Чырвонапольскі). Гэтыя факты абвяшчаюць ад усіх арганізацый прыняцьця самых рашучых мер да адпору ворскім элемэнтам і ўсямернай дапамогі арганізуючымся калгасам у іх клясавай барацьбе з кулакам.

Побач з дасягненьнямі, у часе правядзеньня сельска-гаспадарчых кампаній мелі месца наступныя недахопы:

1. Не гледзячы на дадзеную Саветам Народных Камісараў устаноўку, што кіраўніцтва сельска-гаспадарчая кампанія зьяўляецца працягам працы вясеньняй кампаніі і што тэмп падрыхтоўкі не павінен паслабляцца, а значна ўзрасьці і ўзмацніцца на падставе вопыту, што павінна было забясьпечыць зьнішчэньне тых недахопаў, якія заўважаны ў вясеньнюю пасеўную кампанію, аднак, фактычна навакол пытаньняў асеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі ня ўсе масцовыя органы і арганізацыі дастаткова мабілізавалі шырокія колы бядняцка-серадняцкіх мас і не ўцягнулі як належыць у працу камсамол, прафэсыянальныя ячэйкі, рабочыя брыгады, шэфтаварыствы і г. д. і, у выніку ўсяго гэтага, ня толькі не пашырылі самадзейнасьці і актыўнасьці бядняцка-серадняцкіх мас, але ў некаторых раёнах гэта самадзейнасьць нават зьнікла ў параўнаньні з вясной, што адбілася на недавыкананьні некаторых мерапрыемстваў, у прыватнасьці:

а) вапнаваньне глебы пад азімы пасеў, як мерапрыемства, якое забясьпечвае падвышэньне ўраджайнасьці, выканана ўсяго на 31 проц., бо заказ на пастаўцы вапняных млыноў і рухавікоў прамысловасьцю выкананы з спазьненьнем на 3 месяцы, прычым апошнія нізкай якасьці—паломка часьцей у першыя дні працы. Устаноўка млыноў затрымлівалася за нявышуканасьцю месц залягання вапнякоў, не арганізавана сыстэма тэхнічнага абслугоўваньня па ўстаноўцы і працы млыноў;

б) ня гледзячы на тое, што выпрацоўка молатай вапны для вапнаваньня ў час зяблевай воранцы (на плошчы 20 тыс. га) не перавышае 30 проц. патрэбнасьці, памолатая вапна ў шмат якіх пунктах застаецца не разобранай. Гэта тлумачыцца нездавальняючай арганізацыяй распаўсюджваньня вапны, недастатковым правядзеньнем аграпраганды, у зьвязку з чым можа быць недавыкананы плян вапнаваньня ў час зяблевай воранцы пад ярыну бягучага году;

в) па ўнядрэньню торпу на ўгнаеньне ў „тыдзень торпу" праведзена вялікая растлумачальная праца, але на практыцы тарпаваньне, як масавае мерапрыемства, не атрымала патрэбнага разгортваньня і плянавыя меркаваньні недавыкананы;

г) утварэньне гатунковых пасеваў, як адно з галоўнейшых мерапрыемстваў у падвышэньні ўраджайнасьці, не давыкананы на 26 проц. плянавага заданьня, з прычыны пяздачы па пляну пасеньня Белсельтрэстам і Калгассаюзам, што тлумачыцца позьняй арганізацыяй імі абмалоту і адгрузкі. Сыстэма сельска гаспадарчай каапэрацыі, на абавязку якой ляжала фактычнае распаўсюджваньне гатунковага насеньня, таксама ня ўжыла належных захадаў для загатоўкі гатунковага насеньня ў насельніцтва, якое было выяўлена ў час апрабацыі;

д) матар'яльная дапамога бядняцкім гаспадаркам больш станоўча і эфэктыўна аказана праз уцягненьне гэтых гаспадарак у калектыўнае будаўніцтва, але тыя бядняцкія гаспадаркі, якія застаюцца пакуль што па-за межамі калгасаў, абслугоўваюцца недастаткова. асабліва арганізацыяй дапамогі пры ўборцы ўраджаю, стварэньнем суполак пры апрацоўцы глебы, не скарыстаны фонды каапэраваньня беднаты;

е) у галіне забясьпечаньня сродкамі вытворчасьці, ня гледзячы на навялічэньне завозу штучных угнаеньняў на 130 проц. і сельска-гаспадарчых машын на 52 проц. супроць мінулага году, фактычна-ж не даўлічаны запатрабаваньні на складаныя машыны з боку сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, галоўным чынам, па складаныя малатарні, жняркі, сэпаратары і прычапныя прылады да трактароў, а ў часьці штучных угнаеньняў позьняя адгрузка (у верасьні) заводамі прамысловасьці частка ўгнаеньняў, якія не маглі быць скарыставаны пад засеў у бягучым годзе, асабліва ў раёнах паўночных акруг;

ж) прасьцейшыя агразоотэхнічныя мерапрыемствы па палепшаньню жывёлагадоўлі і кармавой базы былі разгорнуты недастаткова, ня гледзячы на тое, што галіна жывёлагадоўлі ва ўмовах БССР павінна быць вядучай галінай у падвышэньні таварнасьці сельскай гаспадаркі. Кармовае пытаньне не завострана дастаткова і рашучых мер па пабудове сіласных ям і забясьпечаньні іх цэмантам з боку гандлюючых арганізацый і зямельных органаў ня прымалася, таксама недастаткова праведзены мерапрыемствы па закладцы штучных выпасаў;

з) ня быў арганізаваны кантроль і надзік за выкананьнем аграмінімуму і сацыялістычнага спаборніцтва з боку раённых выканаўчых камітэтаў, сельсаветаў, прафсаюзных вясковых ячэек і аграўпаўнаважаных, у зьвязку з чым шэраг прасьцейшых мерапрыемстваў, прынятых на сходах у абавязковым парадку, цалкам ня выкананы.

Выходзячы з вышэйадзначанага, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Узяты тэмп калектыўнага будаўніцтва значна ўзмацніць і пашырыць. Калектыўнае будаўніцтва павінна быць замацавана праз арганізацыйнае, тэхнічнае абслугоўваньне, як з боку зямельных органаў і калгаснай сыстэмы, так усіх савецкіх і каапэрацыйных устаноў, і паданьне асаблівай увагі раёнам масавай сплошной калектывізацыі. Адначасова ў зімні пэрыяд 29-30 г. правесьці шырокую растлумачальную кампанію сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, калгасьнікаў і рабочых савецкіх гаспадарак аб пераважнасьці буйнае калектыўнае і савецкае гаспадаркі перад дробнай сялянскай, неабходнасьці навышэньня якасьці і вытворчасьці працы ў савецкіх і калектыўных гаспадарках праз уцягненьне ў сацыялістычнае спаборніцтва ўсіх калектыўных і савецкіх гаспадарак і праверку вынікаў спаборніцтва гэтага году.

2. Забясьпечыць у працы па вытворчаму каапэраваньню больш рашучы пераход прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў у больш складаныя (калектыўныя аб'яднаньні), з адначасовым узмацненьнем тэмпу арганізацыі прасьцейшых аб'яднаньняў па спэцыяльных галінах сельскае гаспадаркі—жывёлагадоўлі, тэхкультурах, садоўніцтва і гароднiцтва.

3. Улічваючы значэньне і сучаснае становішча жывёлагадоўлі, запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белсельтрэсту, Белкалгассаюзу і Белмалжывёлсаюзу і ўсім акруговым і раённым выканаўчым камітэтам прыняць тэрміновыя захады да стварэньня рашучага пералому ў разгортваньні мерапрыемстваў у галіне жывёлагадоўлі, сканцэнтраваўшы гэтыя мерапрыемствы ў першую чаргу ў гаспадарках сацыялістычнага сэктару, прадугледзіўшы ў пляне 1929-30 г. арганізацыю буйных савецкіх і калектыўных гаспадарак спэцыяльнага жывёлаводнага напрамку, пашырэньне сеткі племянных гаспадарак і рашучага пераходу калектыўных і савецкіх гаспадарак на рацыянальнае вядзеньне жывёлагадоўлі ў сэнсе паленшаньня ўмоў харчаваньня, утрыманьне, догляд на грунце правядзеньня адпаведных мерапрыемстваў па ўзмацненьню кармавой базы, будаўніцтва рацыянальных скотных двароў. Мабілізаваць навакол пытаньняў жывёлагадоўлі, праз вясковы актыў, камсамол, прафсаюзы, камітэты ўзаемадапамогі, аграўпаўнаважаных, самадзейнасьць бядняцка-серадняцкіх мас, асабліва пры ажыцьцяўленьні агразоомінімуму.

4. Адзначаючы пашырэньне ў бягучым годзе пасеўных плошчаў тэхнічных культур па ўсім сэктарам на 9,5 проц. і павялічэньне ўраджайнасьці на пасеньню на 12,7 проц., лічыць недастатковым пашырэньне тэхнічных культур наогул, а ў асаблівасьці па лініі савецкіх і калектыўных гаспадарак.

Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, Белсельтрэсту і Белкалгассаюзу ў пляне 1929 30 году прадугледзіць арганізацыю новых спэцыялістых буйных ільнаводных і канаплеводных савецкіх і калектыўных гаспадарак, адначасова прыняць крокі да максымальнага папырэньня тэхнічных культур у існуючых калектыўных і савецкіх гаспадарках, а таксама мэханізаваць працэсы культуры і першай апрацоўкі лёну і канапель.

5. Запрапанаваць акруговым і раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам арганізаваць сталую праверку выкананьня аграмінімуму, забясьпечыўшы своечасовае атрыманьне бядняцка-серадняцкімі гаспадаркамі льгот на сельгаспадарчаму падатку на 1929-30 г., ажыцьцяўленьне агрыкультурных палепшаньняў. Зямельным органам арганізаваць падрыхтоўку аграўпаўнаважаных праз сельгаспадарчыя курсы, канфэрэнцыі і г. д.

6. Цэнтральнаму Камітэту сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы для рашучага зьнішчэньня недахопаў у працы камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, асабліва зьвярнуўшы ўвагу на работу на поўнаму ахопу сяброўствам вясковай беднаты з мэтаю максымальнага іх уцягненьня ў калгасы, вытворчыя каапэрацыйныя аб'яднаньні і кантрактацыю, а таксама па найбольш поўнаму абслугоўваньню беднаты і забясьпечаньню сродкамі вытворчасьці, у сувязі з пасеўнымі кампаніямі і мерапрыемствамі па ўздыму ўраджайнасьці і вытворчасьці сельскай гаспадаркі праз своечасовае вылучэньне патрэбнасьці беднаты ў сродках вытворчасьці і ўключэньне ў пляны загатовак сел.-гасп. каапэрацыі.

7. Акруговым выканаўчым камітэтам, сельсаветам, Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі, НК Земляробства і органам сельска-гаспадарчай каапэрацыі дабіцца рашучага пералому ў разуменьні ўсёй важнасьці вапнаваньня глебы і ажыцьцяўленьня задач па вапнаваньню яе, паставіўшы ў абавязковым парадку правядзеньне вапнаваньня на землях савецкіх калектыўных гаспадарак, уключыўшы ў аграмінімум вапнаваньне ў тых сяленьнях, дзе глебавыя ўмовы наяўна забясьпечваюць эфэктыўнасьць вапнаваньня.

8. У бягучым годзе максымальна выкарыстаць усе магчымасьці па выкананьню пляну вапнаваньня глебы пры зяблевай воранцы пад ярыню будучага году.

Фарсіраваць загатоўку сырцу для размольных вапняных установак, каб праца млыноў не застанаўлівалася і на зімні час. Разам з гэтым ужыць меры зьніжэньня сабекошту молатай вапны, з максымальным набліжэньнем да адпускной цаны, праз рацыяналізацыю, загатоўку, рамонт і збыт вапны.

9. У справе падвышэньня ўраджайнасьці рашуча ўжыць напрамак на пашырэньне мерапрыемстваў па выкарыстоўваньню на ўгнаеньне мясцовых рэсурсаў: торпу, попелу і лубіну, для чаго рашуча ўзмацніць размол фасфарытаў на будуемых заводах у БССР, пашырыць максымальна арганізацыю спэцыяльных гаспадарак па вырасьліваньню насеньня лубіну, а таксама фарсіраваць загатоўку торпу і торпападсьцілкі на ўгнаеньне.

10. Пры правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, забясьпечыць у працы савецкіх, зямельных і каапэрацыйных органаў поўнае ажыцьцяўленьне чоткай клясавай лініі. Усім папыткам кулацтва ў той ці іншай форме даваць самы рашучы адпор. Трэба і надалей рашуча ажыцьцяўляць і пашыраць мерапрыемствы па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Неабходна яшчэ больш напружаная клясава вытрыманая праца па масавай калектывізацыі, вытворчаму каапэраваньню, кантрактацыі і ўцягненьню батрацка-бядняцка-серадняцкіх колаў для працы па ажыцьцяўленьню асноўных практычных задач сацыялістычнага будаўніцтва сельскае гаспадаркі БССР.

11. Адзначаючы ролю друку ў падрыхтоўцы правядзеньня сельска-гаспадарчай кампаніі і наогул у справе рэканструкцыі сельскае гаспадаркі некаторае палепшаньне гэтай справы ў бягучым годзе, хаця і недастатковае, прапанаваць Белдзяржвыдавецтву і Народнаму Камісарыяту Земляробства пашырыць выданьне папулярнай і навуковай сельскагаспадарчай літаратуры, асабліва ў часьці калектыўнага будаўніцтва, жывёлагадоўлі і кармавым пытаньням і адначасова ўзмацніць высьвятленьне гэтых пытаньняў у перыядычным друку, увязаўшы гэта з падрыхтоўкай да вясеньняй сельска-гаспадарчай кампаніі 1930 г.

12. Для максымальнай папулярызацыі мерапрыемстваў Савецкага Ураду па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і прыцягненьня актыўнасьці працоўных бядняцка-серадняцкіх мас да іх ажыцьцяўленьня, запрапанаваць акруговым і раённым выканаўчым камітэтам і сельскім саветам своечасова распачаць падрыхтоўку да правядзеньня вясеньняй насеўнай кампаніі 1930 г., распрацаваўшы мерапрыемствы ў плянавым парадку з кантрэтызацыяй да кожнай савецкай і калектыўнай гаспадаркі і населішча і абмеркаваўшы ўсе мерапрыемствы на шырокіх сходах сялян, вытворчых нарадах калгасаў і савецкіх гаспадарак, на прэзыдыумах і пленумах сельсаветаў, з уцягненьнем да правядзеньня мерапрыемстваў па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі актыву гораду і вёскі: рабочых брыгад, камсамолу, прафсаюзных ячэек, шэфтаварыстваў і г. д.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР
М. Галадзед

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР
М. Калевіч

г. Менск, 20 лістапада 1929 г.

Пастанова

Эканамічнай Нарады пры Савеце Народных Камісараў БССР

ПА ДАКЛАДУ ВСНГ ПРА СТАНОВІШЧА І ПЭРСПЭКТЫВЫ РАЗЬВІЦЬЦЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР НА 1929-30 ГОД.

Эканамічная Нарада пры СНК БССР канстатуе:

1. Даклад ВСНГ у асноўным грунтуецца на матар'ялах справаздачнасьці за 1926-27 і 1927-28 г. г., папярэдніх матар'ялах за 1928-29 год і кантрольных лічбах на 1929-30 г. і адбівае становішча мясцовай прамысловасьці БССР, але ў ім не высьвятляюцца далейшыя пэрспэктывы мясцовай прамысловасьці.

2. Адзначаючы ўзрост мясцовай прамысловасьці БССР ў 1929-30 г.+132,1 проц. супроць 1927-28 г. па валавой прадукцыі (з 88,4 млн. руб. да 205,2 млн. рубл.) і па рабсіле+91,3 проц. (з 36,9 тыс. да 70,7 тыс. чал.), трэба заўважыць, што гэты ўзрост у значнай меры ішоў стыхійна без дастатковага кіраваньня з боку вышэйшых органаў. Гэта, паміж іншым, знайшло адбітак у правядзеньні шэрагу ўнепланавых капітальных работ і разгортваньні паасобных галін без дастатковага вучоту сыравінай базы і ўвязкі з разьвіцьцём дзяржаўнай прамысловасьці.

3. Адначасова з узростам аграмаджанага сэктару мясцовае прамысловасьці (дзяржаўнаю і капэрацыйнаю) наглядаецца скарачэньне прыватнага сэктару; удзельная вага апошняга значна памяншаецца (з 52,4 проц. у 1926-27 г. да 22,1 проц. у 1929-30 г. па валавой прадукцыі і з 66,0 проц. да 40-42 проц. па ліку занятых асоб).

4. Удзельная вага мясцовай прамысловасьці ва ўсёй прамысловасьці БССР складае: па кантэўнасьці валавой прадукцыі ў 1927-28 г. 43,1 проц., у 1928-29 г.—43,5 проц. і ў 1929-30 г.—41,6 проц. і па ліку занятых асоб адпаведна—58,2 проц., 63,5 проц. і 63,9 проц.

5. Асноўныя капіталы мясцовай прамысловасьці павялічваюцца: на дзяржаўнаму сэктару з 17,9 млн. руб. на 1-е кастрычніка 1928 году да 38,6 млн. руб. на 1 кастрычніка 1930 году і па капэрацыйнаму сэктару з 4,5 млн. руб. на 1 кастрычніка 1928 году да 13,0 млн. руб. на 1 кастрычніка 1930 году.

6. Значнае месца ў мясцовай прамысловасьці займае прыватная сыравіна, асабліва па працаёмістым і па капэрацыі, у якіх гэтакая наглядаецца да 60 проц. усёй колькасьці спажываемай сыравіны, бо ў БССР больш разьвіты кравецкая, абуткова і панчошная галіны, якія павялічваюць ролю вытворчасьці на дэфіцытнай сыравіне. Адначасова ў мясцовай прамысловасьці зусім недастаткова разгорнута вытворчасьць па галінам, якія базіруюцца на недэфіцытнай сыравіне.

7. У рабоце мясцовай прамысловасьці, асабліва па саматужнай капэрацыі, ня было дастатковай увагі да пытаньняў пашырэньня вырабу прамтавараў для экспарту, а таксама вырабу рэчаў хатняга і культурнага абіходу і будаўнічых матар'ялаў.

8. Выкананьне пляну і разгортваньне мясцовай прамысловасьці да гэтага часу сустракаліся з затрудненьнямі ў справе снабжэньня прыватнай сыравіны, якая ў спэцыфічных умовах БССР займае значнае месца.

9. Адносна слабае разьвіцьцё галін прамысловасьці па перапрацоўцы мясцовай сыравіны, абумоўліваецца: а) недастатковым вытвараньнем досьледаў па вывучэньню мясцовых сыравінных рэсурсаў, б) недастатковым правядзеньнем арганізацыйных мер да папаўненьня базы сельска-гаспадарчай сыравіны, якую магчыма скарыстаць у мясцовай прамысловасьці, в) арганізацыйнай слабасьцю мясцовай прамысловасьці і малым наліччам тэхнічных сіл, асабліва ў капэрацыі, г) недастатковай арганізацыяй снабжэньня сыравінай прадпрыемств мясцовай прамысловасьці і збыту гатовых вырабаў.

10. У розных сэктарах мясцовай прамысловасьці наглядаецца цэлы шэраг прадпрыемстваў адноўкавай галіны (абуткова, трыкатажная, кравецкая, крухмальная), што зьяўляецца нематэзгодным па арганізацыйным меркаваньням.

11. Да гэтага часу па лініі саматужна-прамысловай капэрацыі недастаткова праводзілася праца па пераквалёфікацыі саматужнікаў, якія пераапрацоўваюць дэфіцытную сыравіну, для работы ў іншых галінах прамысловасьці, а таксама недастаткова праводзілася канцэнтрацыя саматужных арцеляў у гарадох і мястэчках.

12. У апошнія гады ідзе працэс узбуйненьня паасобных працаёмістых і арцеляў і мэханізацыя вытворчасьці апошніх, але наогул трэба адзначыць, што распыленасьць вытворчасьці і раскіданасьць у розных памяшканьнях перашкаджае справе рацыяналізацыі вытворчасьці, палепшаньню ўмоў працы, падняцьцю прадукцыйнасьці працы, зьніжэньню сабекаштоўнасьці і палепшаньню якасьці прадукцыі.

13. Хаця за апошнія гады і наглядаецца палепшаньне становішча забясьпечаньня мясцовай прамысловасьці ўласнымі зваротнымі сродкамі, але апошнія, асабліва па прамысловасьці акрвыканкомаў, усе яшчэ зьяўляюцца недастатковымі, што ў значнай меры перашкаджае нармальнай працы мясцовай прамысловасьці.

14. Вытвараньне капітальных работ, асабліва па новаму будаўніцтву, да гэтага часу ішло вельмі марудна з прычыны недахопу арганізацыйнага боку, затрымак з апрацоўкай праектаў, адсутнасьцю тэхнічных сіл па мясцох, цяжкасьці снабжэньня машынамі і будаўнічымі матар'яламі, а таксама з прычыны недастатковага і несваячасовага фінансаваньня.

15. Кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю і нагляд за яе працаю да гэтага часу былі наогул недастатковымі, а таксама нездавальняюча пастаўлен вучот усёй мясцовай прамысловасьці, асабліва ў адносіне якасных паказальнікаў у працы яе.

Маючы на ўвазе вышэйадзначанае, Эканамічная Нарада пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Даручыць ВСНГ у 2-х месячны тэрмін разьмяркаваць сфэры дзейнасьці паміж рэспубліканскай прамысловасьцю і рознымі сэктарамі мясцовай прамысловасьці ў адносіне ахапленьня імі паасобных галін прамысловасьці.

2. Прапанаваць акрвыканкомам у месячны тэрмін, пасьля ўзгадненьня з ВСНГ, вылучыць з складу мясцовай прамысловасьці прадпрыемствы нявытворчага характару (лазьні і інш.).

3. Даручыць ВСНГ і акрвыканкомам разам з адпаведнымі арганізацыямі (Інстытут Прамысловасьці і інш.) у 4-х месячны тэрмін канкрэтна вызначыць новыя віды вытворчасьці, якія-бы працавалі на мясцовай, альбо недэфіцытнай прывозной сыравіне; зьвярнуць асаблівую ўвагу на неабходнасьць разгортваньня вытворчасьці вырабаў для экспарту, а таксама рэчаў хатняга і культурнага абіходу і будаўнічых матар'ялаў.

4. Прапанаваць Белсампрамсаюзу праводзіць далейшае пашырэньне і разьвіцьцё прадпрыемстваў, процуючых на недэфіцытнай сыравіне з адначасовым устрыманьнем росту прадпрыемстваў, працуючых на дэфіцытнай сыравіне, асабліва на лініі саматужнікаў-адзіночак.

5. Даручыць ВСНГ у 2-х месячны тэрмін распрацаваць і падаць у Дзяржплян даклад: а) аб сетцы лесапільных заводаў мясцовай прамысловасьці і пэрспэктывах далейшага існаваньня іх, улічваючы плян разьвіцьця рэспубліканскай лясной прамысловасьці, б) аб мэтазгоднасьці далейшага існаваньня Бабруйскай і Менскай махорачных фабрык.

Прапанаваць ВСНГ і НК Земляробства зьвярнуць увагу на клянавае ў далейшым будаўніцтва крухмальных заводаў мясцовага значэньня.

6. У мэтах поўнай нагрузкі існуючых прадпрыемств і выкананьня намечаных плянаў, узьняць перад Савецкімі органамі хадайніцтва аб поўным задавальненьні мясцовай прамысловасьці сыравінай, у прыватнасьці тэкстыльнай, мэталёвай і скуранай. Адначасова, пры разьмеркаваньні мясцовай сыравіны неабходна мець на ўвазе больш поўнае забясьпечаньне прадпрыемств мясцовай прамысловасьці дастатковай колькасьцю сыравіны для выкананьня намечанага пляну.

7. Даручыць ВСНГ разам з НК Працы і Камітэтам па справах друку абмяркаваць пытаньне аб становішчы і далейшай рабоце мясцовай і ведамасьцьвенай паліграфічнай прамысловасьці, улічваючы дэфіцыт сыравіны для гэтай галіны прамысловасьці.

8. Прапанаваць ВСНГ безадкладна прыступіць да складаньня тыпавых праектаў дробных прадпрыемстваў, якія намячаюцца да пабудовы ў значнай колькасьці (цагельныя, вапняныя і інш.)

9. Прапанаваць акрвыканкомам пры складаньні мясцовых бюджэтаў і НК Фінансаў пры сводзе мясцовых бюджэтаў, прадугледзіць павялічэньне зваротных сродкаў мясцовай прамысловасьці акрвыканкомаў, выходзячы з зацьверджанага разьмеру вытворчасьці па паасобных галінах і нармальных суадносін разьмеру валавой прадукцыі з уласнымі сродкамі.

10. Улічваючы цяжкасьць для мясцовага бюджэту, давесьці па працягу аднаго году зваротныя сродкі да нармальных разьмераў, прапанаваць НК Фінансаў уключыць у мясцовы бюджэт 1928-30 г. фінансаваньне зваротных сродкаў акрвыканкомаў у разьмеры ня менш, чым намечана кантрольнымі лічбамі. Разьмеркаваньне гэтай сумы паміж трэстамі і іншымі аб'яднаньнямі даручыць НК Фінансаў разам з ВСНГ і Дзяржплянам.

11. У мэтах павялічэньня сродкаў самапрамкапэрацыі, прапанаваць Белсампрамсаюзу прыняць захады да насілёньня збору паёў з тым, каб на працягу гэтага году быў поўнасьцю сабраны пазыкі ўзносы, вызначаныя на зацьверджанаму СНК пляну.

12. Зьвярнуць увагу ВСНГ, акрвыканкомаў і адпаведных рэспубліканскіх цэнтраў па слабую зваротнасьць капіталаў і на неабходнасьць мабілізацыі ўнутраных сродкаў для забясьпечаньня зваротных капіталаў мясцовай прамысловасьці.

13. У сувязі з недастатковай мэхавізацыяй прадпрыемстваў саматужна-прамысловай капэрацыі, прапанаваць Белсампрамсаюзу прыняць захады да павялічэньня капітальных укладаньняў за лік улясных сродкаў самой сыстэмы саматужна-прамысловай капэрацыі.

14. Даручыць ВСНГ і Белсампрамсаюзу вывучыць пытаньне аб магчымасьці зьнижэньня ў саматужна-прамысловай капэрацыі унеабаротных ня сродкаў.

15. У мэтах своечасовай загатоўкі будаўнічых матар'ялаў і абсталяваньня, а таксама і выдзеньня самаго будаўніцтва, абавязаць банкі і НК Фінансаў своечасова выдаваць сродкі, вызначаныя на пляну фінансаваньня і доўгатэрміновых крэдытаў у адпаведнасьці з складзеным плянамі работ.

Адначасова прапанаваць Будаўнічаму Камітэту прасачыць за тым, каб пастанова Ураду аб кантрактацыі будаўнічых матар'ялаў у саматужна-прамысловай капэрацыі і іншых сэктарах мясцовай прамысловасьці была шырока праведзена ў жыцьцё.

16. Прапанаваць Белсампрамсаюзу ў 2-х месячны тэрмін вызначыць шэраг мерапрыемстваў па пераквалёфікацыі саматужнікаў у мэтах пераводу іх на працу ў вытворчасьці па пераапрацоўцы недэфіцытнай сыравіны.

17. У мэтах падрыхтоўкі кваліфікаванай рабочае сілы для мясцовай прамысловасьці, даручыць ВСНГ і НК Працы безадкладна распрацаваць пытаньне аб арганізацыі фабзавучаў пры найбольш моцных прадпрыемствах мясцовай прамысловасьці.

18. У мэтах зьнижэньня рознастайнасьці ў разьмерах зарплаты па розным сэктарам мясцовай прамысловасьці і нават па асобным акругам, прапанаваць ВСНГ і НК Працы ў 2-х месячны тэрмін прыняць адпаведныя захады на рэгуляваньню заработнай платы.

19. Прапанаваць Белсампрамсаюзу на працягу 4-х месяцаў скончыць праверку сацыяльнага складу арцеляў саматужна-прамысловай капэрацыі.

20. Даручыць ВСНГ разам з Белсампрамсаюзам і НК Працы ў 2-х месячны тэрмін вызначыць тыя саматужна-прамысловыя арцелі, якія могуць быць перададзены дзяржаўнай прамысловасьці пасьля праверкі іх асабовага складу і распрацаваць парадак перадачы іх.

21. У сувязі з значным адставаньнем якасных паказальнікаў па ўсёй мясцовай прамысловасьці, даручыць ВСНГ, з удзелам зацікаўленых устаноў распрацаваць і ў месячны тэрмін даць на месцы канкрэтныя дырэктывы аб палепшаньні якасных паказальнікаў па мясцовай прамысловасьці, зьвяртаючы асаблівую ўвагу на якасьць прадукцыі, сабекошт, прадукцыйнасьць працы і інш.

22. У зьвязку з шнаркім разьвіцьцём калгаснага будаўніцтва абавязаць прадпрыемствы мясцовай прамысловасьці і ўстановы, якія рэгулююць гэту прамысловасьць пры складаньні і зацьверджаньні вытворчых пляноў, улічваць запатрабаваньні калгаснага будаўніцтва (задавальненьне калгасаў гатовымі вырабамі, арганізацыя рамонтных майстэрняў, разьвіцьцё хэмічных галін, зьвязаных з сельскай гаспадаркай, выраб будаўнічых матар'ялаў).

23. Зьвярнуць увагу ВСНГ, акрвыканкомаў і адпаведных рэспубліканскіх цэнтраў па неабходнасьць безадкладнага ўпарадкаваньня інвэнтарызацыі на прадпрыемствах мясцовай прамысловасьці, асабліва на лініі саматужна-прамысловай капэрацыі.

24. Зьвярнуць асаблівую ўвагу акруговых выканаўчых камітэтаў і рэспубліканскіх цэнтраў на лініі мясцовай прамысловасьці на недапушчальнасьць парушэньня ўстаноўленых цэн на прэнтавары мясцовай прамысловасьці, а асоб віноўных у гэтым прыцягваць да судовай адказнасьці.

25. Прапанаваць ВСНГ і Дзяржпляну пры разглядзе акруговых пяцігодак улічыць усе моманты, паказаныя ў гэтай пастанове.

Адначасова лічыць неабходным, каб пры распрацоўцы ВСНГ і Дзяржплянам пяцігадовага пляну быў дан спэцыяльны раздзел аб характэрыстыцы і напрамку працы мясцовай прамысловасьці на асобных акругам.

Старшыня Эканамічнай Нарады БССР М. КАРКАЛІН.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР В. КРЫВІЦКІ.

Кіруем сродкі ад самаабкладаньня на сацыяльна-культурныя патрэбы вёскі.

Бядняцка-серадняцкія масы даюць адпор спробам кулацтва сарваць самаабкладаньне.

Сельсаветы павінны даваць справаздачы насельніцтву аб выкананьні мерапрыемстваў, вызначаных па самаабкладаньню.

Беднота дае адпор кулацтву.

(Церахоўскі р., Гомельская акр.).

Мінулае-б не праводзілася кампанія парт. і савецкай уладай, заможная частка грамадзтва Уцеўскага сельсавету вельмі ставіцца адносіцца да яе і ўсялякімі спосабамі імкнецца перашкодзіць, або сарваць. Гэтыя выпадкі былі ў веснавую і восеньнюю пасеўную кампаніі, дзе адны і тыя заможнікі імкнуліся перашкодзіць сходам.

Але больш яскрава выявілася кулацкая агітацыя-прапаганда супроць хлебазапасу і загатоўкі бульбы. Але, дзякуючы вясковым партыйным і савецкім работнікам, а таксама настаўніцтва і другой частці актыўных сялян-бедноты, усе кулацкія вылазкі атрымалі адпор і кампаніі прашлі з посьпехам.

Прайшла новая кампанія, кампанія самаабкладаньня. Тыя-ж самыя варожыя элементы сустрэлі новую кампанію больш арганізавана, адкрыта і нахабна, ня толькі сваіх падпявалаў, але і самі імкнуліся сарваць самаабкладаньне ва Уцеўскім сельсавеце.

Так, напрыклад, 16 лістапада прымалі ў Уцеўскім самаабкладзньне ў вёсцы Уць. Усе заможнікі і індывідуальнікі прышлі на сход і закрычалі, каб гэтым самым сарвалі сход. Але на гэтыя нахабныя кулацкія вылазкі беднякі у хаўрусе з лепшым актыўным серадняцтвам, не далі ворагам сарваць сход, а настанавілі галасаваць. Большасьцю супроць абнагляўшых ворагаў прынялі на 1929-30 г. 50 проц. самаабкладаньня.

У гэты-ж вечар у пасёлку Стэп праводзіўся сход аб прыняцьці самаабкладаньня. Ворагі мерапрыемству партыі і Савецкай улады, яшчэ больш актыўна за Уцеўскіх ворагаў, выступалі супроць прыняцьця самаабкладаньня. І нахай бы перашкаджалі тыя, якія ня маюць права голасу, але-ж ім дапамагалі іх падпявалы, дзеці якіх навучаюцца і служаць у савецкіх установах, як напрыклад, Абушэнка Я. І. адкрыта на карысьць ворагам выступаў і зрываў сход па самаабкладаньню і галасаваў супроць яго. Другі больш хітры заможнік і падпявала кулацкі і папоўскі, Чуянаў Р., увесь час не даваў гаварыць упаўнаважанаму па самаабкладаньню і лаяў Савецкую ўладу.

Але калі беднякі і сераднякі, як і на Уці, дружна выступілі за самаабкладаньне і паставілі на галасава

ПА БССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Савгас з паказальнай электрафікацыяй.

ВОРША. Для правядзеньня паказальнай электрафікацыі савгасаў, пастановай прэзыдыуму акрвыканкому вылучан савгас Высокае, які знаходзіцца на невяліхай адлегласьці ад Асінбуду і мае прадпрыемствы—броварнае і цяглянае. Пасьля ўзгадненьня гэтага пытаньня з Белсельтрэстам будзе распачата падрыхтоўчая работа ў савгасе па электрафікацыі яго.

Новыя буйныя калгасы на Бабруйшчыне.

Бабруйск. У апошнія дні на тэрыторыі Кароткавіцкага сельсавета, Жлобінскага раёну, дзе цяпер існуе буйны калгас імя 10-годзьдзя Кастрычніка, арганізаваўся шэраг новых калгасаў. Усе вёскі сельскага савету парашылі ўступіць у калгасы, арганізаваўшы адзін вялікі гігант калгас. Цяпер гэты калгас налічвае ў сабе да тысячы сямей і займае плошчу у 13-14 тысяч гэктараў.

12 лістапада ў вёсцы Сьвятое, Рагачэўскага раёну таксама арганізаваўся новы буйны калгас. Тут бядняцка-серадняцкае сялянства парашыла парваць з хутарскім жыцьцём. Уся вёска ў ліку 358 гаспадарак адзінагалосна парашыла ўступіць у калгас.

Арганізоўваючы гэты калгас, беднякі і сераднякі пастанавілі ня прымаць у калгас кулакоў.

Калгас на 3.000 гэктараў

Круглае, Арш. акр. У Паўловіцкім с-с арганізаваўся калгас „Сонца" з 300 гаспадарак на плошчы тры тысячы гэктараў.

Зараз ужо каморнікі канчаюць земле ўпарадкаваньне і вясной камунары прыступаюць да агульнага ворыва вялікага поля.

Дрэнна абстаіць справа з уцягненьнем у калгас сумежных вёсак Хільковічы і Перасельля. У гэтых вёсках неабходна ўзмацніць работу сярод беднаты середняцтва і даць адпор актыўнасьці кулацтва.

Т. Графянкоў.

Пабудова сельска-гаспадарчага камбінату.

Ворша. Каб падаць больш шпаркае развіцьцё сельска-гаспадарчаму экспарту і поўнасьцю забясьпечыць прадпрыемствы па выпрацоўцы экспартнай прадукцыі, у прыватнасьці, каб забясьпечыць Аршанскі мясны камбінат сыравінай і з прычыны таго, што загатоўкі сыравіны дробных сялянскіх гаспадарак, як гэта паказала практыка мінулых год, ня могуць поўнасьцю забясьпечыць гэтыя прадпрыемствы належнай колькасьцю сыравіны, прэзыдыум Аршанскага акрвыканкому прызнаў мэтазгодным пабудаваць у гэтым гаспадарчым годзе буйны сельска-гаспадарчы камбінат.

Гэты камбінат будзе займацца выключна вырашчаваньнем бэконнай сыравіны для забясьпечваньня прадпрыемстваў. Ужо вызначана і месца пабудовы камбінату ў 6 кілёмэтрах ад г. Воршы, недалёка ад чыгуначнай лініі Ворша-Унеча, па тракту Ворша-Горкі, на вучастку агульнай плошчай у 700 гэктараў. Гэта пытаньне канчаткова яшчэ ўзгадняецца з Дзяржгандльбелам, для чаго вызначан двухтыднёвы тэрмін, пасьля чаго пачнецца адмежаваньне вучастку і падрыхтоўка яго да гаспадарчага скарыстаньня.

Вялікая экскурсія ў Ленінград.

Магілеў. Зьвярнулася з падарожжа ў паўночную сталіцу вялікая экскурсія магілеўскіх рабочых.

Экскурсію арганізавала АПБ, прысвячаваўшы яе да XII гадавіны Кастрычніка.

Экскурсанты былі радасна спатканы пралетарыямі Ленінграду і размешчаны ў дамах адпачынку абласнога прафсавету.

За гэты час яны здолелі прыняць удзел у Кастрычнікавай дэманстрацыі на пляцы Урыцкага, наведаць музэй рэвалюцыі і шэраг прадпрыемстваў Ленінграду.

Экскурсія прайшла в вялікім уздымам, пры ліку ўдзельнікаў--сяброў прафсаюзаў у 107 чалавек.

Акруговая канфэрэнцыя кас узаемнага страхаваньня саматужнікаў.

Магілеў, 22-XI. Распачала работу першая акруговая канфэрэнцыя кас узаемнага страхаваньня кааперараваных саматужнікаў Магілеўшчыны.

Касы ўзаемнага страхаваньня маюць за гэты год шмат дасягненьняў. Яны аб'ядналі амаль усю округу. За гэты час імі праведзена 29.368 мэдычна-лячэбных абслугоўваньні. Па часовай непрацаздольнасьці выдадзена дапамогі на 12259 руб. 288 асоб пашлі праз дамы адпачынку, санаторыі і курорты. Касы выдаюць дапамогу на роды, кармленьне, цяжарнасьць і інш.

Канфэрэнцыя праходзе пад знакам барацьбы з маючыміся яшчэ хібамі: момантамі сымуляцыі, рвацтва і інш.

Выкарчуем рэлігію з карэньнем.

(Вёска Гарочыцы на Мазыршчыне.)

Крок за крокам вёска Гарочыцы пасоўваецца наперад. У мінулым годзе ў вёсцы Гарочыцы арганізаваліся два калгасы. Вясною вёска адкінула рэлігійныя фэсты «Радаўніцу», «Чуду». Зараз аб'яднала абодвы калгасы ў адзін буйны калгас і стаіць пытаньне аб поўнай калектывізацыі вёскі.

На ўрачыстым сходзе напярэдадні 12-х угодак Кастрычнікавай Рэвалюцыі сяляне вёскі Гарочыцы пастанавілі зачыніць дамаванівіцкую царкву. У сваёй пастанове сяляне кажуць:—«Рэлігія—вораг лепшай долі бедняка, але мы раней не разумелі, не ўяўлялі, што гэта вораг, а цяпер зразумелі і просім савецкія органы зачыніць дамаванівіцкую царкву і скарыстаць будынак пад культасьветную ўстанову. Адначасова зьвярнуцца з заклікам да грамадзян усіх вёсак, якія ўваходзяць у Дамаановіцкі прыход, далучыцца да нашай пастановы. А таксама зьвярнуцца да ўсіх грамадзян Калінкавіцкага раёну з заклікам аб зачыненьні царквей і касьцёлаў як цэмры і адчыніць храмы культуры.

Ламаюцца да шчэнту ўстоі старога і на іх месца вырастаюць новыя, жыцьцёвыя, якія выведуць працоўных на шлях новага жыцьця—сацыялізму.

Вас. Лявонік.

Яшчэ больш узмацнім тэмп працы ў прамысловасьці.

Шырока азнаёміць рабочыя масы з задачамі, якія стаяць перад прамысловасьцю ў 1929-30 г. Мэтадам сацыялістычнага спаборніцтва зьнішчым назіраючыяся недахопы ў працы прамысловасьці

(Гутарка з старшынёй ВСНГБ тав. Грысевічам.)

Як вядома, кантрольныя лічбы прамысловасьці на 1929-30 г. прадугледжваюць узрост прадукцыі на 65 пр., які павінен быць дасягнуты, галоўным чынам, за кошт павялічэньня прадукцыйнасьці працы. Далей аснаўнымі задачамі бягучага году зьяўляюцца: выкананьне дырэктыў па зьніжэньню сабекошту на 11 проц., максымальнае падняцьце якасьці прадукцыі і мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў прамысловасьці.

Наша прамысловасьць павінна была-б з першых дзён бягучага гаспадарчага году падпарадкавацца гэтым задачам. Не зважаючы на гэта, першыя вынікі працы прамысловасьці за кастрычнік месяц, які даў супроць верасьня павялічэньне выпуску прадукцыі толькі на 6,7 проц. і падзеньне прадукцыйнасьці працы на 3,4 проц., сыгналізуюць аб тым, што прамысловасьць недастаткова прыняла меры, каб забясьпечыць выкананьне прамфінпляну. Недастаткова разгорнута ў гэтай галіне праца па мэталёапрацоўваючай, скурана-абутковай, шкляной і шпэйнай прамысловасьці, недастаткова прыняты меры і Лесбелам у падрыхтоўцы да лясных загатовак.

Кепска стаіць справа на шэрагу прадпрыемстваў з ступеньню гатоўнасьці іх да пераходу на сыстэму нарадаў і заказаў. У гэтых адносінах трэба лічыць крайне недапушчальным вельмі дрэнную пастаноўку вучоту, справаздачнасьці і калькуляцыйнай справы. Заводакіраўніцтвы досыць часта працуюць уцёмную, вобмацкам і нават ня цікавяцца гэтай справай. Назіраюцца выпадкі, калі дырэктар прадпрыемства ня можа ўказаць прычын зьмен сабекошту па прадпрыемству. Гэта становішча сьведчыць аб тым, што дырэктары прадпрыемстваў не займаюцца аналізам сабекошту прадукцыі. Ненармальным трэба лічыць і тое, што за апошні час зацягнуўся ход заключэньня дагавораў па сацыялістычнаму спаборніцтву.

Усё вышэйсказанае награжае выкананьню дырэктыў па зьніжэньню сабекошту. У мэтах зьнішчэньня ўсіх адмоўных зьявішчаў трэба неадкладна дабіцца рашучага пералому ў тэмпах разгортваньня працы прамысловасьці.

Вырашэньне гэтай задачы стаіць перад гаспадарнікамі, грамадзкімі арганізацыямі і перад усімі рабочымі масамі.

Канкрэтны плян мерапрыемстваў, якія прадугледжаны кантрольнымі лічбамі і прамфінплянам, павінны ў тэрміновым парадку быць разьмеркаваны па кожнаму асобнаму прадпрыемству.

Прыдаючы асаблівае значэньне своечасоваму кантролю і праверцы выкананьня аспоўных заданьняў, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу на максымальнае паленшаньне вучоту шляхам узгадненьня працы бухгальтэрыі, статыстыкі, калькуляцыі і тэхнічнага вучоту. Трэба ўзяць курс на тое, каб кожны дырэктар, тэхнарук, майстар, інструктар і кожны рабочы больш цікавіліся пытаньнямі статыстыкі і калькуляцыі.

Для зьнішчэньня ўсіх назіраючыхся недахопаў у працы прамысловасьці трэба максымальна скарыстаць мэтад сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба нашым гаспадарнікам і інжынэрна-тэхнічным сілам зьвярнуць больш увагі і прыняць больш ўдзел у працы па разгортваньню сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба навакол усіх пытаньняў працы прамысловасьці мабілізаваць усю грамадзкую думку, растлумачыўшы перад шырокімі рабочымі масамі ўсе тыя задачы, якія стаяць перад прамысловасьцю ў бягучым гаспадарчым годзе.

Больш увагі самаабкладаньню.

Па Віцебскай акрузе правядзеньне сходаў па самаабкладаньню яшчэ не разгорнута ў дастатковай ступені. Па зьвестках, атрыманых ад васьмі райёнаў, да 15 лістапада сходы па самаабкладаньню праведзены толькі ў палове вёсак, прычым Бешанковіцкі і Гарадокскі райвыканкомы зусім ня гледаюць што робіцца ў сельсаветах, на шэраг запытаньняў акрвыканкому аб становішчы самаабкладаньня адказваюць аб адсутнасьці адпаведных зьвестак ад сельсаветаў.

Арыентыровачная сума самаабкладаньня па акрузе, выходзячы ад 50 проц. ад сельгаспадатку, складае 602 тысячы руб.; між тым да гэтага часу прынятая сходамі сума самаабкладаньня вылічваецца толькі ў 164 тысячы руб., што таксама сьведчыць аб вельмі слабым тэмпе правядзеньня самаабкладаньня і недапушчальнай марудносьці ў гэтай справе.

Па тых райёнах, дзе больш адведзена ўвагі справе самаабкладаньня з боку райвыканкомаў і сельсаветаў, дзе лепш арганізавана беднота, наглядаюцца добрыя вынікі ў правядзеньні самаабкладаньня. Так, па Сураскаму раёну з 16 сельсаветаў самаабкладаньне праведзена ў 7 пунктах, прычым ў 104 пунктах самаабкладаньне прынята ў разьмеры 50 проц. сельгаспадатку.

Найбольш дрэнныя вынікі дае раён, па якому з ліку 118 пунктаў самаабкладаньне прынята на 50 і на 57 пунктах, ня гледзячы на тое, што ўмовы раёну, які знаходзіцца ў другім раённым з другімі раёнымі аналогічныя ўмовы раёну, і тлумачыцца недастатковым вывучэньнем райвыканкому сельсаветаў, не дапамагаючы арганізацыяй бедноты.

Пададзеныя факты патрабуюць увагі самаабкладаньню з боку камоў і сельсаветаў, асабліва з боку тыйных арганізацый пры прасходаў беднаты, так як толькі ў такую арганізацыю беднаты магчыма бясьпечыць адпаведны адпор кулацкай частці вёскі, якая імкнецца самаабкладаньне.

ХРОНІКА.

Па саюзу сельска-гасп. і лясных рабочых

Згодна рашэньня прэзыдыуму саюзу сельскагаспадарчых лясных рабочых пры кожным савгасе БССР будуць арганізаваны вытворча-тэхнічныя курсы. У праграму курсаў, разам з іншымі дысцыплінамі, уваходзіць распрацоўка 5-ці гадоваго пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі.

***

Саюз сельгаспадарчых і лясных рабочых адпусьціў з фонду жылбудаўніцтва 12 тысяч рублёў на пабудову ілюбу для рабочых Белдзяржкінзавода.

***

На кіруючую працу ў апарат Менакраяа вылучаны, згодна пастановы саюзу сельска гаспадарчых і лясных рабочых, тры батрака.

***

Бліжэйшае пасяджэньне Прэзыдыуму ЦП саюзу сельскагаспадарчых і лясных рабочых адбудзецца ў г. Горкі, дзеля чаго туды выяжджае ўвесь склад Прэзыдыуму. Пры выезьдзе Прэзыдыум таксама наведае савгас імя Леніна.

***

Прэзыдыум саюзу сельскагаспадарчых і лясных рабочых па абгаварэньні пытаньня аб арганізацыі ў БССР ВТНУ згадзіўся з яго адчыненьнем ў Гомелі. Саюз выказаўся каб будаўнічаму факультэту надаць сельска-гаспадарчы ўхіл. Прэзыдыум знайшоў мэтазгодным перавод з сельгас-акадэміі ў ВТНУ гідра-тэхнічнае і тарпяное аддзяленьне, а таксама арганізацыю спэцыяльнага рабфаку з тэхнічным ухілам.

***

Прэзыдыум ЦСПСБ на сваім апошнім пасяджэньні заслухаў інфармацыю аб арганізацыі ВТНУ ў Беларусі выказаўся за адчыненьне наступных факультэтаў: мэханічнага, будаўнічага. хіміка-тэхналёгічнага і факультэт для падрыхтоўкі інжынэраў эканамістых, які будзе вылучан з Правгасу БДУ.

***

Прэзыдым саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых узьняў пытаньне перад НК асьветы аб прыданьні горацкаму рабфаку пры сельгасакадэміі сельска-гаспадарчага ўхілу.

Удзельнічае толькі моладзь.

На заводзе «Энэргія» маецца 11 ударных брыгад, у якіх налічваецца 106 чалавек рабочых. Трэба адзначыць што завком і партячэйка да гэтага часу недастаткова разгарнулі работы па ўцягненьні старых рабочых у брыгады. Брыгады «Энэргіі» амаль ўсе складаюцца з моладзі. На заводзе няма такога ўздыму, які наглядаецца па другіх заводах і фабрыках.

Завком недастаткова растлумачыў рабочым аб значэньні ударных брыгад.

На акр. канфэрэнцыю абрана 7 чалавек.

Рабочы.

Самаабкладаньне праходзіць слаба.

Усяго па БССР сялянскімі сходамі прынята самаабкладаньня на суму 2.443.993 руб. (па становішчу на 15 лістапада). Гэта складае ў адносінах да сельска-гаспадарчага падатку ў Бабруйскай акрузе 21,8 проц., Віцебскай—12,8, Гомельскай—7,2. Менскай—15,8, Магілеўскай—23,5, Мазырскай—15,9, Аршанскай—37,2, Полацкай—24,4 пр.

Паступленьне самаабкладаньня ідзе вельмі нездавальняюча. Па ўсёй рэспубліцы паступіла толькі 5,2 проц. у адносінах да прынятых сум. Ёсьць акругі, як Віцебская і Полацкая, у якіх самаабкладаньне зусім не паступае. У Мазырскай акрузе паступіла 1,5 проц., Менскай—2,3 проц., Аршанскай—4,2 проц., Бабруйскай—5,4 проц. Толькі Гомельская округа сабрала 15,3 проц. самаабкладаньня ды Магілеўская—10,5 проц.

Лічбы патрабуюць ажыўленьня работы па правядзеньню самаабкладаньня і пільнай увагі да збору прынятых сум.

Арганізацыя т-ва „музыка масам".

Прэзыдыум ЦСПСБ згадзіўся з прапановай культаддзелу арганізаваць у БССР таварыства „музыка масам". Культаддзелу ЦСПСБ даручана з ініцыятыўнай групы абраць часовае бюро таварыства, якому прыдзецца разгарнуць працу па ўсёй БССР.

Узмацніць беларусізацыю апарату ЦСПСБ.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ была абгаворана інфармацыя аб становішчы беларусізацыі ў апараце апошняга.

Прэзыдыум ЦСПСБ канстатаваў, што апарат ЦСПСБ як адказны, так і тэхнічны за некаторымі выключэньнямі беларускай мовай уладае і што ўся праца поўнасьцю пераведзена на беларускую мову.

Побач з гэтым адзначана, што беларуская мова сярод працаўнікоў апарату ў штодзённай працы дагэтуль ня ўжываецца і амаль усе працаўнікі паміж сабой карыстаюцца расейскай мовай і гэта, ня гледзячы на тое, што большасьць з іх беларускую мову ведае.

Прэзыдыум ЦСПСБ лічыць недапушчальным такое зьявішча, як неўжываньне ў штодзённай працы беларускай мовы таварышамі, якія яе ведаюць, а таксама і тое, што частка працаўнікоў да гэтага часу ня вывучила дастаткова беларускай мовы. Прэзыдыум абавязвае ўсіх працаўнікоў ЦСПСБ карыстацца абавязкова беларускай мовай. Тым таварышам, якія яе ня ведаюць, прапанавана ў 6-ці тыднёвы тэрмін вывучыць беларускую мову. Мясцкому ЦСПСБ прапанавана арганізаваць шэраг гурткоў для вывучэньня беларускай мовы.

Рост працялектываў БССР.

Паводле данных Наркампрацы колькасьць занятых у працялектывах па ўсёй БССР беспрацоўных з 8503 чалавек на 1 кастрычніка павялічылася да 10065 чалавек на 1 кастрычніка бягучага году. За мінулы гаспадарчы год 50 проц. калектываў з 2013 чал. былі перададзены дзяржаўнай і мясцовай прамысловасьці. Удзельная вага жанчын у працялектывах павялічылася з 37,9 да 47,8 проц.

Зацьверджана палажэньне аб бібліятэчным калектары.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ зацьверджана палажэньне аб бібліятэчным (кніжным) калектары БССР.

Прэзыдыум ЦСПСБ рэкамэндаваў усім ЦП саюзаў і акрпрафбюро скарыстоўваць калектар у працы бібліятэк і перасовачных фондаў.

У задачы калектару паміж іншым уваходзіць аказаньне дапамогі бібліятэкам у справе камплектаваньня, пранаганда масавай кнігі, выяўленьне і вучот запатрабаваньняў чытачоў, уніфікаваньне ў бібліятэкі больш лепшых форм бібліятэчнай тэхнікі і інш.

АД РЭДАКЦЫІ

У № 267 газэты „Савецкая Беларусь" у дакладзе т. Галадзеда на 2-й Сэсіі ЦВК БССР аб кантрольных лічбах народнай гаспадаркі і культуры на 1929-30 г. па віне рэдакцыі дапушчаны наступныя памылкі:

1. У разьдзеле IV дакладу ў 1-й калёнцы ў 3-м абзацы зьверху надрукавана: „Другім кіруючым лёзунгам павінна быць самая бязьлітасная цесная барацьба з права-бухарынскай апартуністычнай апазыцыяй...", а павінна быць: „Другім кіруючым лёзунгам павінна быць самая бязьлітасная барацьба з права-бухарынскай апартуністычнай апазыцыяй...".

2. У гэтым-жа разьдзеле ў 6-м абзацы зьнізу замест надрукаванага ў канцы абзацу: „... былі базаю па навучальнаму дасьледваньню", трэба „... былі базай па навуковаму дасьледваньню".

3. У II-й калёнцы гэтага разьдзелу ў 1-м абзацы зьнізу замест надрукаванага: „Мы павінны перад нашымі навукова-дасьледчымі ўстановамі паставіць як цэнтральную задачу іх працы адшуканьне энэргічных і мінэральных рэсурсаў", павінна быць: „Мы павінны перад нашымі навукова-дасьледчымі ўстановамі паставіць як цэнтральную задачу іх працы адшуканьне энэргетычных і мінэральных сырцовых рэсурсаў".

4. У III-й калёнцы ў 2-м абзацы зьверху замест надрукаванага: „Сырэц патрэбен для гэтай прамысловасьці, бо стыдна нам будзе, калі мы, зьяўляючыся льноводным райёнам, будзем прасіць завозіць сырэц у БССР з другіх райёнаў Саюзу..." павінна быць: „Сырэц патрэбен для гэтай прамысловасьці, бо стыдна нам будзе, калі мы, зьяўляючыся льноводным райёнам, будзем прасіць завозіць сырэц у БССР з другіх райёнаў Саюзу..."

5. Далей у гэтым-жа абзацы замест надрукаванага: „У гэтай справе ня толькі НКЗему, але і прамысловасьці... вінна быць: „У гэтай справе НКЗему, але і прамысловасьці многа зрабіць"...

6. У гэтай-жа калёнцы ў 3-м зьнізу замест надрукаванага: „... гэта будзе зразумела тады, калі мы напомнім і аб тым, што ў нас за час сярод часткі старых спэцыялістых мела месца яўнае ... ў іх працы, як ва ўсім Саюзе, так і ў БССР"... быць: „Асабліва гэта будзе зразумела тады, калі мы напомнім і аб тым, што ў нас за мінулы час сярод часткі спэцыялістых мела месца яўнае ... ў іх працы, як ва ўсім Саюзе, так і ў БССР".

7. У 4-й калёнцы ў 2-м абзацы замест надрукаванага: „Таму на... ча заключаецца ў тым, каб ... падрыхтоўку новых кадраў. Вы... з шэрагаў рабочых і сялянскай ... ты... „павінна быць:" „Таму нашы... заключаецца ў тым, каб пашырыць ... рыхтоўку навуковых кадраў, ... іх з шэрагаў рабочых і сялянскай ... наты".

8. У 4-м абзацы гэтай-жа калёнкі замест надрукаванага: „Я не магу сказаць—дзе ён будзе арганізаваны: Менску, у Гомелі, ці Віцебску, ... мы ў бліжэйшы час будзем у С... шаць, але ўжо ў гэтым годзе м... мець ня менш 15 мільёнаў ру... тое, каб арганізаваць вышэйшую навучальную ўстанову"... быць: „Я не магу сёньня ска... ён будзе арганізаваны: у Менск... мелі ці Віцебску, аб месцы мы ... шы час будзем у СНК вырашаць, ... ўжо ў гэтым годзе мы будзем ... каторую суму сродкаў на тое, ... нізаваць вышэйшую тэхнічную ... ную ўстанову.."

Апавяшчэньні.

Яўсэкцыя Бел. АПП рэдакцыі газэт „Акцябр", „Юнгер-Арбэтэр" і часопісі „Штэрн".

У суботу 30 лістапада ў Доме Пісьменьніка (Савецкая вул.) адбудзецца

ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ

рабкораў, рабочых, працоўных, вучняў-моладзі і студэнтаў, якія друкуюць літаратурныя рэчы ў газэтах. і насьцены газэтах, альбо маюць літаратурныя рэчы:

ПАРАДАК ДНЮ:

1. Задачы яўрэйскай пралетарскай літаратуры (Ашаровіч).
2. Справаздача часопісі „Штэрн" (Дунец)
3. Бліжэйшыя задачы ў масавай працы яўсэкцыі Бел. АПП (Кансультацыя пачынаючых пісьменьнікаў, літаратурныя гр. кіраўніцтва рабкорамі, якія выявілі здольнасьць да літаратурнай творчасьці — ВІТЭНЗОН.

На канфэрэнцыю запрашаюцца пралет. і „савецкія пісьменьнікі гор. Менску.

Пасьля канфэрэнцыі адбудзецца літар. частна з удзелам усіх сэкц. БелАПП.

ЯЎСЭКЦЫЯ БелАППА

— Групком № 2, саюзу працасьветы гор. Менску паведамляе, што 27-XI а 7 гадз. увечары ў памяш. 8-й школы Энгельса вул. № 8, адбудзецца агульны сход усіх членаў 2-га групкому.

Павестка дню: аб крытыцы і самакрытыцы.

— Дом Асьветы,—Сёньня 26-XI г. г. роўна а 7 гадз. увечары адбудзецца адчынены сход ячэйкі КП(б)Б працасьветы.

Абвестка дню: Даклад т. Кучынскага аб выніках пленуму ЦК УсеКП(б).

Запрашаюцца ўсе асьветнікі г. Менску.

— Дом Асьветы.—27-XI г. г. роўна а 3 гадз. дню адбудзецца нарада адказных сэкратароў групкомаў, мясцкомаў і прафкомаў саюзу працасьветы г. Менску.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК

на 26-ае лістапада 1929 г.

	Куп	Пр
1 6 проц. выйгр. паз.	5.02	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	129.50	31.50
Выйгр. пазыка 1929 г.	101.45	01.85
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.73	25.83
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.05	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.45	10.50
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.25	25.35
2 „ „ „ проц.	25.65	25.75
2 „ „ „ 6-проц.	25.65	25.75
11 проц. дз. паз. 1928 г.	102.67	02.70
12 пр. рэнтн. паз. 1927 г.	105.83	—

Паштовая скрынка.

Аўтарам допісаў: „Бюракраты ... носіны да справы", „Гняздо" на... Брычкоўскаму ня месца ў савецкім ... ле", „Гром не загрыміць, Бярэзіна ... не перахрысьціцца" накіраваны ... сьлед Менскаму Акрана.

„Аб прыймовай камісіі Слабодзя ... годкі", „Лабоцкі арудуе", „Пра ... ка Ваўрышчыка"—накіраваны Маз... Акрана.

„Трэба адчыніць другі курс ... рабфаку", Трэба дабіцца", „Што ... гожа—на табе нябожа", „Патрэбе ... гляд пляпаў", „Зьдзекі Баранава ... нёньв допісы накіраваны ў На... веты.

„Габінэтным парадкам", „Пак... чальства і падчынёныя", „Трэба ... нуць"—накіраваны Гомельскай Р...

Адказны рэдактар П. ШАС...

ТЭАТР-КІНО

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА".	З панядзелка 25 лістапада „ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА" і кіно-хроніка Белдзяржкіно «Новы горад» Гомельшчына. Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадзіне.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З панядзелка 25 лістапада. Выключны мастацкі фільм „ЧОРНЫ ПАРУС" драма у 6 частках. Звыш праграмы: ХРОНІКА САВКІНО № 65. Пачатак а 7 гадзіне.
1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР"	З панядзелка 25 лістапада „ВАНЬКА ІМСЬЦІВЕЦ" у 6 частках. каса адчынена штодня з 2 гадзін дню.
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	З панядзелка 25 лістапада. Бэстэр Кітон у амэрыканскай камэдыі „ГЕНЭРАЛ" у 7 част. Звыш праграмы: кіно-хроніка „Савкіно" № 64.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

Чытайце і выпісвайце „САВЕЦКУЮ БЕЛАРУСЬ" БЕЛАРУСКУЮ ШТОДЗЁННУЮ ГАЗЭТУ ОРГАН Ц. В. К. БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 мес.—90 кап. 3 мес. 2 р. 70 кап. 6 мес.—4 руб. год — 8 руб.

АДКРЫТ ПРЫЁМ ПАДПІСКІ на 1930 г.

„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

ПАВІННА БЫЦЬ у руках кожнага, актывіста, члена савету, настаўніка, агранома, урача і наогул савецкага служачага.

Падпіска прымаецца: паштовымі канторамі і аддзяленьнямі, лістаносцамі, упаўнаважанымі канторы газэты, кіёскамі кантрагэнцтва друку і канторай газэты (Менск, 2-гі Дом Саветаў)

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

ГОСИЗДАТ РСФСР КНИГА-ПОЧТОЙ, МИНСК

КНИГА-ПОЧТОЙ высылает все книги на русском языке, имеющиеся на книжном рынке, немедленно по получении заказа;

КНИГА-ПОЧТОЙ извещает свою постоянную клиентуру о выходящих новинках по интересующим ее вопросам;

КНИГА-ПОЧТОЙ высылает книги почтовыми посылками или бандеролью наложенным платежом; При высылке всей стоимости вперед—Пересылка бесплатно.

Заказы посылайте по адресу:

ГОСИЗДАТ РСФСР КНИГА-ПОЧТОЙ, МИНСК

АБВЯШЧАЕЦЦА КОНКУРС на пасаду асыстэнта (навуковага супрацоўніка II разраду) пры катэдры фізыолёгіі Беларускай Акадэміі Навук.

—З а р п л а т а 135 руб. у месяц.—

Заявы прыймае канцэлярыя Беларускай Акадэміі Навук (Лепінская, 29/35).

УКРАДЗЕНЫ Ў ГОР. НОВА-БАРЫСАВЕ НАСТУПНЫЯ ДАКУМАНТЫ ВЫДАДЗЕНЫЯ БАРЫСАЎСКІМ ДК КП(б)Б;

1) партбілет № 0814588 на імя Дзянісава Юркі
2) „ „ 0811530 „ Вяжэвіча Міхася
3) „ „ 0415439 „ Небышынца Васіля
4) „ „ 0811532 „ Сацукевіча Алеся
5) „ „ 1104739 „ Мядзьвецкага Адама
6) „ „ 0115323 „ Уппэ Міхася
7) „ „ 0811284 „ Кржачкоўскага Роберта
8) Пячатка Глівенскага пладовага выхавальніку.

Усе вышэй паказаныя дакуманты і пячатку лічыць несапраўднымі.

МОМЕНТАЛЬНЫЙ АВТОМАТИЧЕСКИЙ СЧЕТЧИК (усовершенствованный). Цена 50 к. Дает немедленно, без всяких знаний и наставлений, готовые результаты умножения, деления и вычисления процентов с быстротой чтения глаза. Высылается немедленно по получении заказа и 50 к. За пересылку и упаковку 20 к., всего 70 к. (можно марками). Наложенн. платеж от 4 р. Заказы и деньги направляйте по адресу: Москва 14, Главный почтамт, почтовый ящик № 1084-118 А. И. ЦУКЕРШТЭЙНУ.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Сяброўская кніжка 2) атэстат аб сканчэньні Рагачэўскага пэдтэхнікуму на мя Колбіка В. Н., кв. 148п.

— Сяброўскі білет Улазавай, выд. Мазырскім саюзам мэдсанпрацы, кв 149 п.

— Сяброўскі білет № 11690 Кравеця А., выд, Мазырскім акрсаюзам сельгаслесрабоч., кв. 150п.

— Чырвонаарм. кніжка Каўчана І. Ф., выд. 5 стр. палком 2 бел. дывіз., кв 151п.

— Страхавы білет Іткінай П. І., выд. Рэчыцкай страхкасай, кв. 152п.

— Мэтрычная выпісь за № 9 Драгуна Ю. Р., выд. Рэчыцкім Загсам, кв. 152п.

— Бюлетэнь № 107769 Паукова А. С., выд. Рэчыцкай фабр. амбул., кв. 152п.

— Страхавой білет Ерэнбург С. К., выд. Рэчыцкай страхкасай, кв. 152п.

— Картка на атрыманьне дапамогі па беспрац., выд. Рэчыцк. страхкасай 2) сяброўскі білет, выд. Рэчыцк. аддз. саюзу дрэвааправ., 3) вучотная карт., выд. Рэчыцк. В. К. на імя Смаленчука Л. А., кв. 152п.

— Мэтрычн. выпісь Казачука В. С., выд. Рэчыцкім Загсам, кв. 152п.

— Мэтрычн. выпісь Багданава Х. Ш., выд. Рэчыцкім Загсам, кв. 152п.

— Мэтрычная выпісь за № 40... мана М. Ш., выд. Рэчыцкім ... кв. 152п.

— Бюлетэнь за № 121187 Ка... М., выд. Рэчыцк. амбулятор., кв. 152п.

— Бальнічны лісток з 2-IX ... Абрамовіч Н. С., выд. Рэчыцк. амбулятор., кв. 152п.

— Вучотная карт. Кіселеўскага ... выд. Рэчыцкім В. К., парадж. ... кв. 152п.

— Сяброўскі білет № 70747 Г... А., выд. Гомельскім акр. аддз. пр... і лесу, кв. 152п.

— Вучотная вайсковая кніжка ... менка В. Д., выд., Рэчыцк. В. К., ...

— Вучотная вайсковая кніжка ... менка К. Е., за 1907 г., выд. Рэчы... кв. 152п.

— Пашпарт Стрыжовіча В.—выд. ... лянскім РВК, кв. № 72 п.

— Асабовая кніжка № 241 ... Т.—выд. Магілеўск. Акрваенкам, ... № 72 п.

— Паявая кніжка Мерзон А. ... Цяцерынскім спаж. т-вам, кв. 72.

— Камсам. білет. № 37074 М... П.—выд. Аршанск. Акр. КСМ і ... чаньне выд. Круглянскім РВК, кв ...

— Паявая кніжка Бяндарэнка ... Круглянск. Спаж. т-вам, кв. 72.

— Паявая кніжка Шпілеўска... выд. Круглянскім Спаж. т-вам, кв ...

— Каапэрацыйн. кніжка Кота ... Барысаўскай Прыгароднай Каапэ... кв. 95 п.

— Сяброўскі білет № 1839 Ц... І.—выд. Саюзам Саўгандальсл... кв. 96 п.

— Біржавая карт. Дворкінда ... выд. Борысаўск. Біржай Працы.

— Мэтрычн. выпісь Каган Х. ... Мазырск. Аддз. Загса, кв. 98 п.

— Дапрызыўная кніжка нарад... Сянько С.—выд. Азарыцкім РВК, ...

— Квіжка вайскова-абавязанага ... Краўчука Д. — выд. Каралінскім ... кв. 100 п.

— Конская карт. Жыльчыка Д. ... Чэрвенскім вайсковым сталом, кв. ...

— Сяброўская кніжка Бронскага ... —выд. Саюзам Хімікаў, кв. 108 п.

— Мэтрычн. выпісь Шлейфэр ... выд. Рагачэўскім Загсам, кв. 108 ...

— Прыпісная кніжка дапрызыўн... Канашэвіча Я. Т.—выд. Барысаўскі... кв. 108 п.

— Пасьведчаньне Канашэвіча ... выд. Барысаўскім Пэдтэхнікумам, кв ...

— Партбілет № 1102081 Ціханові... —выд. Барысаўск. Арганізац., кв. ...

— Атэстат за № 17 аб ска... школы 2-й ступ. Ціхановіча І. А. ... Аршанск. „Наробразом", кв. 108 п.

— Накладная за № 800 ад 19-X ... рыманьне грузу з Мазырскай пр... „Госпароходства" на імя Мазырска... канторы, кв. 124п.

Галоўлітбел 595.